БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ЖУРНАЛ
БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

ФИЛОЛОГИЯ

ЧАСОПІС
БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

ФІЛАЛОГІЯ

JOURNAL
OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

PHILOLOGY

Издается с января 1969 г.
(до 2017 г. – под названием «Веснік БДУ.
Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка»)

Выходит три раза в год

1 **2025**

МИНСК
БГУ

РЕДАКЦИОННАЯ КОЛЛЕГИЯ

Главный редактор

ПРИГОДИЧ Н. Г. – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: prigodichNG@bsu.by

Заместители главного редактора

ГОНЧАРОВА-ГРАБОВСКАЯ С. Я. – доктор филологических наук, профессор; профессор кафедры русской литературы филологического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: goncharova_s@tut.by

РОВДО И. С. – доктор филологических наук, профессор; заведующий кафедрой русского языка филологического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: rovdois@bsu.by

Ответственный секретарь

ЕФИМОВА Н. В. – кандидат филологических наук; доцент кафедры белорусского языкознания филологического факультета Белорусского государственного университета, Минск, Беларусь.
E-mail: natallia.janienka@gmail.com

Аллинёль К. Гренобльский университет 3 им. Стендаля, Гренобль, Франция.
Буняк П. Белградский университет, Белград, Сербия.
Бутырчик А. М. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Важник С. А. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Воевода Е. В. Московский государственный институт международных отношений, Москва, Россия.
Володина Т. В. Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. Кондрата Крапивы Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь.
Волочко А. М. Академия образования, Минск, Беларусь.
Волынец Т. Н. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Гладкова Г. Карлов университет, Прага, Чехия.
Гутовская М. С. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Дубинко С. А. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Золтан А. Будапештский университет им. Лоранда Этвёша, Будапешт, Венгрия.
Колер Г.-Б. Ольденбургский университет им. Карла фон Осецкого, Ольденбург, Германия.
Копылов И. Л. Институт языкознания им. Якуба Коласа Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь.
Кречмер А. Венский университет, Вена, Австрия.
Кузнецов С. А. Центр экспертиз Санкт-Петербургского государственного университета, Санкт-Петербург, Россия.
Лебединский С. И. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Мечковская Н. Б. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Поплавская Т. В. Минский государственный лингвистический университет, Минск, Беларусь.
Саверченко И. В. Институт литературоведения им. Янки Купалы Центра исследований белорусской культуры, языка и литературы Национальной академии наук Беларуси, Минск, Беларусь.
Саевич М. Государственный университет им. Марии Кюри-Склодовской, Люблин, Польша.
Синькова Л. Д. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Стариченок В. Д. Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка, Минск, Беларусь.
Тараненко А. А. Институт языковедения им. А. А. Потебни Национальной академии наук Украины, Киев, Украина.
Хаустович Н. В. Варшавский университет, Варшава, Польша.
Хмельницкий Н. Н. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Цзян Цюнь Даляньский политехнический университет, Далянь, Китай.
Чеховский Г. К. Белорусский государственный университет, Минск, Беларусь.
Шешкен А. Г. Московский государственный университет им. М. В. Ломоносова, Москва, Россия.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Галоўны рэдактар

ПРЫГОДЗІЧ М. Р. – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: prigodichNG@bsu.by

Намеснікі галоўнага рэдактара

ГАНЧАРОВА-ГРАБОЎСКАЯ С. Я. – доктар філалагічных навук, прафесар; прафесар кафедры рускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: goncharova_s@tut.by

РОЎДА І. С. – доктар філалагічных навук, прафесар; загадчык кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: rovdois@bsu.by

Адказны сакратар

ЯФІМАВА Н. В. – кандыдат філалагічных навук; дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск, Беларусь.
E-mail: natallia.janienka@gmail.com

Алінёль К. Грэнобльскі ўніверсітэт 3 імя Стэндаля, Грэнобль, Францыя.
Буняк П. Бялградскі ўніверсітэт, Бялград, Сербія.
Бутырчык Г. М. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Важнік С. А. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Валодзіна Т. В. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
Валочка Г. М. Акадэмія адукацыі, Мінск, Беларусь.
Валынец Т. М. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Ваявода А. У. Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін, Масква, Расія.
Гладкава Г. Карлаў універсітэт, Прага, Чэхія.
Гутоўская М. С. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Дубінка С. А. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Золтан А. Будапешцкі ўніверсітэт імя Лоранда Этвёша, Будапешт, Венгрыя.
Капылоў І. Л. Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
Колер Г.-Б. Альдэнбургскі ўніверсітэт імя Карла фон Асецкага, Альдэнбург, Германія.
Крэчмер А. Венскі ўніверсітэт, Вена, Аўстрыя.
Кузняцоў С. А. Цэнтр экспертыз Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Санкт-Пецярбург, Расія.
Лебядзінскі С. І. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Мячкоўская Н. Б. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Паплаўская Т. В. Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Саверчанка І. В. Інстытут літаратуразнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь.
Саевіч М. Дзяржаўны ўніверсітэт імя Марыі Кюры-Складоўскай, Люблін, Польшча.
Сінькова Л. Д. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Старычонак В. Д. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, Мінск, Беларусь.
Тараненка А. А. Інстытут мовазнаўства імя А. А. Патабні Нацыянальнай акадэміі навук Украіны, Кіеў, Украіна.
Хаўстовіч М. В. Варшаўскі ўніверсітэт, Варшава, Польшча.
Хмяльніцкі М. М. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Цзян Цюнь Даляньскі політэхнічны ўніверсітэт, Далянь, Кітай.
Чахоўскі Г. К. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь.
Шэшкен А. Г. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава, Масква, Расія.

EDITORIAL BOARD

Editor-in-chief

PRYHODZICH M. R., doctor of science (philology), full professor; professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: prigodichNG@bsu.by

Deputy editors-in-chief

GONCHAROVA-GRABOVSKAYA S. Y., doctor of science (philology), full professor; professor at the department of Russian literature, faculty of philology, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: goncharova_s@tut.by

ROVDO I. S., doctor of science (philology), full professor; head of the department of Russian language, faculty of philology, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: rovdois@bsu.by

Executive secretary

JAFIMAVA N. V., PhD (philology); associate professor at the department of Belarusian linguistics, faculty of philology, Belarusian State University, Minsk, Belarus.
E-mail: natallia.janienka@gmail.com

Allignol C. Stendhal University Grenoble 3, Grenoble, France.
Bunjak P. Universityof Belgrade, Belgrade, Serbia.
Butyrchyk G. M. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Chahouski G. K. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Dubinko S. A. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Gladkova H. Charles University, Prague, Czech.
Gutovskaya M. S. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Jiang Qun Dalian Polytechnic University, Dalian, China.
Khaustovich M. V. University of Warsaw, Warsaw, Poland.
Khmialnitski M. M. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Kohler G.-B. Carl von Ossietzky University of Oldenburg, Oldenburg, Germany.
Kopylov I. L. Yakub Kolas Institute of Linguistics of the Centre for Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
Kretschmer A. University of Vienna, Vienna, Austria.
Kuznetsov S. A. Centre of Expertise of the Saint Petersburg University, Saint Petersburg, Russia.
Lebedinskiy S. I. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Mechkovskaya N. B. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Poplavskaya T. V. Minsk State Linguistic University, Minsk, Belarus.
Sajewicz M. Maria Curie-Skłodowska University, Lublin, Poland.
Saverchanka I. V. Institute of Literature Researches of the Centre for Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
Sheshken A. G. Lomonosov Moscow State University, Moscow, Russia.
Sin'kova L. D. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Starichenok V. D. Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank, Minsk, Belarus.
Taranenko A. A. A. A. Potebnya Institute of Linguistics of the National Academy of Sciences of Ukraine, Kyiv, Ukraine.
Valochka H. M. Academy of Education, Minsk, Belarus.
Valodzina T. V. Kandrat Krapiva Institute of Arts Studies, Ethnography and Folklore of the Centre for Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus.
Vazhnik S. A. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Voevoda E. V. Moscow State Institute of International Relations, Moscow, Russia.
Volynets T. M. Belarusian State University, Minsk, Belarus.
Zoltan A. Eötvös Loránd University of Budapest, Budapest, Hungary.

УДК 821.161.3(075.8)

МЕТАФОРИЗАЦИЯ КАК ОСНОВА ХУДОЖЕСТВЕННОГО СТИЛЯ ОРАТОРСКОЙ ПРОЗЫ ГЕОРГИЯ КОНИССКОГО И ТИХОНА ЗАДОНСКОГО

С. Э. СОМОВ[1)]

[1)]*Духовно-просветительский центр имени святителя Георгия Конисского, ул. Архиерейский Вал Конисского, 3, 212030, г. Могилёв, Беларусь*

Аннотация. Анализируется художественная природа ораторской прозы двух выдающихся проповедников XVIII в.: белорусского архиепископа Георгия Могилёвского (Конисского) и российского епископа Тихона Задонского (Соколова). Сделан акцент на выявлении и описании основных художественных приемов, которые используют просветители при создании «слов» – храмовых проповедей, раскрывающих духовно-религиозное содержание библейских текстов, прочитанных во время Божественной литургии. Среди текстообразующих тропов выделяются антитезы, в том числе сложные, оформляемые в виде пространных риторических тирад молитвенного характера, метонимии, сравнения, аллегории, повторы и эпитеты, в том числе выразительные, восходящие к художественной природе библейского повествования. Основным художественным приемом, формирующим стиль ораторской прозы авторов, признается метафора (шире метафоризация), также восходящая к библейской художественности.

Ключевые слова: Георгий Конисский; Тихон Задонский; ораторская проза; слово; библейская метафора; метафоризация; художественный стиль.

Образец цитирования:
Сомаў СЭ. Метафарызацыя як аснова мастацкага стылю аратарскай прозы Георгія Каніскага і Ціхана Задонскага. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:5–11.
EDN: BQXLYX

For citation:
Somov SE. Metaphorisation as the basis of the artistic style of oratoric prose by Georgy Konissky and Tikhon Zadonsky. *Journal of the Belarusian State University. Philology*. 2025;1:5–11. Belarusian.
EDN: BQXLYX

Автор:
Сергей Эдуардович Сомов – кандидат филологических наук, доцент; директор.

Author:
Sergey E. Somov, PhD (philology), docent; director.
somov72@mail.ru

CC BY NC

Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2025;1:5–11
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2025;1:5–11

МЕТАФАРЫЗАЦЫЯ ЯК АСНОВА МАСТАЦКАГА СТЫЛЮ АРАТАРСКАЙ ПРОЗЫ ГЕОРГІЯ КАНІСКАГА І ЦІХАНА ЗАДОНСКАГА

С. Э. СОМАЎ[1*]

[1*]*Духоўна-асветніцкі цэнтр свяціцеля Георгія Каніскага,*
вул. Архірэйскі Вал Каніскага, 3, 212030, г. Магілёў, Беларусь

Анатацыя. Аналізуецца мастацкая прырода аратарскай прозы двух выдатных прапаведнікаў XVIII ст.: беларускага архіепіскапа Георгія Магілёўскага (Каніскага) і расійскага епіскапа Ціхана Задонскага (Сакалова). Зроблены акцэнт на выяўленні і апісанні асноўных мастацкіх прыёмаў, якія выкарыстоўваюць асветнікі пры стварэнні «слоў» – храмавых пропаведзяў, што раскрываюць духоўна-рэлігійны змест біблейскіх тэкстаў, прачытаных падчас Боскай літургіі. Сярод тэкстаўтваральных мастацкіх сродкаў вылучаюцца антытэзы, у тым ліку складаныя, афармленыя ў выглядзе вялізных рытарычных тырад малітоўнага характару, метаніміі, параўнанні, алегорыі, паўторы і эпітэты, у тым ліку выразныя (яны ўзыходзяць да мастацкай прыроды біблейскага апавядання). Асноўным мастацкім прыёмам фарміравання стылю аратарскай прозы аўтараў прызнаецца метафара (шырэй метафарызацыя), якая таксама ўзыходзіць да біблейскай мастацкасці.

Ключавыя словы: Георгій Каніскі; Ціхан Задонскі; аратарская проза; слова; біблейская метафара; метафарызацыя; мастацкі стыль.

METAPHORISATION AS THE BASIS OF THE ARTISTIC STYLE OF ORATORIC PROSE BY GEORGY KONISSKY AND TIKHON ZADONSKY

S. E. SOMOV[a]

[a]*Spiritual and Educational Centre named after Georgy Konissky,*
3 Archijerejski Val Kaniskaga, Magiliow 212030, Belarus

Abstract. The author of the article analyses the artistic nature of the oratorical prose of two outstanding preachers of the 18th century: the Belarusian Archbishop Georgy of Mogilev (Konissky) and the Russian Bishop Tikhon Zadonsky (Sokolov). The main emphasis is on identifying and describing those leading artistic techniques that educators use when creating «words» which are church sermons that reveal the spiritual and religious content of biblical texts read during the Divine Liturgy. Among the text-forming tropes, antitheses stand out, including complex ones, presented in the form of lengthy rhetorical tirades of a prayerful nature, metonymies, comparisons, allegories, repetitions and epithets, including expressive ones, going back to the artistic nature of the biblical narrative. Metaphor (more broadly, metaphorisation), which also goes back to biblical artistry, is recognised as the main artistic device that shapes the style of the authors' oratorical prose.

Keywords: Georgy Konissky; Tikhon Zadonsky; oratorical prose; word; biblical metaphor; metaphorisation; artistic style.

Уводзіны

Праваслаўныя свяціцелі Георгій Магілёўскі (Каніскі) і Ціхан Задонскі (Сакалоў) былі сучаснікамі, іх шлях да атрымання духоўнай адукацыі і паствы шмат у чым падобны. Кожны з гэтых выдатных дзеячаў эпохі Асветніцтва яшчэ пры жыцці стаў таленавітым прапаведнікам: Георгій на Магілёўскай біскупскай кафедры (1755–1795), а Ціхан на Варонежскай кафедры (1763–1767). Розная працягласць перыядаў іх актыўнага архіпастырскага служэння паўплывала на аб'ём аратарскай спадчыны асветнікаў, які дайшоў да нас. Напрыклад, з пропаведзяў Ціхана, прысвечаных асноватворнаму догмату аб прышэсці ў свет Хрыста, вядома толькі «Слова на Раство Хрыстова» (без даціроўкі напісання і прамовы з амбона храма). Пры гэтым захавалася шэсць калядных «слоў» Георгія, самае ранняе з якіх датуецца 1784 г.[1]

Майстэрства прамоўцы-прапаведніка ў Георгія (у свеце – Рыгор Восіпавіч Каніскі) сфарміравалася ўжо ў юнацтве ў Кіеве. З 1728 па 1743 г. ён вучыўся ў Кіева-Магілянскай акадэміі, а затым выкладаў у гэтай установе і займаў у ёй пасады прэфекта і рэктара аж да сваёй архірэйскай хіратаніі ў 1755 г., пасля якой назаўжды развітаўся з Кіевам і педагагічнай дзейнасцю. Падчас навучання ў Кіева-Магілянскай акадэміі ў Георгія выявіўся асобы талент у вывучэнні моў, таму яго прызначылі выкладчыкам красамоўства.

[1]Далей для абазначэння адзінакавых твораў гэтага жанру будзем выкарыстоўваць намінацыю «слова». – *С. С.*

Увесь перыяд падрыхтоўкі да выкладчыцкай дзейнасці (1744–1746) Георгій быў прапаведнікам Кіева-Пячэрскай лаўры. Ён выкладаў не толькі красамоўства, але і філасофію і тэалогію, што, у сваю чаргу, стала асновай для прапаведніцкай дзейнасці ў сане епіскапа і архіепіскапа Магілёўскага і Беларускага ў наступныя 40 гадоў.

На думку вядучага біёграфа Георгія Каніскага, царкоўнага гісторыка протаіерэя Міхаіла Буглакова, прапаведніцтва займала выключнае месца ў шматграннай асветніцкай дзейнасці архіепіскапа. «Адзін з выдатных прадстаўнікоў рускай царкоўнай пропаведзі другой паловы XVIII ст., – піша М. Буглакоў, – Каніскі яшчэ пры жыцці здабыў славу знакамітага царкоўнага аратара, прамовы якога непараўнальныя. З цягам часу гэта слава Каніскага яшчэ больш распаўсюдзілася, чаму садзейнічаў сам Георгій сваім яркім прапаведніцкім талентам. Пасля яго смерці публікацыі яго пропаведзяў і станоўчы аб іх водгук А. С. Пушкіна, а таксама выдатная рэцэнзія А. С. Шышкова канчаткова ўмацавалі славу Георгія Каніскага як прапаведніка. Ён уваходзіць у склад невялікай групы царкоўных выступоўцаў кацярынінскага часу, такіх як Гедэон Крыноўскі, Платон Лёўшын і іншыя, пропаведзі якіх прадстаўляюць узоры царкоўна-аратарскага мастацтва»[2] [1, с. 431–432].

Без сумневу, да названай групы выступоўцаў належыць і Ціхан Задонскі (у свеце – Цімафей Савельевіч Кірылаў, якога ведаюць яшчэ і пад прозвішчам Сакалоў). Нягледзячы на сваё нязнатнае паходжанне і крайнюю беднасць (яго бацька быў псаломшчыкам і рана пайшоў з жыцця), Ціхан Задонскі змог атрымаць добрую для свайго часу адукацыю: ён скончыў 14-гадовы курс Наўгародскай духоўнай семінарыі і выкладаў у ёй спачатку рыторыку, як і Георгій Каніскі, а потым грэчаскую мову, багаслоўе і філасофію. Ціхан Задонскі быў прэфектам семінарыі ў Ноўгарадзе і непрацяглы час рэктарам семінарыі ў Цвяры, аж да епіскапскай хіратаніі ў 1761 г. Яго талент прапаведніка, як і талент Георгія Каніскага, сфарміраваўся падчас атрымання акадэмічнай адукацыі, а потым удасканальваўся на лектарскай і архірэйскай кафедрах, аднак не так доўга, як у беларускага асветніка.

Актуальнасць выбранай тэмы з'яўляецца відавочнай і грунтуецца на значнасці творчай спадчыны названых асветнікаў як пры жыцці, так і пасля смерці на працягу XIX і XX стст. Іх аратарская проза звяртала на сябе ўвагу выдатных майстроў слова, нават вялікага генія паэзіі А. С. Пушкіна, які напрыканцы жыцця звярнуўся да нацыянальна-духоўных каштоўнасцей і вельмі цікавіўся праваслаўем і багаслоўскімі сачыненнямі айчынных аўтараў. Навізна прапанаванага артыкула абумоўлена адсутнасцю ў сучасным літаратуразнаўстве прац, прысвечаных мастацкім асаблівасцям аратарскай прозы Георгія Каніскага, якія складаюць галоўны прадмет нашага навуковага інтарэсу, за выключэннем раней апублікаваных прац аўтара артыкула. Адпаведна мэтай даследавання з'яўляецца выяўленне і апісанне вядучых мастацкіх прыёмаў, выкарыстаных Георгіем Каніскім, а таксама Ціханам Задонскім пры стварэнні арыгінальных храмавых «слоў», – прыёмаў, якія выступаюць асновай мастацкага стылю рэлігійнай аратарскай прозы прапаведнікаў.

Матэрыялы і метады даследавання

Матэрыяламі даследавання сталі прамоўніцкія творы Георгія Каніскага і Ціхана Задонскага, напісаныя імі ў розныя гады другой паловы XVIII ст., пераважна «словы» на Раство Хрыстова, якія ўключаюць у сябе фундаментальныя для хрысціянскага рэлігійнага светаразумення ўяўленні і вобразы. Асноўнымі метадамі даследавання выступаюць кантэнт-аналіз, гісторыка-літаратуразнаўчы аналіз, навуковае апісанне і параўнальна-супастаўляльны метад. Тэарэтычнай базай даследавання з'яўляюцца работы А. М. Весялоўскага і Б. В. Тамашэўскага, якія апісвалі функцыянальную прыроду тропікі мастацкай літаратуры.

Вынікі і іх абмеркаванне

Храмавая пропаведзь Георгія Каніскага будуецца як традыцыйны пастырскі каментарый да евангельскага чытання, што даецца падчас літургіі абвешчаных (другой часткі галоўнай храмавай службы). Найважнейшую фразу з евангельскага фрагмента Георгій выбірае эпіграфам да свайго выступлення, у якім выказваецца агульная тэма пропаведзі, задаецца пэўная накіраванасць разважанням аратара.

Такім эпіграфам да «Слова на дзень нараджэння Хрыстовага» Георгій выбірае фразу з Евангелля ад Лукі: «Абвяшчаю вам радасць вялікую, якая будзе ўсяму народу» [Лук. 2:10]. У пачатку гаміліі Свяціцель фармулюе асноўны тэзіс свайго выступлення: «Усяму свету пасланы Сын Божы, такім чынам, усяму свету належала радавацца па сіле дабравесця Ангельскага аб Раство гэтага Спаса»[3] [2, с. 121]. Аднак, звярнуўшыся да больш падрабязнага разгляду евангельскай гісторыі аб Раство Хрыстовым у Віфлееме, звязанай з сумнымі падзеямі перасleду нованароджанага Месіі царом Ірадам і забіццём тысяч немаўлят

[2]Тут і далей пераклад наш. – *С. С.*

[3]Цытаты прыводзяцца з захаваннем асаблівасцей арыгінала. – *С. С.*

у горадзе і яго наваколлі, Георгій фармулюе контртэзіс свайго звароту да паствы: «Прастольны горад [Ерусалім]… бянтэжыцца замест радасці і замест урачыстых пышнасцяў, варварскую жахлівую здзясняе ганьбу» [2, с. 121]. Даследаванне прычын такой дзіўнай супярэчнасці (рознасці) і складае асноўны ідэйна-філасофскі прадмет разважання Георгія Каніскага.

Прапаведнік, вызначаючы супярэчнасць паміж відавочнымі перадумовамі сусветнай радасці ад нараджэння Хрыста і рэальнай збянтэжанасцю, выкліканай Яго з'яўленнем, звяртаецца да прыёму антытэзы, які становіцца адным з важнейшых у пабудове складанай філасофска-мастацкай канструкцыі пропаведзі. Цэлы шэраг супрацьпастаўленняў у «слове» лагічна абумоўліваецца ходам разважанняў аўтара (ад агульнага да прыватнага) і адпавядае мастацкаму прынцыпу ступенчатага звужэння вобраза. Першасная антытэза, самая шырокая, ахоплівае рэаліі сусветнага маштабу і заключаецца ў супрацьпастаўленні двух светаў – нябеснага і зямнога. Увасабленнем першага з'яўляюцца анёлы, увасабленнем другога – людзі. «Анёл абвяшчае радасць вялікую ўсім людзям, – кажа Георгій, – а многія з людзей тым самым бянтэжацца; Анёлаў цэлы сабор спяваюць на зямлі мір, а зямныя па большай частцы тым самым шалеюць і адзін аднаго кроў праліваюць» [2, с. 121–122].

Прыход Збавіцеля ў свет азарае цемру святлом вышэйшага духоўнага існавання і спараджае раней небывалы падзел усіх людзей, якія жывуць на зямлі, на сапраўдных грамадзян і злодзеяў. Успрыманне Збавіцеля ў яго найбольш значных для чалавецтва ролях і тымі і іншымі стварае новыя антытэзы, на фоне якіх больш выразным становіцца аблічча Самога Хрыста. Указаная рознасць разглядаецца Георгіем спачатку на прыкладзе маральнага досведу людзей далёкага мінулага, а затым сваіх сучаснікаў, прысутных у храме жыхароў горада, у якім ён прамаўляе слова (у дадзеным выпадку магіляўчан), і, нарэшце, на прыкладзе кожнага асобнага чалавека, у «сэрцы» якога адбываецца найважнейшае, лёсавызначальнае сутыкненне дабра і зла (антытэза неба і зямлі тут звужаецца фактычна да кропкі).

Ціхан Задонскі таксама выкарыстоўвае ў «Слове на Раство Хрыстова» эпіграф: «Мы знайшлі Месію (што ў перакладзе азначае: Хрыстос)» [Ін. 1:41], які, аднак, выконвае іншую функцыю, чым у Георгія. Для рускага аратара думка аб прышэсці ў свет Збавіцеля з'яўляецца настолькі відавочнай, што не патрабуе разгорнутых доказаў і афармляецца ў выглядзе дынамічнай рытарычнай тырады – эмацыянальнага ўступлення ўрачыстай святочнай гаворкі, пачатковага акорда ўзрушальнага гімна Хрысту, які нарадзіўся: «Здабылі Месію, прарокамі прапаведанага; здабылі Месію, законам і патрыярхі пераўвасобленага; здабылі Месію, многімі гады з вялікім жаданнем і ўздыханнем чаканага; здабылі Месію – спадзяванне народаў…» [3, с. 28–29]. Працяглая празаічная фраза, якая ўбірае ў сябе цэлы шэраг яркіх азначэнняў і параўнанняў (між тым не вычварная, пазбаўленая прыкмет стылю «пляцення слоў»), дзе рэфрэн «здабылі Месію» паўтараецца 7 разоў (колькасць паўтораў невыпадковая, таму што 7 – гэта лічба сакральная, сімвал сувязі зямнога і нябеснага светаў і Імя Бога), вымаўляецца на адным дыханні, ствараючы ўражанне ўжо не празаічнай, а паэтычнай гаворкі, своеасаблівага белага верша, які задае «Слову» не столькі лагічна вызначаную тэму, колькі эмацыянальна-стылёвую скіраванасць, што пазней вытрымліваецца аўтарам на працягу ўсяго аповеду з дапамогай шэрагу мастацкіх сродкаў і прыёмаў.

Святіцель Ціхан толькі адштурхваецца ад эпіграфа і будуе пропаведзь як вольны вобразны аповед, што паказвае захапляльныя пошукі Хрыста, на якія прапаведнік у думках адпраўляецца разам са сваёй паствай, апісваючы і зямныя месцы, дзе Гасподзь «не жыве» (прыстанак грахоў), і месцы, дзе Ён знаходзіцца сярод тых, хто сабраўся ў імя Яго са шчырай любоўю адзін да аднаго. Знайшоўшы Збавіцеля, Ціхан Задонскі стараецца заклікаць яго ў свой уласны дом (цела-храм) праз узнёслую супольную малітву з сабранымі ў храме Божым хрысціянамі.

Прапаведнік адыходзіць ад прамога тлумачэння евангельскага тэксту, мадэлюючы праўдзівыя жыццёвыя сітуацыі і адносіны ў іх праекцыі на маральныя каштоўнасці Хрыста (універсальны катэгарыяльны імператыў). Ён стварае аснову для самастойнага разумення слухачом евангельскага апавядання, якое пры гэтым не знікае з увагі, паколькі прысутнічае ў свядомасці слухача ў выглядзе вядомых сюжэтных матываў: «лукавыя Ірады» праліваюць кроў для захавання «часовага гонару», шукаюць Хрыста і да яго падобных, каб забіць (забіццё віфлеемскіх немаўлят, арышт і пакаранне Хрыста, ганенні на апосталаў); «злакаварныя лісы» вітаюць Месію пацалункамі, а самі «аб кошце дамаўляюцца» [3, с. 29–31], задумваюць здраду (здрада Іуды Іскарыёта) і інш.

Стыль апавядання Георгія Магілёўскага ў сваёй аснове метафарычны, прычым гэта метафарызацыя абапіраецца перш за ўсё на метафарызацыю біблейскую. Глыбокае веданне епіскапам біблейскага тэксту (выражаецца, у прыватнасці, у свабодным цытаванні Старога і Новага запаветаў з дакладным указаннем крыніцы: кнігі, главы і верша) праяўляецца ў творчым асваенні ім біблейскіх прынцыпаў метафарызацыі, заключаных у замене адцягненага канкрэтным, на якіх заснаваны ўстанаўленні ўскоснага падабенства двух светаў: нябеснага (духоўнага) і зямнога (створанага). Мы не можам сцвярджаць, што Георгій узнімаецца як мастак слова да ўзроўню арыгінальнай аўтарскай прытчы, аднак ён па-майстэрску стварае стройныя разгорнутыя метафары, якія набліжаюць яго прамоўніцкі стыль да алегарычнай сістэмы

выказвання. Функцыянальна выкарыстанне гэтага мастацкага прыёму і ў Бібліі, і ў «слове» Георгія Каніскага аднастайнае: вобразнае іншасказанне дазваляе праз выяўленне прадметаў і адносін паміж імі ў рэальнасці (нярэдка бытавых, блізкіх звычайнаму слухачу) данесці да простых людзей уяўленні пра духоўныя паняцці ўзроўню філасофскай абстракцыі, іншымі словамі, проста сказаць пра складанае, каб сэнс аповеду стаў зразумелым нават неадукаванаму чалавеку.

Прыкладам разгорнутай метафары біблейскага паходжання можа служыць апісанне ў згаданым вышэй «слове» важнасці для чалавецтва прыходу Хрыста Збавіцеля: «Цар добры грамадзянам жаданы, страшны ж і ненавісны злыдням: вольнік прагны палонным і прысутным у турмах; не патрэбны ж свабодным, і тым, якія хоць у палоне знаходзяцца, але, айчыны сваёй забыліся, змяшаліся з паланіўшымі іх варварамі, і самавольна бязбожнасці іхняй і ўсякаму злому лёсу аддаюцца. Прыемны вельмі міратворца прыгнечаным цяжкай вайною; але не патрэбен тым, якія ці вайны не адчуваюць, ці ж і адчуваючы, не пякуцца пра канец яе, які складаецца ў пагібелі іхняй. Шукаюць лекара хворыя і да смерці надыходзячыя, але аб ім не радзяць ці здаровыя, ці здароўем якія хваляюцца, нават і тады, калі ўнутраная іх хвароба неадчувальна вядзе да смерці» [2, с. 122]. У дадзеным фрагменце Георгій Каніскі стварае кантэкст, які спачатку ўспрымаецца слухачамі ў яго прамым значэнні (складваецца ўражанне, што прапаведнік звяртаецца да прыёму звычайнага супастаўлення). Намёк на іншасказанне змяшчаецца ў самім фрагменце, які Георгій заканчвае фразай аб перавазе духоўнага пачатку над цялесным: «Наколькі душа лепшая і найвышэйшая частка складу чалавечага, настолькі карысці і патрэбы душэўныя, большыя за плоцкія, без параўнання найвялікшыя існасць» [2, с. 122]. Аднак другі, схаваны шэраг уяўленняў адкрываецца слухачам крыху пазней, калі ўказаны кантэкст уключаецца ў агульнае значэнне «слова». Георгій Каніскі разважае пра тое, хто ёсць Хрыстос. У працэсе гэтага разважання паняцці «цар», «вызваліцель», «міратворца», «лекар» і «суддзя» (якія паказваюцца аўтарам праз успрыманне вышэйзгаданымі грамадзянамі і злодзеямі) напаўняюцца духоўным сэнсам і становяцца вобразамі-сімваламі агульначалавечага маштабу.

Георгій Каніскі актыўна выкарыстоўвае і асобныя метафары, прычым часцей за ўсё звяртаецца да ўжо вядомых яму і слухачам метафар, якія сталі для высокай рыторыкі святых айцоў царквы традыцыйнымі: *прыходу царову ў град свой* (Хрыстос на Зямлі), *хваробы нашыя панясе* (грахі і адкупленне), *слепату душ* (сэрца без Бога), *глухія вушы* (розум без Бога), *кульгавыя ногі* (пашкоджаная маральнасць), *у ліхаманцы і вар'яцтве* (страсці і нябачныя грахі) [2, с.121–126] і інш.

Большасць эпітэтаў, якія ўжываюцца прапаведнікам, з'яўляюцца пастаяннымі і маюць, як і метафары, біблейскае паходжанне: *вечныя пякельныя пакуты*, *грэшнікамі прагнявіўшымі*, *Духам Сваім Найсвяцейшым*, *бязгрэшнае жыццё*, *нявінна пакутуюць*, *беззаконнікі нераскаяныя*, *страшнай гэтай яўленага Бога ў плоці таямніцы*, *вялікаю таямніцаю набожнасці*, *горад іхняй няпраўды*, *ліхаімства*, *падману* і інш. Некаторыя эпітэты (часцей тыя, што маюць негатыўную, выкрывальную афарбоўку і збліжаюцца з прастамоўем) носяць выразны характар: *варварскую жахлівую вырабляе ганьбу*, *адчуваем адмыслова*, *зласліўцы несумленныя*, *праведнай прычынай*, *найпатрэбнага лекара* [2].

Не менш значнымі, чым метафарычныя адносіны, у мастацкім ладзе аратарскай прозы Георгія Каніскага з'яўляюцца метанімічныя адносіны. Ён часта карыстаецца прыёмам метаніміі, прычым зноў-такі традыцыйнай для хрысціянскай рэлігійнай літаратуры, якая ўзыходзіць да біблейскай вобразнасці: *сусвет грахом завінаваціўся Богу* (людзі), *сусвету належала радавацца*, *засмуціўся і ўся Іерусаліма з ім*, *горад… бянтэжыцца* (гараджане) і інш. У працэсе разгортвання схаванага плана апавядання перад слухачом метанімічныя адносіны, у адрозненне ад метафарычных, становяцца больш шырокімі. Калі ў пачатку «слова» выява «Ерусалімы, забойцы праведных» суадносіцца з жыхарамі гэтага горада, варожа настроенымі да Хрыста, то напрыканцы апавядання яна ператвараецца ў сінекдаху, якая характарызуе большую частку чалавецтва, што ўвязла ў граху. Калі пры першым цытаванні з Псалтыры метанімія «жазло жалезнае» вызначае ўладу Цара «над Сіёнам» (таксама метанімія, пабудаваная на прасторавых адносінах гара – краіна – зямля – сусвет) [Пс. 2:6–9], то пасля згадвання гісторыі разбурэння Ерусаліма яна асацыіруецца ўжо з караючым «мячом» Усявышняга, Божай адплатай за грэх у зямным жыцці людзей, якая ўжо адбылася, і будучай канчатковай адплатай на Страшным судзе [2, с. 122–123].

Стыль прамоўніцкага апавядання Ціхана Задонскага мае іншую мастацкую прыроду: метафарычнасць, алегарызм, як і метанімічныя адносіны, прадстаўлены ў ім не так шырока, як у Георгія Каніскага. Можна сказаць, што яго стыль імкнецца да метафарычнага, паколькі мае шмат супастаўленняў, параўнальных зваротаў (параўнанне як этап стварэння метафары, які з'яўляецца, па словах А. Н. Весялоўскага, «празаічным актам свядомасці, які расчляніў прыроду» (цыт. па [4, с. 314])), увасабленняў і яркіх эпітэтаў.

Найбольш пашыраным мастацкім прыёмам у Ціхана Задонскага з'яўляецца складанае параўнанне, прадстаўленае ў выглядзе канструкцый з паўторамі, супастаўленнямі, аднастайнымі вобразнымі азначэннямі і антытэзамі, якія робяць вобразы ў аповедзе прапаведніка выразнымі, адчувальнымі, блізкімі слухачу: «Набылі Месію, якога ўсе, як зямля, якая прагне вады, як той, што сядзіць у цемры, святла, як у вязніцы зняволены збавіцеля, як нямоглы лекара, як авечкі аблудныя пастыра, жадалі»; «…бачым ужо Бога

ў чалавеку, Творцу ў стварэнні, Уладыку ў рабскім выглядзе»; «…але адзіны ад другога бегае, паколькі чорнае да белага не прыстае, салодкае з горкім не ладзіцца, святло з цемрай удзелу не мае» і інш. [3, с. 29].

Думка Ціхана Задонскага незвычайна ясная, празрыстая і, на першы погляд, нават спрошчаная, паколькі ён ужывае пераважна словы ў іх прамым значэнні. Большасць эпітэтаў, якія ім выкарыстоўваюцца, як і ў Георгія Каніскага, традыцыйныя для хрысціянскіх тэкстаў: *прадвечная ісціна*, *царства вечнае*, *салодкі Ісус*, *першазваны Андрэй*, *апосталі святі*, *любоў шчырая*, *у цудоўнай палаце*, *нарадзіўся цудоўна*, *Маці Дзеву чыстую*, *авечкі аблудныя*, *акаянае наша жыццё* і інш.

Шматлікія паўторы надаюць тэксту «слова» Ціхана адмысловы, амаль музычны, рытмічны малюнак, які чымсьці нагадвае стыль народнага эпічнага распеву: «Чуем ад Яго вестку прыемную, прыемную вестку – пакаянне» [3, с. 29]. Такі мастацкі стыль адначасова становіцца блізкім і да кніжнага царкоўнаславянскага, і да народна-паэтычнага, фальклорнага стыляў, прычым элементы гэтых дзвюх розных эстэтычных сістэм злучаюцца ў творчасці Ціхана Задонскага вельмі гарманічна. Народна-паэтычны стыль выяўляецца, у прыватнасці, у прысутнасці трансфармаваных рускіх прыказак: «Ці не агульная прыказка ёсць, што падобны з падобным сябруе?» («Свой сваяка бачыць здалёку») або «Двудушнасцю, якая на языку мёд, а ў сэрцы жоўць носіць» («На языку мёд, а пад языком лёд» (Задонскі фактычна выкарыстоўвае той жа двухчлен, другая частка якога прадстаўлена ўжо біблейскай метафарай)).

Для мовы Георгія Каніскага характэрны звароты падчас апавядання да слухачоў, якіх ён практычна заўсёды называе слухачамі дабравернымі або набожным саслоўем беларускім. Ціхан Задонскі таксама звяртаецца да паствы, аднак яго звароты больш лаканічныя (напрыклад, ён выкарыстоўвае слова «слухачы»), паколькі ўключаны ў больш дынамічнае ў эмацыянальных адносінах апавяданне. Гэтыя прамыя звароты робяць пропаведзь падобнай да даверлівай гутаркі, утрымліваюць увагу паствы, залучаюць прысутных у працэсе асэнсавання складанай тэасофскай ці маральнай праблемы.

Пытанні і воклічы, у тым ліку рытарычныя, надаюць «слову» высокую эмацыянальнасць. Прыклады выкарыстання гэтых рытарычных прыёмаў сустракаюцца і ў пропаведзі Георгія Каніскага («І як нам не радавацца аб прышэсці гэтага найпатрэбнейшага лекара, нам, якія адчуваюць і слепату, і галізну, і кульганне, і паслабленне душ нашых?»; «О, як жа весялімся прышэсцем у свет збавіцеля нашага!»; «О дрэннае жыццё, да якога ты шаленства людзей прыводзіш!» [2, с. 123–126]), і ў пропаведзі Ціхана Задонскага («Ды дзе ж нам Яго шукаць?»; «О, як жа благаслаўлёныя вы, Пятро і Андрэе святы з іншымі, браціяю вашай, што так неацэнны скарб здабудзеце!»; «Госпадзі, яві нам святую выяву аблічча Твайго!» [3, с. 28–31]).

Пры пабудове гамілііі Георгій Каніскі дакладна ацэньвае ўзровень светаўспрымання звычайнага прыхаджаніна (епіскап, былы рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі і прафесар яе галоўных кафедр, які прыехаў на Магілёўскую кафедру, сутыкнуўся з непісьменнасцю не толькі паствы, але і святароў, некаторыя з якіх нават не ўмелі чытаць і здзяйснялі богаслужэнні і трэбы па памяці, лепш ці горш трапляючы ў патрэбны тэкст). Фактычна гэтая арыентацыя не на самых адукаваных, а на самых адсталых слухачоў у храме дыктуе Георгію ўнутраную логіку пабудовы прапаведніцкага тэксту. Адштурхваючыся ад відавочнай для непісьменнага слухача рэальнасці, ад рэалій паўсядзённага і побытавага характару, Георгій спачатку паднімаецца да ўзроўню біблейскага сюжэта, нярэдка побытавага характару, які афармляецца ў прытчавую форму, і толькі затым – да ўзроўню філасафічнай абстракцыі, што ўвасабляецца ў вобразна-сімвалічную і нярэдка прытчавую форму. Пасля іх разгляду прапаведнік вяртае слухачоў (ужо інтэлектуальна падрыхтаваных) да асноўнага біблейскага сюжэта і раскрывае яго сэнс відавочным, але больш глыбокім тлумачэннем. Так аратар вяртаецца да тэзіса і паўтарае яго ўжо як абгрунтаваную выснову (прычым такія паўторы ў Георгія Каніскага нярэдка трохкратныя, што дазваляе замацаваць асноўную думку «слова» ў памяці слухачоў). Вяртанне да першаснага плана апавядання і да прамога значэння слоў дазваляе прапаведніку без цяжкасці правесці паралель паміж мінулымі евангельскімі часамі і сучаснасцю ў іх духоўнай узаемасувязі.

Такім чынам, кампазіцыйная структура храмавага слова (у разгледжаным намі вышэй «Слове на Раство») Георгія Каніскага мае кальцавую будову, якая складаецца з некалькіх зведзеных ліній. Першае кальцо – доказ тэзіса «Хрыстос ёсць радасць усяму свету», другое кальцо – даследаванне прычын і наступстваў збянтэжанасці Ерусаліма (а шырэй усяго чалавечага роду), трэцяе кальцо (унутранае лагічнае ядро) – пропаведзь догмату аб Сыне Божым: Хрыстос ёсць цар, вызваліцель, міратворца, лекар і суддзя. Такая кампазіцыя надае твору асаблівую складнасць, дагматычная і павучальная ідэя ў ёй пры ўсёй складанасці становіцца празрыстай, актыўна ўводзіцца ў памяць слухача і замацоўваецца ў ёй. Пры гэтым усё «слова» адпавядае патрабаванням логікі, гармоніі і геаметрыі: нават знешне кампазіцыйныя часткі твора суразмерныя.

Вонкава кампазіцыя пропаведзі Ціхана Задонскага таксама мае кальцавую структуру. Яна пачынаецца і заканчваецца апісаннем малітоўнай радасці ад здабыцця Месіі, аднак тэзіс, у якім выяўлены агульны пафас прамоўніцкага выступлення, толькі атачае сабой асноўнае апавяданне, якое будуецца паслядоўна і мае ланцуговую структуру. Рускі прапаведнік не даследуе, як прафесар-акадэміст Георгій Каніскі, змест догматаў.

Заключэнне

Праведзены аналіз аратарскіх твораў Георгія Каніскага і Ціхана Задонскага паказвае, што абодва прапаведнікі выкарыстоўваюць дастаткова шырокі спектр мастацкіх прыёмаў, якія дазваляюць ім выказаць у выразнай форме свае рэлігійныя думкі і пачуцці, – метафару, метанімію, антытэзу, эпітэт, параўнанне, зварот і інш. Варта прызнаць, што элемент мастацкасці ў храмавай рыторыцы свяціцеляў носіць дапаможны, а не асноўны характар, паколькі выступае як сродак выражэння духоўнага звышмастацкага зместу, пераважна рацыянальнага ў Георгія Каніскага і эмацыянальнага ў Ціхана Задонскага. Мастацкі стыль Георгія Каніскага трэба прызнаць метафарычным або біблейска-метафарычным, паколькі аўтар-прамоўца, у адрозненне ад аўтара-мастака, не імкнецца да стварэння арыгінальных метафар, а творча выкарыстоўвае вядомы арсенал устойлівых у рэлігійнай літаратуры вобразных выразаў, каб найлепшым чынам адлюстраваць выратавальны сэнс прамовы. Стыль Ціхана Задонскага блізкі да метафарычнага, але ў ім пераважаюць эмацыянальна афарбаваныя словы ў прамым значэнні, а мастацкасць дасягаецца з дапамогай іншых сродкаў: параўнанняў, супрацьпастаўленняў, эпітэтаў, воклічаў, зваротаў і інш.

У цэлым свяціцель Георгій Каніскі будуе святочную пропаведзь як глыбока прадуманую, лагічна і нават геаметрычна правільную прамову, у якой кожны элемент дастаткова трывала ўключаны ў агульную сістэму, па сутнасці, філасофскага аналізу, які афармляецца прапаведнікам у па-мастацку развітую форму.

Свяціцель Ціхан Задонскі наўмысна менш разважлівы – ён «пяе Хрыста», у параўнальна простых выразах шукае шлях да яго, апелюе не столькі да розуму слухачоў, колькі да іх пачуццяў, запальваючы ў сэрцах хрысціян малітоўнае гарэнне.

Пры гэтым рацыянальны і пачуццёвы пачаткі не супрацьпастаўляюцца ў «словах» беларускага і рускага свяціцеляў, яны злучаюцца ў гармоніі, якая нясе ў сабе светлы водбліск сусветнай любові Творцы да свайго тварэння.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Буглаков М. *Преосвященный Георгий Конисский, архиепископ Могилёвский.* Минск: Виноград; 2000. 656 с.

2. *Слова и речи Георгия Конисскаго, Архиепископа Могилёвскаго.* Могилёв-на-Днепре: Скоропечатня и литография Я. Н. Подземскаго; 1892. 470 с.

3. *Творения иже во святых отца нашего Тихона Задонскаго*. *Том 1.* Москва: Синодальная типография; 1889. 328 с.

4. Томашевский БВ. *Теория литературы. Поэтика.* Москва: Аспект Пресс; 1996. 334 с.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 26.06.2024.
Received by editorial board 26.06.2024.

УДК 821.161.3

ИДЕЙНО-МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ ТВОРЧЕСТВА МИХАСЯ МАШАРЫ НА СТРАНИЦАХ ЖУРНАЛА «CHRYŚCIJANSKAJA DUMKA»: ТЕКСТОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

Д. О. ЮРКОЙТЬ[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Аннотация. Рассмотрено творческое наследие западнобелорусского поэта Михася Машары, опубликованное на страницах религиозного журнала «Chryścijanskaja dumka». Доказано, что при выявлении идейно-мировоззренческих ориентиров творчества автора нельзя ограничиваться культурно-историческим методом исследования, необходимо использовать вспомогательный текстологический анализ. Выявлены изменения идеологического характера в стихотворениях, впоследствии переизданных в советское время, что позволяет говорить о сложности объективного рассмотрения творчества поэта при игнорировании оригинальных публикаций. Сделан вывод, что творчеству Михася Машары свойственно наличие не только широты и смелости мышления, черт имажинизма, но и экзистенциальных мотивов, чуждых тенденциозной советской поэзии 1930-х гг.

Ключевые слова: западнобелорусская поэзия; идейно-мировоззренческие ориентиры; текстологический анализ; периодические издания; Михась Машара; журнал «Chryścijanskaja dumka»; образ будущего.

ІДЭЙНА-СВЕТАПОГЛЯДНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ТВОРЧАСЦІ МІХАСЯ МАШАРЫ НА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСА «CHRYŚCIJANSKAJA DUMKA»: ТЭКСТАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Д. А. ЮРКОЙЦЬ[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Анатацыя. Разглядаецца творчая спадчына заходнебеларускага паэта Міхася Машары, апублікаваная на старонках рэлігійнага часопіса «Chryścijanskaja dumka». Даказваецца, што пры раскрыцці ідэйна-светапоглядных арыенціраў творчасці аўтара немагчыма абмяжоўвацца культурна-гістарычным метадам даследавання, неабходна карыстацца дапаможным тэксталагічным аналізам. Выяўлены змены ідэалагічнага характару ў вершах, якія былі пераапублікаваны ў савецкі час, што дазваляе гаварыць пра цяжкасць аб'ектыўнага разгляду творчасці паэта пры ўмове ігнаравання арыгінальных публікацый. Робіца выснова, што творчасці Міхася Машары ўласціва наяўнасць не толькі шырыні і смеласці мыслення, рыс імажынізму, але і экзістэнцыяльных матываў, далёкіх ад тэндэнцыйнай савецкай паэзіі 1930-х гг.

Ключавыя словы: заходнебеларуская паэзія; ідэйна-светапоглядныя арыенціры; тэксталагічны аналіз; перыядычныя выданні; Міхась Машара; часопіс «Chryścijanskaja dumka»; вобраз будучыні.

Образец цитирования:
Юркойць ДА. Ідэйна-светапоглядныя асаблівасці творчасці Міхася Машары на старонках часопіса «Chryścijanskaja dumka»: тэксталагічны аспект. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:12–18.
EDN: AHKKXG

For citation:
Yurkoits DA. Ideological and worldview features of Mikhas' Mashara creativity on the pages of «Chryścijanskaja dumka» magazine: textological aspect. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2025;1:12–18. Belarusian.
EDN: AHKKXG

Автор:
Дмитрий Олегович Юркойть – аспирант кафедры истории белорусской литературы филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Л. Д. Синькова.

Author:
Dzmitry A. Yurkoits, postgraduate student at the department of history of Belarusian literature, faculty of philology.
zmiceryurk@gmail.com
https://orcid.org/0009-0004-7526-6855

IDEOLOGICAL AND WORLDVIEW FEATURES OF MIKHAS' MASHARA CREATIVITY ON THE PAGES OF «CHRYŚCIJANSKAJA DUMKA» MAGAZINE: TEXTOLOGICAL ASPECT

D. A. YURKOITS[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Abstract. The creative heritage of the Western Belarusian poet Mikhas' Mashara, published on the pages of the religious magazine «Chryścijanskaja dumka», is considered. It is proved that in order to identify the ideological and worldview guidelines of the author's work, one cannot limit oneself to the cultural-historical method of research, it is necessary to use auxiliary textual analysis. Ideological changes in poems subsequently republished in Soviet times have been identified, which suggests the difficulty of objectively considering the poet's work while ignoring original publications. It is concluded that the work of Mikhas' Mashara is characterised not only by the breadth and courage of thinking, features of imaginism, but also by existential motives that are alien to the tendentious Soviet poetry of the 1930s.

Keywords: Western Belarusian poetry; ideological and worldview guidelines; textological analysis; periodicals; Mikhas' Mashara; magazine «Chryścijanskaja dumka»; the image of the future.

Уводзіны

Вывучэнне гісторыі літаратуры немагчыма ўявіць без выкарыстання прыёмаў тэксталогіі, асабліва калі гаворка ідзе пра творы, напісаныя ў складаных гістарычных і грамадска-палітычных умовах, да якіх, бясспрэчна, адносяцца і рэаліі жыцця ў Заходняй Беларусі (1921–1939). Неўзабаве творы заходнебеларускіх пісьменнікаў перавыдаваліся ўжо ў іншай краіне, дзе людзі адкрывалі для сябе новую эпоху з яе ўласнымі законамі і ідэалогіяй. Гэтымі абставінамі тлумачыцца наяўнасць розных варыянтаў адных і тых жа тэкстаў у спадчыне тых беларускіх пісьменнікаў, якія пачыналі свой творчы шлях у Заходняй Беларусі. Акадэмік Д. С. Ліхачоў заўважаў: «…в литературоведении созрела необходимость каждому текстологу быть одновременно широким историком литературы, а историку литературы непременно изучать рукописи. Текстологическое исследование – это фундамент, на котором строится вся последующая литературоведческая работа» [1, с. 176]. Важнасць звароту да арыгінальных тэкстаў 1921–1939 гг. тлумачыцца тым, што «выводы, добытые текстологическим исследованием, очень часто опровергают самые широкие умозаключения литературоведов, сделанные ими без изучения рукописного материала» [1, с. 178]. З пазіцыі гістарычнай дыстанцыі мы, знаёмыя з грамадска-палітычнымі абставінамі, ідэалогіяй мінулых перыядаў гісторыі, можам не толькі адшукаць першаварыянты пэўных тэкстаў, прасачыць змены ў наступных рэдакцыях, але і растлумачыць праўкі, таму што, як піша згаданы навуковец, «история текста произведения не может сводиться к простой регистрации изменений. Изменения текста должны быть объяснены» [1, с. 188].

Поўны «ланцуг» тэксталагічнага даследавання гісторыі тэксту ў нашым выпадку павінен уключаць сам рукапіс, наступныя варыянты твора, змешчаныя як у перыядычных выданнях, так і ў зборніках, выдадзеных у Заходняй Беларусі і СССР. Аднак у рамках артыкула мы абмяжуемся выключна тэкстамі з заходнебеларускіх газет і часопісаў, якія адыгрываюць важную ролю ў пошуках першых варыянтаў вядомых, а таксама раней невядомых твораў. Гэта акалічнасць звязана з немагчымасцю часам знайсці рукапіс, хаця б таму, што паэзія Заходняй Беларусі ў асноўным мела масавы характар, адпаведна, пра многіх аўтараў можна даведацца выключна з газет і часопісаў. Акрамя таго, у Заходняй Беларусі выдавалася нязначная колькасць зборнікаў вершаў у параўнанні з БССР (і нават досыць вядомыя аўтары часам не мелі асобнага зборніка сваіх твораў), а вось «газеты… з'яўляліся цэнтральным сродкам публікацыі літаратурных твораў у Заходняй Беларусі» [2, с. 273]. Такім чынам, асноўнай крыніцай інфармацыі выступае перыёдыка, якая можа дапамагчы ў пераглядзе наяўных звестак аб творчасці і асобе аўтара (напрыклад, з'явіўся новы погляд на постаць заходнебеларускага паэта С. Крыўца [3]). Тэксталагічная праца ўскладняецца тым, што ўласна літаратурных часопісаў у Заходняй Беларусі было няшмат, таму творы маглі быць апублікаваны ў выданнях рознага кшталту. Між тым для заходнебеларускіх газет і часопісаў была характэрна «прэкарнасць» («няўстойлівасць» (тэрмін выкарыстала Г.-Б. Колер)). Гэта тэндэнцыя не спрыяла развіццю літаратурнага працэсу ў той час, бо перашкаджала кансалідацыі літаратурных сіл. Відавочна, што названыя акалічнасці абцяжарваюць сучасныя тэксталагічныя росшукі.

Большасць даследчыкаў беларускай літаратуры, пачынаючы тэксталагічнае даследаванне, звяртаецца да грунтоўнага выдання «Беларускія пісьменнікі: біябібліяграфічны слоўнік» [4], паколькі ў ім можна

знайсці бібліяграфічны спіс твораў, змешчаных у перыядычных выданнях, і мы тут не выключэнне. Аднак працытуем складальнікаў слоўніка: «Як і ў кожным выданні такога тыпу, у слоўніку несумненна будуць бібліяграфічныя пропускі і недакладнасці (хаця б з-за таго, што не выяўлены і не распісаны ўсе крыніцы)» [4, т. 1, с. 11]. Так, мы прааналізавалі 270 нумароў часопіса «Chryścijanskaja dumka» (1928–1939), у 15 з якіх апублікаваны вершы Міхася Машары (№ 6, 7, 22 за 1937 г.; № 1–5, 7, 9, 11, 12, 14, 24, 25 за 1938 г.). Між тым у слоўніку ёсць інфармацыя толькі пра 3 з іх за 1937 г. [4, т. 4, с. 273]. Частка вершаў Міхася Машары, надрукаваных у згаданым часопісе, былі змешчаны ў паэтычных зборніках, выдадзеных у савецкія часы, аднак у некаторыя з іх унесены змены.

Як ужо было заўважана, у поўнай ступені гісторыя тэксту намі не прасочваецца, таму што мы абмяжоўваемся варыянтамі, змешчанымі ў заходнебеларускіх перыядычных выданнях і савецкіх зборніках. Гэта акалічнасць з'яўляецца важнай, таму што газеты і часопісы Заходняй Беларусі былі пад ідэалагічным уплывам розных палітычных партый і груповак. Адпаведна, у іх існавала цэнзура. Матэрыялы ў рубрыках кшталту «Наша пошта», «Паштовая скрыня» нярэдка рэдагаваліся з пункту гледжання і стылістыкі тэксту, і цэнзуры. Таму аўтарскі рукапіс мог быць зменены яшчэ на этапе публікацыі ў газеце (часам існавала больш за два варыянты аднаго і таго ж верша, у якіх можна прасачыць не толькі рост паэтычнага майстэрства аўтара, але і яго светапоглядную трансфармацыю, як, напрыклад, у вершы В. Таўлая «Ніва» [5]). Перадусім наша мэта – параўнаць функцыянаванне аднаго і таго ж твора ў розных грамадска-палітычных умовах, а таксама растлумачыць, чаму пэўныя творы не маглі быць перавыдадзены пасля 1 верасня 1939 г. (або выдаваліся, але са зменамі). Аналізуемы намі корпус тэкстаў узяты з рэлігійнага часопіса, які належаў палітычнай партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», што ўжо пэўным чынам сведчыць пра ідэйныя перакананні аўтараў, якія дасылалі свае творы ў рэдакцыю часопіса.

Вынікі і іх абмеркаванне

Верш Міхася Машары «***Biełae, śnieżnaje, rodnaje pole» [6] у савецкім зборніку апублікаваны пад назвай «Роднае поле» [7, с. 192][1]. Забягаючы наперад, варта заўважыць, што вершы Міхася Машары, змешчаныя ў часопісе «Chryścijanskaja dumka», надзвычай песімістычныя. У іх не прасочваецца аптымізм паэта, на які ўказвалі многія літаратурныя крытыкі Заходняй Беларусі. Аднак у пазнейшых варыянтах некаторых вершаў лірычны герой паўстае, як і патрабавалася (цытаты савецкіх крытыкаў пра песімізм, у тым ліку і ў адносінах да творчасці Міхася Машары, прывядзём ніжэй), калі не бадзёрым аптымістам, то бунтаром, які цвёрда верыць у надыход светлай будучыні. Тое ж самае назіраецца і ў згаданым вершы. У пачатку твора мы сустракаем магістральны для паэта вобраз поля (Міхась Машара выкарыстоўвае яго ў многіх іншых вершах: *Поле, поле! Куды ён імкнецца, // тваіх ніў каласяны палёт?* [7, с. 67]; *Люблю цябе, // ў цішы сумуючае поле, – // зямля, абнятая асенняю смугой* [7, с. 151]; *Поле маё, поле, // поле над ракой, // мне душу да болю // мучыць твой спакой* [7, с. 156]). Першы катрэн пачынаецца аднолькава ў дзвюх рэдакцыях верша (у часопісе ўсе прыведзеныя вышэй вершы Міхася Машары надрукаваны лацінкай, акрамя апошняга, апублікаванага ў № 25 за 1938 г.: *Biełae, śnieżnaje, rodnaje pole // Śnić kałasiana-pryhožyja sny*[2] [6]. Аднак наступныя два радкі катрэна адрозніваюцца: *Serca, ty chočaš znoŭ muki i boli, // Serca, – ty prosiš nanova viasny!* [6]; *Сэрца, ты хочаш так шчасця і волі, // сэрца, ты просіш ізноўку вясны?* [7, с. 192]. У другім катрэне два радкі таксама ідэнтычная: *Ja ŭžo daŭno nie prašuś i nia płaču, // Kryŭdy prymaju biaz kryku i śloz* [6]. Заўважым, што адразу тут прасочваюцца ясенінскія матывы (*Не жалею, не зову, не плачу, // Все пройдет, как с белых яблонь дым…*), што з'яўляецца характэрнай рысай творчасці Міхася Машары. Між тым досыць песімістычныя радкі *I nad Krainaj – prastoram źviniačym // Pieśni składaju pra śnieh i maroz* [6] замяняюцца радкамі *роднай краіне прарочу удачу // песні складаю пра будучы лёс* [7, с. 192]. Трэці катрэн (*Piesień druhich nieprasicie siahodnia // I nia vinicie za ich pieśniara // Siańnia ziamla ŭ zimovym razhoni, // Siańniaka – piesień ściudzionych para*) [6] у пазнейшым варыянце верша выдалены.

Уплыў творчасці С. Ясеніна на творчасць Міхася Машары заўважаўся на старонках заходнебеларускага перыядычнага друку нярэдка. Яшчэ ў 1930 г. у часопісе «Вучнёўскі звон» быў змешчаны артыкул пад назвай «Есенін у беларускай поэзіі» [8], дзе на аснове аналізу вершаў з першага зборніка Міхася Машары «Малюнкі» (1928) робіцца выснова, што С. Ясенін «гучыць як у вобразах, так і ў рытме» [8, с. 4]. С. Станкевіч пісаў: «З пасярод чытаных у вастрозе аўтараў найбольш прамовіў да ягонае душы Ясенін, які зрабіў ладны ўплыў на ягоную творчасьць» [9, с. 173]. Нехта А. Бужанскі разважаў: «Прынята кожнага паэта кваліфікаваць да нейкага кірунку ці школы. Гэта зьявішча часта мае штучны, ненатуральны характар: мастаку прыпінаюцца атрыбуты і номэнклятура, аб каторых ён ніколі ня сьніў і да сваяцтва з каторымі прызнаецца толькі пад прэсыяй крытыкаў і рэцэнзэнтаў» [10, с. 107]. Аднак ніжэй аўтар заўважаў,

[1]Тут і далей творы, акрамя змешчаных у часопісе, цытуюцца па савецкім выданні «Мая азёрная краіна (выбранае)» [7]. – *Д. Ю.*
[2]Тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем арфаграфіі і пунктуацыі арыгінала. – *Д. Ю.*

што «на расейскім грунце найбліжэйшым сваяком Машары зьяўляецца Сяргей Есенін» [10, с. 107]. Дарэчы, Янка Саламевіч, хоць у яго працы «Слоўнік беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.)» [11] такая інфармацыя не пададзена, у адным з лістоў С. Чыгрыну пісаў: «Раскрыў яго псеўданім У. А. Калеснік яшчэ ў 1993 годзе ў сваёй кнізе "Усё чалавечае"» [12, с. 212]. Многія даследчыкі прыпісваюць А. Бартулю псеўданім А. Бужанскі, спасылаючыся на У. Калесніка, які паведамляў, што ад Р. Шырмы даведаўся аб наступным: «Бужанскім аказаўся ў 30-я гады колішні абяцаючы паэт Яўген Бартуль» [13, с. 33]. А. Ліс, у сваю чаргу, узгадваў, што Максім Танк, паслухаўшы яго «аргументы супраць ідэнтыфікацыі Бужанскага як А. Бартуля… сказаў, што пісаў пад гэтым псеўданімам нехта з Польшчы, магчыма, з таго "Згуртавання беларусаў у Варшаве"» [14, с. 162]. Не паглыбляючыся ў падрабязнасці, заўважым, што артыкул аб творчасці Міхася Машары пачынаўся акурат словамі, прысвечанымі А. Бартулю: «Быў час, калі Бартуля залічалі да авангарду, гэта быў кандыдат на народнага паэта – надзея працоўных масаў на беларускім Парнасе! Іншая справа, што Бартуль далей трактараў неяк не пайшоў (Аб трактарах ён пісаў у 1929 г.). Жыццёвыя нягоды ў форме легіону "młodych" і судовае аплікантуры адцягнулі яго ад беларускага творства» [10, с. 104]. Таму дзіўным падаецца, што А. Бартуль пісаў пра сябе ў трэцяй асобе, хаця і магчыма. Савецкія крытыкі ўжывалі тэрмін «ясеніншчына» з негатыўнай канатацыяй і зневажалі за такія матывы не толькі Міхася Машару, але і, напрыклад, Т. Кляшторнага, С. Дарожнага і інш. Імажынізм з яго адмысловай вобразатворчасцю быў чужым савецкай літаратуры з 1930-х: самадастатковая прыгажосць у вершах павінна была саступіць месца надзённасці (а рысы імажынізму ў творах Міхася Машары прасочваюцца: *Viečar šeryja skryły raźviešaŭ // Za vaknom vałandaecca sum* [15]; *Noč sabakam lažyć la paroha* [16] і інш.).

Надзвычай важным з пункту гледжання тэксталагічнага аналізу ўяўляецца апублікаваны ў савецкім зборніку цыкл вершаў Міхася Машары «Года круг», які складаецца з 12 частак, назва кожнай з іх адпавядае месяцу [7, с. 161–169]. Невядома, ці суадносіцца такая кампазіцыйная будова з воляй аўтара, прынамсі, у заходнебеларускім перыядычным друку вершы з названага цыклу публікаваліся спарадычна, некаторыя пад іншымі назвамі, некаторыя з іншым зместам. У нумарах выдання «Chryścijanskaja dumka» змешчаны вершы пад назвамі «Studzień» [17], «Luty» [18], «Sakavik» [19], «Krasavik» [20], «Śnieżań» [21]. Пад такімі ж назвамі яны пададзены і ў савецкім зборніку (вядома, кірыліцай) [7, с. 161–164, 169], праўда, ідэйна-светапоглядны план у некаторых з іх зменены, на што яшчэ звернем увагу. У адным з нумароў таго ж часопіса знаходзім верш «***Viečar šeryja skryły raźviešaŭ» [15], які пасля атрымаў назву «Кастрычнік» [7, с. 167–168] і быў у некаторай ступені перапрацаваны. А ў часопісе «Калоссе» знаходзім творы з назвамі «Лета» [22, с. 216] («Чэрвень» [7, с. 165]), «Жніво» [22, с. 216] («Жнівень» [7, с. 166–167]), «Ліпень» [22, с. 214–215] (пазней ён пададзены пад такой жа назвай [7, с. 165–166]).

Верш пад назвай «Снежань» з'яўляецца апошнім з цыкла ў савецкім выданні і заканчваецца так: *Ён моўчкі доўга разважае. // Ён сын зімы, прадвесня друг. // Дванаццаты… Ён лік канчае // і замыкае… года круг* [7, с. 169]. Гэтыя радкі надзвычай важныя, таму што з'яўляюцца кульмінацыйнымі: тут снежань называецца прадвесня другам, адлюстроўваючы тыповую апазіцыю зіма – вясна, якая ілюструе адраджэнне жыцця. Іншая справа, што снежань не апошні зімовы месяц, таму тут відавочны лагічны збой. Аднак гэтымі радкамі выказваецца надзея на надыход лепшага жыцця (вясны). Між тым у арыгінале чытаем: *Dwanaccaty… Jon – začyniaje // staruju ličbu… Času – kruh. // Ni śloz, ni radaści nia znaje // jon syn Zimy, a Śmierci – druh* [21]. Замест выразу «*прадвесня друг*» з'яўляецца словазлучэнне «śmierci – druh». Відавочна, што ў дадзеным варыянце пра надзею на лепшую будучыню гаворка не ідзе.

Нягледзячы на тое што верш «Люты» ў абодвух варыянтах заканчваецца аднолькава пераканаўча: *Luty znaje – sercam čuje, // što nia doŭha być zimie* [18], ад верша пад назвай «Sakavik» вее татальнай безвыходнасцю, тугой, якой няма ў савецкім выданні. Радкі *I ničuć nia škoda dzion, što adciarpieli, // I ničuć niastrašna – novych muk i śloz* [19] замяняюцца на радкі *I зусім не шкода // снежнае завеі, // і зусім не страшны // больш ужо мароз* [7, с. 163]. У першым варыянце лейтматывам праходзіць нявера ў светлую будучыню (будуць новыя мукі і слёзы). Акрамя таго, з першага варыянта выдалены важныя радкі, у якіх заключана асноўная ідэя верша: *Sakavik pryhožy – u razbrodzi sinim, // Sakavik zdradlivy – u nastroj nia vier: // Ni ŭ zvon burlivy, – ni ŭ kancert kašyny // I ŭ dziavočy voču – nie hladzi ciapier* [19]. Трэба сказаць, што звычайна ў творчасці заходнебеларускіх паэтаў вясна асацыіравалася з надыходам лепшай будучыні, адраджэннем жыцця, хоць часам сустракаліся і песімістычныя настроі. Тут жа мы бачым, што сакавік мае азначэнне «здрадлівы»: нягледзячы на вонкавую прыгажосць, сутнасць яго такая ж, як і ў зімовых месяцаў, – па вялікім рахунку, нічога не змяняецца. Пацвярджэнне гэтай думцы мы бачым у заключных радках: *Sakavik kaprysny – maje šmat abliččaŭ // I začymś niaznanym – smahu i tuhu* [19]. Фінал верша ў пазнейшай версіі іншы: *Каб вярнуць разлогам // светлае аблічча, – // сакавік змывае // смутак і тугу* [7, с. 163]. Тут ствараецца акурат тыповы вобраз вясны для заходнебеларускай паэзіі.

У вершы «Красавік» назіраецца адваротная сітуацыя, якая ўрэшце не ўнікальна, – у новай версіі верша радкі не выдалены, не выпраўлены, а дапісаны, значыць, у арыгінале іх не было. З'явілася наступная

страфа: *Стаў вецер цёплы і крылаты, // прыгрэла сонейка раллю, // і чыстым золатам зярняты // лажацца ў пухлую зямлю* [7, с. 164]. Важна адзначыць гэта адрозненне, таму што тут мы бачым вобраз-сімвал «зярняты», што зноў жа ўвасабляе пачатак новага жыцця. Двухрадкоўе *Z tryvohaj niejkaju sialanie // Čakajuć Juravaj rasy* [20] ператвараецца ў двухрадкоўе *І ззяюць раніцай агнямі // праменні ў кропельках расы* [7, с. 164]. Невядома, што мелася на ўвазе пад чаканнем расы ў Юр'еў дзень, аднак у Гомельскай вобласці лічылася, што Юрава раса была «…вельмі карыснай для жывёлы. Калі з-за недахопу кармоў худоба цяжка пераносіла зімову, то ее ратавала толькі гэта раса. Даўней гаворылі: "Абы выйшла на Юраву расу"» [23, с. 77]. А на Віцебшчыне лічылі, што Юрава раса можа паспрыяць у чараўніцтве: «Ну вот, еслі я задумала аднімаць у суседкі малако, я цадзілку па расе пацягала на Юр'я. Вот мяне так учылі. А я сказала: а я не хачу. Да ўсхода сонца: "Юрава раса, дай малака да паяса". А я не хачу» [24, с. 22]. Для творчасці Міхася Машары ўвогуле характэрны фальклорны пачатак, што тлумачыцца цеснай сувяззю аўтара з вёскай, але і гарадскія матывы не былі чужымі яго творчасці, што пацвярджаюць творы, прысвечаныя Вільні (паэма «Падарожжа»). С. Станкевіч заўважаў: «Машара стараецца таксама зьвярнуцца да беларускага фольклёру, чэрпаць адтуль матар'ял для артыстычнага апрацаваньня… ён захоплюецца наўперад народнаю абраднасьцю, яе жывым і вясёлым настроем» [9, с. 178]. У адным з вершаў, змешчаных на старонках часопіса «Chryścijanskaja dumka», паэт параўноўвае народ Заходняй Беларусі з русалкай, гаворачы аб марнасці сваёй песні: *Jak i ty – hluchaja, // jak i ty – maŭčyć, // stolki ŭžo śpiavaju – // vas nie razbudzić* [25].

Як было згадана ў пачатку артыкула, часам у аўтара існавала некалькі версій аднаго і таго ж верша. Так, у пятым нумары часопіса «Шлях моладзі» за 1936 г. змешчаны верш пад назвай «Бярозка» [26]. Гэты ж твор амаль без змен змешчаны і ў савецкім зборніку [7, с. 98]. У гэтым выданні чамусьці выдалена апошняя страфа (акурат з фальклорным пачаткам, пра які было згадана вышэй): *Ў вадзе там ёсьць русалка // За мроі прыгажэй… // З тваёй красой вэсталкі // Усё-ж не зраўняцца ей* [26]. Цікава, што ў сёмым нумары часопіса «Chryścijanskaja dumka» за 1937 г. апублікаваны аднайменны верш [27], прычым выразна бачна, што ён напісаны на аснове версіі 1936 г. Розніца ў тым, што першапачаткова гэта быў прыродаапісальны верш пра «вясёлую бярозку», у якой «цалуе стан бялёсы вясковы пастушок», «косы сонца гуляюць на лістку і гладзяць па галоўцы, як родную дачку» [26]. У перапрацаваным варыянце застаюцца і пастушок, і сонца, аднак з'яўляецца і нявера ў моц вясны. Працягваецца згаданая намі вышэй нячаста сустракаемая ў заходнебеларускай паэзіі ідэя двуаблічнасці вясны. Спачатку яна называецца чароўнай: *Hod ad hodu pryhažejučy, // Tak biarozačka rasła, // Woś pryšła, piaščoty siejučy, // Znoŭ čaroŭnaja wiasna* [27], прычым акцэнт робіцца на цыклічнасці змен у прыродзе, дзе ўсё ідзе як звычайна. Аднак раптоўна з'яўляюцца хлопцы, якія прыйшлі з сякераю, каб здабыць бярозавы сок, і вось *Jaje kosy, kosy kwolyja, // Nie pakrylisia liściom // I nawiek jana, wiasiołaja, // Pažahnałasia z žyćciom* [27]. Відавочна, светаадчуванне ў лірычнага героя змянілася.

Бадай што самымі важнымі для разумення светаадчування лірычнага героя ў паэзіі Міхася Машары 1938 г. з'яўляюцца вершы «***Pišy, Michaś, pišy, pišy» [28], «***Pa śniezie biełym navakola» [29], «***Ja – adzin…» [16], «***Žyćcio majo nie ŭdałosia» [30], «***Сказаць людзям?» [31], ідэйны змест якіх абсалютна не ўпісваўся ў канцэпцыю паэзіі змагання. Перыядычны друк Заходняй Беларусі часта называў паэта аптымістам («U svaich liryčnych vieršach z vialikim optymizmam i patosam apiavaje jon ščaślivuju budučyniu narodu, jakaja, pavodle ŭjaŭleńnia pieśniara, chutka pavinna zakrasavać na našaj ziamli» [32, s. 10]; «Галоўнай адзнакай твораў Машаравых ёсьць бадзёрасьць і сьветлы оптымізм. Гэтая бадзёрасць лучыць яго з новай хваляй у беларускай літаратуры, якая ня знае тонаў мінорных жалю й безнадзеяньня» [9, с. 177]). Цалкам пагадзіца з прыведзенай вышэй цытатай С. Станкевіча цяжка: лірыка Міхася Машары зазнавала і «тоны мінорныя жалю», і «безнадзеянне» [9, с. 177] (праўда, артыкул быў напісаны ў 1932 г., калі песімізм Міхася Машары сапраўды не быў так ярка выяўлены). Іншая справа, што часам у вершах падобнага кшталту рабіўся акцэнт на ўласна-псіхалагічным складніку. У адным са сваіх крытычных артыкулаў, прысвечаных творчасці Міхася Машары, Максім Танк абсалютна пераканаўча даводзіць, што песімізм характэрны для яго творчасці, прычым песімізм глыбокі, які «ледзь не пераражаецца ў штось стыхійнае, з чым нават ня варта прабаваць змагацца» [33, с. 161], а аптымізм паэта Максім Танк называе «клічам, празьвінеўшым у пустым полі ня толькі не парваўшы за сабой, а нават не збудзіўшы спадзяваных адгалосаў рэха» [33, с. 163]. З такімі ацэнкамі можна пагадзіцца, пры тым што ўсяго праз год у часопісе «Літаратура і мастацтва» з'явіцца допіс: «Парасткі соцыялізма – гэта тэма стала цяпер асноўнай тэмай паэта» [34, с. 4]. Максім Танк небеспадстаўна заўважаў, што песімізм «пераліўся ў лірыку, і пры гэтым сказаў-бы ў лірыку выключна асабістую і таму робіць цяжкае ўражаньне. Усюды цэнтральнай асобай – паэт, яго "я", яго перажываньні, якія ў большасьці выпадкаў не зьяўляюцца характэрнымі для цэлай масы, а то нават застаюцца незразумелымі» [33, с. 163]. Адлюстраванне такога бачання песімізму ў паэта прадэманструем на канкрэтных прыкладах.

Пік самоты мы бачым у вершы «***Pišy, Michaś, pišy, pišy» [28], экзістэнцыяльны матыў якога скразны. Паэт звяртаецца да самога сябе, што відавочна па першым радку. Роль паэзіі ён бачыць у наступным: *Ty tolki spoŭni abaviazak // žyvoha – miž žyvych; // u carstva mroj, krasy i kazak // zavi źniamožanych usich – // ty tolki spoŭniš abavizak* [28]. Пад словам «царства», відаць, разумеецца творчасць. Між тым лірычны герой усведамляе канечнасць жыцця: пакуль ён жыве ў «świecie tvorčym i žyvym» [28], ён выконвае свой абавязак, быццам усклаўшы на сябе місію (нясе сваю песню людзям). Аднак, звяртаючыся да сябе, аўтар заўважае: *Ty tolki drobnieńka iskra // u mory vohniennym – Byćcia*; *Ty muraviej siamji biazlikaj* [28]. Дакладна не маглі арганічна глядзецца разам з адкрыта тэндэнцыйнай беларускай савецкай паэзіяй радкі *U tabie jość častka prapačatku // I ŭ bieskaniečnaść pojdziem z jej // i na't ziamlia tabie nia matka* [28]. У творы «***Pa śniezie biełym navakola» [29] прасочваецца быццам пакорнасць лёсу, лірычны герой узгадвае часы маладосці. Нягледзячы на тое што яго «viasna była biaz maju» [29], лірычны герой ні пра што не шкадуе: *Ja vybraŭ sam svoj šlach žyćciovy, // ja – nie pakryŭdžany nikim* [29], замест скаргаў паэт раіць *šukaj ŭ biahučym mih pryhožy // i nie viartaj, što za tabooj* [29]. Паэт (ён жа лірычны герой у дадзеным выпадку) стаміўся, адспяваў сваю песню, ён адкрыта заяўляе, як бы падсумоўваючы зробленае: «Žyćcio majo nie ŭdałosia»; «Što moh – addaŭ usio ludizam» [30]. Цяпер усё, чаго ён хоча, можна апісаць радкамі *Jak luba časam pamalicca, // Kali nia maješ sił piajać* [30]. Татальная адзінота, страта мэты і веры, знямога працягваюцца і ў наступным вершы – унутраным маналогу: *Ja – adzin…, u ciemnacie…, u cišy*; *U stamlonaj źniamohłaj duši // zaćbitaje uzorna tryvoha*; *Jak mnie być – z vami, dumki maje?* [16]. Трэба сказаць, што для вершаў Міхася Машары характэрна дваістасць пачуццяў. Маецца на ўвазе, што творы з абсалютна процілеглым настроем датаваны адным і тым жа годам. Напрыклад, у часопісе «Шлях моладзі» ў 1938 г. быў змешчаны твор, у якім пераканаўча заяўлена: *Мы з табой, доля, // сягодніка – спорым – // Болей ня просім, // Паняй была ты, – // а будзеш – слугой* [35]. У фінале верша з'яўляецца быццам бы апраўданне паэта: *Ты нам выбачыш // Краіна Родная, // Што мы часамі // Горка бязверай грашым* [35]. Аднак агульны настрой творчасці паэта ў 1938 г. песімістычны.

Заключэнне

Разгляд вершаў Міхася Машары ў часопісе «Chryścijanskaja dumka» дазваляе зрабіць выснову аб песімістычным настроі вершаў і няверы лірычнага героя ў хуткі надыход светлай будучыні. Для творчасці паэта характэрна наяўнасць не толькі шырыні і смеласці мыслення, рыс імажынізму, але і экзістэнцыяльных матываў. Поўнае раскрыццё ідэйна-светапогляднага аспекту творчасці Міхася Машары немагчыма зрабіць, абмяжоўваючыся савецкімі выданнямі яго твораў, што было даказана шляхам тэксталагічнага аналізу. Вышэйпералічаныя рысы творчасці паэта не дазвалялі друкаваць яго вершы, апублікаваныя ў заходнебеларускай перыёдыцы, у савецкіх выданнях, таму пры публікацыі ўносіліся пэўныя відавочныя карэкціроўкі ідэалагічнага характару.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Лихачев ДС. *О филологии*. Москва: Высшая школа; 1989. 206 с.
2. Колер Гун-Брыт. Заходнебеларуская літаратура і беларускае літаратурнае поле (1921–1939). Спроба вызначэння іх месца. У: Навуменка ПІ, складальнік. *Выбраныя працы па беларускім літаратуразнаўстве*. Мінск: БДУ; 2021. с. 247–293.
3. Юркойць ДА. Пра што сведчаць старонкі перыядычнага друку: да праблемы асэнсавання творчасці Сяргея Крыўца (1909–1945). *Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 3, Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія*. 2024;1:62–69.
4. Багдановіч ІЭ, рэдактар. *Беларускія пісьменнікі. Том 1–6.* Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі; 1992–1994.
5. Юркойць ДА. Тэма дзіцячага голаду ў творчасці В. Таўлая (на прыкладзе трох рэдакцый верша «Ніва»). У: Навумава ГУ, рэдактар. *Мова і літаратура. Матэрыялы 80-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў філалагічнага факультэта БДУ; 27 красавіка 2023 г.; Мінск, Беларусь.* Мінск: БДУ; 2023. с. 250–253.
6. Mašara M. ***Biełae, śniežnaje, rodnaje pole. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;1:5.
7. Машара М. *Мая азёрная краіна (выбранае)*. Мінск: Дзяржвыдавецтва БССР; 1962. 492 с.
8. XI. Есенін у беларускай поэзіі. *Вучнёўскі звон*. 1930;1:3–5.
9. Станкевіч С. Аб беларускай літаратурнай сучаснасьці ў Заходняй Беларусі. *Нёман*. 1932;5:165–179.
10. Бужанскі А. Паэмы Міхася Машары. *Калосьсе*. 1937;2:104–108.
11. Саламевіч Я. *Слоўнік беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў (XVI–XX стст.).* Мінск: Мастацкая літаратура; 1983. 207 с.
12. Чыгрын С. *Хочацца дахаты: гісторыка-краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя артыкулы, гутаркі, лісты, аўтографы*. Мінск: Кнігазбор; 2014. 239 с.
13. Калеснік УА. *Усё чалавечае: літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы*. Мінск: Мастацкая літаратура; 1993. 381 с.
14. Ліс АС. На разломе эпохі (штрыхі да партрэта Максіма Танка). *Тэрмапілы.* 2002;6:150–166.
15. Mašara M. ***Viečar šeryja skryły raźviešaŭ. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;2:5.
16. Mašara M. ***Ja – adzin… *Chryścijanskaja dumka*. 1938;12:3.
17. Mašara M. Studzień. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;3:1.
18. Mašara M. Luty. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;7:5.

19. Mašara M. Sakavik. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;11:5.
20. Mašara M. Ķrasavik. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;14:3.
21. Mašara M. Śniežań. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;22:1.
22. Машара М. Ліпень. Лета. Жніво. *Калосьсе*. 1937;4:214–216.
23. Новак ВС. *Фальклорная практыка. Частка 1.* Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны; 2009. 119 с.
24. Лобач УА, укладальнік. *Полацкі этнаграфічны зборнік. Выпуск 2, Народная проза беларусаў Падзвіння.* Наваполацк: ПДУ; 2011. 366 с.
25. Mašara M. Ci ty śpiš, – nia čuješ. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;5:5.
26. Машара М. Бярозка. *Шлях моладзі*. 1936;5:1.
27. ММ. Biarozka. *Chryścijanskaja dumka*. 1937;7:5.
28. Mašara M. ***Pišy, Michaś, pišy, pišy. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;4:3.
29. Mašara M. ***Pa śniezie biełym navakola. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;9:4.
30. Mašara M. ***Žyćcio majo nie ŭdałosia. *Chryścijanskaja dumka*. 1938;24:1.
31. Mašara M. ***Сказаць людзям? *Chryścijanskaja dumka*. 1938;25:1.
32. A. R–uk. Naš litaraturny maładniak. *Шлях моладзі*. 1937;4:7–14.
33. Танк Максім. Стрэхі за гасьцінцам. *Беларускі летапіс*. 1937;8:161–164.
34. Бараг Л. Міхась Машара. *Літаратура і мастацтва*. 1940;37:4.
35. Машара М. ***Поле замоўкла… *Шлях моладзі*. 1938;23:4.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 26.06.2024.
Received by editorial board 26.06.2024.

УДК 821.161.3.09-31Гниломёдов

ИСПОЛЬЗОВАНИЕ КУЛЬТУРНЫХ КОДОВ ПРИ ОТРАЖЕНИИ ДЕЙСТВИТЕЛЬНОСТИ В РОМАНЕ В. ГНИЛОМЁДОВА «ПРАВДА ЖИВЕТ ПОСЕРЕДИНЕ»

Л. Г. ДУКТОВА[1), 2)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*
[2)]*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси, ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Беларусь*

Аннотация. Культурные коды на имплицитном уровне художественного текста репрезентируют культурные смыслы, связанные с ценностями, идеалами и моделями поведения определенной общности (нации, населения государства). Для романа В. Гниломёдова «Правда живет посередине» характерными являются коды с образами пограничья (середины) и этнического артефакта кудели. Поэтизация этих образов играет важную роль в определении идейной направленности романа. С помощью образов середины и кудели в произведении показаны ценности семьи, родины, родной земли, проблемы выбора в полифонии мнений, поиска истины.

Ключевые слова: культурный код; роман; белорусская литература; национальная идентичность.

ВЫКАРЫСТАННЕ КУЛЬТУРНЫХ КОДАЎ ПРЫ АДЛЮСТРАВАННІ РЭЧАІСНАСЦІ Ў РАМАНЕ У. ГНІЛАМЁДАВА «ПРАЎДА ЖЫВЕ ПАСЯРЭДЗІНЕ»

Л. Г. ДУКТАВА[1*, 2*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*
[2*]*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь*

Анатацыя. Культурныя коды на імпліцытным узроўні мастацкага тэксту рэпрэзентуюць культурныя сэнсы, якія тычацца каштоўнасцей, ідэалаў, мадэлей паводзін пэўнай супольнасці (нацыі, насельніцтва дзяржавы). Для рамана У. Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне» характэрнымі з'яўляюцца коды з вобразамі памежжа (сярэдзіны) і этнічнага артэфакта кужалю. Паэтызацыя гэтых вобразаў іграе важную ролю пры вызначэнні ідэйнай скіраванасці рамана. З дапамогай вобразаў сярэдзіны і кужалю ў творы паказаны каштоўнасці сям'і, роду, роднай зямлі, праблемы выбару ў поліфаніі меркаванняў, пошуку ісціны.

Ключавыя словы: культурны код; раман; беларуская літаратура; нацыянальная ідэнтычнасць.

Образец цитирования:
Дуктава ЛГ. Выкарыстанне культурных кодаў пры адлюстраванні рэчаіснасці ў рамане У. Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне». *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:19–24.
EDN: DHGTQI

For citation:
Duktava LG. Use of cultural codes when reflecting reality in the novel «The truth lives in the middle» by U. Gnilamedau. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2025;1:19–24. Belarusian.
EDN: DHGTQI

Автор:
Любовь Георгиевна Дуктова – кандидат филологических наук, доцент; доцент кафедры технологий коммуникации и связей с общественностью факультета журналистики[1)], старший научный сотрудник отдела белорусской литературы XX и XXI вв.[2)]

Author:
Liubou G. Duktava, PhD (philology), docent; associate professor at the department of communication technologies and public relations, faculty of journalism[a], and senior researcher at the department of Belarusian literature of the 20th and 21st centuries[b].
duktova.liubou7@gmail.com
https://orcid.org/0009-0003-5401-7932

CC BY NC

Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2025;1:19–24
Journal of the Belarusian State University. Philology. 2025;1:19–24

USE OF CULTURAL CODES WHEN REFLECTING REALITY IN THE NOVEL «THE TRUTH LIVES IN THE MIDDLE» BY U. GNILAMEDAU

L. G. DUKTAVA[a, b]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*
[b]*Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research, National Academy of Sciences of Belarus, 1 Surganava Street, 2 building, Minsk 220072, Belarus*

Abstract. Cultural codes at the implicit level of a literary text represent cultural meanings associated with the values, ideals and behavioural models of a certain community (nation, population of a state). The article examines codes based on images of the borderland (middle) and the ethnic artifact of kuzhel, and notes the role of poeticisation of these images in determining the ideological orientation of U. Gnilamedau's novel «The truth lives in the middle». With the help of images of the middle and kuzhel, the values of family, homeland, native land, choice in a polyphony of opinions, and the search for truth are shown.

Keywords: cultural code; novel; Belarusian literature; national identity.

Уводзіны

Культурны код выступае ключом да разумення ідэйнай скіраванасці мастацкага твора, як семіятычная адзінка ён з'яўляецца носьбітам глыбінных гісторыка-культурных сэнсаў, праз якія праяўляюцца сацыяльныя, эканамічныя, геапалітычныя, культурныя асаблівасці, спецыфіка нацыянальнага светапогляду, мадэлі паводзін прадстаўнікоў пэўнай групы людзей (нацыі, насельніцтва дзяржавы і інш.). Вызначэнне культурных кодаў у літаратуразнаўстве звязана з семіятычным падыходам. Даследчыкі, якія выкарыстоўваюць семіятычную метадалогію пры інтэрпрэтацыі твораў літаратуры, апелююць да паняццяў інтэртэкстуальнасці Ю. Крысцевай, гіпертэксту Т. Нільсана, дыялогу М. Бахціна, структурнай паэтыкі Ю. Лотмана і тым самым падкрэсліваюць неабходнасць выяўлення ўзаемадзеяння паміж моўным узроўнем і культурнай маркіраванасцю ў мастацкім творы.

У айчынным літаратуразнаўстве пытанню семіятычнай метадалогіі прысвечаны работы В. Халіпава [1], Л. Сіньковай [2], І. Саверчанкі [3], І. Часнок [4, с. 81–92]. В. Халіпаў адзначае: «Адной з цэнтральных катэгорый семіётыкі з'яўляецца паняцце кода як сістэмы адпаведнікаў планаў зместу знакаў планам іх выражэння, якая з'яўляецца вядомай для групы людзей (часта ў якасці тоесна сінанімічных "коду" тэрмінаў выкарыстоўваюцца азначэнні "семіётыка" і "знакавая сістэма"). Прачытанне тэксту (і ў вузкім, і ў шырокім сэнсе) немагчыма без далучэння да кодаў, якімі карыстаўся аўтар пры стварэнні твора» [1, с. 9]. Даследчык звяртаецца да механізма функцыянавання ў літаратурным творы культурных кодаў на прасторавым і часавым падузроўнях, пры гэтым не прыводзіць асобнага тлумачэння паняцця культурнага кода. Даследаванню культурных кодаў у літаратуры прысвечаны работы беларускіх і замежных літаратуразнаўцаў Т. Болдыравай[1], М. Жылінай[2], Я. Кулікова[3], Л. Калугінай[4], А. Мельнікавай [5], А. Раманава[5], А. Трубяцковай[6], Г. Халацінска-Вертэляк [6], І. Шаладонава [7], Т. Шамякінай [8] і інш. Мадэляванне мастацкай карціны свету з выкарыстаннем культурных кодаў для аўтара слова адбываецца ў першую чаргу на падсвядомым узроўні, бо з культурнымі кодамі, як адзначае А. Мельнікава, звязаны «глыбінныя сэнсы пэўнай культуры» [5, с. 22]. Даследчыкі звяртаюць увагу на тое, што культурны код выконвае важную ролю ў перадачы сімвалічнай семантыкі.

Мэта даследавання – вызначэнне адметных культурных кодаў у рамане У. Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне» пры адлюстраванні ў эпічным творы каштоўнасных арыенціраў беларускага грамадства, асаблівасцей нацыянальнага характару.

[1]*Болдырева Т. В.* Типология культурных кодов в драматургии Л. Н. Андреева : дис. … канд. филол. наук : 10.01.01. Самара, 2008. 186 с.

[2]*Жилина М. Ю.* Метасюжет судьбы лирического героя в поэзии С. А. Есенина: основные культурно-художественные коды и мотивные комплексы : автореф. дис. … канд. филол. наук : 10.01.01. Омск, 2006. 17 с.

[3]*Куликов Е. А.* Национальные и культурные коды в романах Дэна Симмонса : дис. … канд. филол. наук : 10.01.03. Н. Новгород, 2018. 203 с.

[4]*Калугина Л. В.* Поэзия Владимира Высоцкого и западноевропейская литература Средневековья и Возрождения: взаимодействие дискурсов и культурных кодов : дис. … канд. филол. наук : 10.01.01. Омск, 2014. 153 с.

[5]*Романов А. А.* Культурные коды в лирике Е. Шварц : дис. … канд. филол. наук : 10.01.01. Саратов, 2021. 217 с.

[6]*Трубецкова Е. Г.* Морбуальный код русской литературы XX–XXI вв. : дис. … д-ра филол. наук : 10.01.01. Саратов, 2022. 77 с.

Вынікі і іх абмеркаванне

«Праўда жыве пасярэдзіне» – сёмы раман гепталогіі У. Гніламёдава («Уліс з Прускі» (2006), «Расія» (2007), «Вяртанне» (2008), «Валошкі на мяжы» (2014), «Вайна» (2014), «Пасля вайны» (2021)). Упершыню твор быў надрукаваны ў 2021–2022 гг. у часопісе «Полымя», у 2023 г. выйшла яго асобнае выданне. Па меркаванні Я. Гарадніцкага, раманны цыкл У. Гніламёдава – гэта «своеасаблівая сага, толькі больш набліжанага да нас часу, неспакойнага, зменлівага, напоўненага выпрабаваннямі чалавечага духу XX стагоддзя» [9, с. 121]. Да разгляду спецыфікі гепталогіі У. Гніламёдава звярнуліся беларускія літаратуразнаўцы, акцэнтуючы ўвагу на ідэйна-мастацкім гучанні твораў (Я. Гарадніцкі, З. Драздова, В. Локун, В. Русілка), асаблівасцях паэтыкі, жанру, вобраза героя (Г. Навасельцава, І. Шаладонаў, Ж. Шаладонава, С. Шчэрба) і інш.

Падзеі рамана «Праўда жыве пасярэдзіне» разгортваюцца ў 1950-я гг., так званую адлігу ў палітычнай гісторыі савецкай краіны. Тагачасныя падзеі прыйшліся на перыяд фарміравання асобы беларускага інтэлігента Валодзі Платонава. У папярэдніх шасці раманах, дзе галоўным героем з'яўляецца Лявон Кужаль (дзед Валодзі), сюжэт разгортваецца ў першай палове XX ст. В. Русілка адзначае, што пісьменнік ставіў перад сабой маштабную задачу «стварыць у раманах гісторыю беларускага народа праз гісторыю сваёй сям'і», якая патрабавала адпаведнай формы [10, с. 262].

У гепталогіі расказваецца пра некалькі пакаленняў адной сям'і: Кірыла – дзед Лявона, Міхась – яго бацька, Васіль – пасынак, Уладзімір – сын Васіля. Праўда пра падзеі, сведкамі якіх сталі прадстаўнікі рода Кужалёў, перадаецца з пакалення ў пакаленне, замацоўваючы ў свядомасці нашчадкаў уласны, выпрацаваны атрыманым вопытам пункт гледжання на гістрычныя падзеі і працэсы, і разумеецца прадстаўнікамі сям'і як самая дасканалая крыніца інфармацыі. Дзед перадае ўнуку звесткі, якія атрымаў ад свайго дзеда, – гэта тая праўда, якая захоўваецца ў сям'і і ўспрымаецца як аксіёма (больш падрабязна гэту тэму разглядае І. Шаладонаў). Разам з тым у канве твораў прысутнічае шэраг дакументальных звестак, якія падкрэсліваюць поліфанічны падыход да ацэнкі рознага кшталту падзей і з'яў рэчаіснасці. С. Шчэрба адзначае: «Гістарычныя падзеі ў творах У. Гніламёдава ствараюць пераканаўчы, а часта і дакладнарэалістычны кантэкст, на якім разгортваецца сюжэт сямейнай хронікі Кужалёў. Больш за тое, яны ўяўляюцца "матрыцай", пры дапамозе якой пісьменнік праецыруе свой роздум аб мінулым суайчыннікаў, а таксама выяўляе філасофскія погляды на сучаснасць і будучыню беларуса ў супярэчлівай шматкультурнай цывілізацыйнай прасторы» [11, с. 233]. Пазіцыя аўтара праяўляецца не ў тым, каб даваць ацэнку пэўным падзеям, а ў тым, каб дапамагчы чытачу выпрацаваць сваё ўяўленне аб іх на аснове багатай фактуры, бо, як падкрэсліваецца ў сімвалічнай назве рамана, на скрыжаванні розных поглядаў і меркаванняў нараджаюцца перакананне, уласная пазіцыя, праўда.

Вобраз сярэдзіны ў творы звязаны з пошукам адказаў на складаныя пытанні, калі сутыкаюцца розныя пункты гледжання, называюцца супярэчлівыя факты. Даследчыца Г. Навасельцава піша: «У рамане студэнт – гэта асоба, якая імкнецца да інтэлектуальнага і духоўнага развіцця, вывучае культуру і гісторыю свайго народа, метафарычна кажучы, спасцігае меру агульнабыццёвых рэчаў дзеля таго, каб знайсці праўду. Адцяняе жыццёвыя пошукі галоўнага героя скразны герой раманнага цыкла – вечны вандроўнік Кузёмка, які сцвярджае, што мы, беларусы, народ "памяркоўны, сярэдзінны", таму што "жывём якраз пасярэдзіне – паміж поўднем і поўначчу і паміж захадам і ўсходам. А гэтыя бакі свету не надта хочуць паміж сабой ладзіць". <…> У выніку супастаўленне ведаў, атрыманых падчас з розных крыніц, дазваляе прыйсці да высновы, што праўда выяўляецца ў тым ліку праз параўнанне непадобных пунктаў гледжання, вобразна кажучы, праўда жыве пасярэдзіне» [12, с. 103].

Паняцце сярэдзіны звязана з адсутнасцю крайнасцей, бо фактычна сярэдзіна азначае аднолькавую аддаленасць чаго-небудзь у прасторы ад крайніх кропак. У фокусе рамана «Праўда жыве пасярэдзіне» знаходзіцца перыяд пасляваеннага жыцця савецкай краіны. У творы паказаны настроі, ідэі, якімі жыло грамадства: новы погляд на асобу Сталіна і яго дзеянні (развагі простых людзей, агучванне для студэнтаў і выкладчыкаў рашэння з'езда партыі, дзе развенчваўся культ савецкага лідара), асэнсаванне пераломных момантаў баталій Вялікай Айчыннай вайны (аповеды франтавікоў, сустрэча з пісьменнікам К. Сіманавым) і інш. У канве твора прысутнічае шэраг імёнаў вядомых беларускіх асоб: Пятра Машэрава («23 жніўня. У жніўні 1955-га першым сакратаром Брэсцкага абкома КПБ быў прызначаны Машэраў, які да гэтага года працаваў у мінскім абкоме КПБ» [13, с. 350]), Максіма Танка («З'явіўся Кміта разам з Максімам Танкам. Гэта быў яшчэ зусім малады чалавек, высокі, як і Кміта, стройны, з высокародным абліччам і разумнымі, удумлівымі і адначасова вясёлымі, з іскрынкамі, вачыма. У звычайным гарнітуры, пры гальштуку. Гальштук – модны, з беларускім арнаментам. <…> Аўдыторыя слухала, як заварожаная. Прачытаў славуты свой верш апошняга часу «Ave Maria», які высока ацаніў Кміта)» [13, с. 321–322]. Падкрэсліць гістарычны аспект дапамагаюць згадкі пра дзеячаў беларускага мінулага: Афанасія Філіповіча («Афанасій Філіповіч быў непакорным і непахісным у веры чалавекам, цвёрдым, як крэмень, не хацеў цярпець, але

цярпеў, скардзіўся, ярыўся, бунтаваў. Яго “Дыярыуш” нагадвае “Жыціе”, напісанае пратапопам Авакумам» [13, с. 169]), Тадэвуша Касцюшкі («Цімох Архіпавіч расказаў і пра тое, што каля Косава ў фальварку Марачошчына нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка, вядомы як кіраўнік і герой паўстання 1794 года» [13, с. 653]) і інш. У творы падкрэсліваюцца якасці, якімі валодалі пэўныя персаналіі, тым самым падсвечваюцца асаблівасці нацыянальнага характару, а таксама ідэалы і каштоўнасці, якія прайшлі праз стагоддзі і сталі арыенцірамі для некалькіх пакаленняў жыхароў беларускай зямлі.

Пазбяганне крайнасцей і лаяльнасць да іншага светапогляду, ладу жыцця, паводзін і звычаяў звязаны з такой рысай характару, як талерантнасць. Пошук паразумення ў складаных сітуацыях, аптымальнага рашэння праблем, той самай сярэдзіны, якая можа пагадніць самыя розныя бакі, складае аснову міралюбівага стаўлення беларусаў да людзей і свету ў цэлым, што адлюстравана ў рамане У. Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне».

Акрамя вобраза памежжа (сярэдзіны), мэтазгодна выдзеліць вобраз этнічнага артэфакта кужалю, які выступае ключавым кодам да разумення ідэйнай скіраванасці не толькі рамана «Праўда жыве пасярэдзіне», але і ўсёй гепталогіі пісьменніка. З дапамогай такога скразнога кода паказваецца сутнаснае выражэнне задумы аўтара, ён з’яўляецца своеасаблівым ключом у прачытанні мастацкай логікі пры інтэрпрэтацыі твора. Пад культурным кодам, згодна аднаму з падыходаў, разумеецца сістэма знакаў, сімвалаў, якая характэрна для пэўнай культуры і скіравана на яе ідэнтыфікацыю і выкарыстанне носьбітамі гэтай культуры (М. Эпштэйн, Д. Гудкоў, В. Маслава і інш.). З сімвалам кужалю, пакрывала з мясцовай раслінай культуры льна, у гепталогіі звязаны паняцці роду, роднай зямлі, радзімы. Льняныя ніткі – метафара чалавечых лёсаў, з іх тчэцца палатно беларускай гісторыі, як паказана ў раманным цыкле У. Гніламёдава.

У гепталогіі лексема «кужаль» прысутнічае ў онімным полі, таму мэтазгодна адзначыць сімвалічнасць прозвішча Кужаль (больш падрабязна дадзены аспект разглядае даследчыца Ж. Шаладонава). Кужаль у адным значэнні – гэта палатно з ільняных нітак, з якога шылася традыцыйнае адзенне беларусаў, а таксама вырабы для дома (пасцельная бялізна, посцілка), у іншым значэнні кужаль уяўляе сабой неачэсаны лён – раслінную культуру, якая з’яўляецца адным з сімвалаў Беларусі (выява кветак лёну прысутнічае на дзяржаўным гербе).

Кужаль з’яўляецца ўвасабленнем духоўнага купала, аховы роду (пад палатном з кужалю чалавек сябе адчувае ўтульна). Прадстаўнікі старэйшага пакалення, Лявон і Фёкла Кужалі, паказаны як свайго роду апекуны і захавальнікі нашчадкаў. Пад іх увагай, нібы пад нябачным кужалем-покрывам, знаходзяць выратаванне ў самых складаных жыццёвых сітуацыях як члены сям’і, так і блізкія людзі: яны ратуюць сына Васіля, дапамагаюць партызанам падчас вайны (раман «Вайна»), уладжваюць лёс сёстрам (раманы «Расія», «Вяртанне»), даюць прыстанак вечнаму валацугу Кузёмку, як і іншым людзям. Асаблівая ўвага ў цыкле ўдзяляецца ўнуку Валодзіку, які хоць і не родны па крыві для дзеда Лявона, але выхаваны ў духоўным асяроддзі сям’і. Апека і адчуванне аховы, перададзеныя роду Кужалёў, уздзейнічалі на Валодзю Платонава. Упершыню пра яго згадваецца ў рамане «Валошкі на мяжы»: «Так яны і жылі ў адной хаце – дзве сям’і, як адна. Звычайная вясковая сітуацыя. Гадавалі Валодзіка. <…> Прося, пакарміўшы дзіця, узрадавана паведаміла: “Усміхнуўся ў першы раз!” Узрадаваліся ўсе, асабліва дзед з бабай, якія, мусіць, болей за ўсіх цешыліся і апекаваліся ўнукам» [14, с. 436]. Далей у творах цыкла неаднаразова паказаны сітуацыі, калі Лявон і Фёкла Кужалі станавіліся апекунамі і ахоўнікамі для маленькага Валодзіка ў любых складаных сітуацыях, быццам нябачным кужалем-покрывам захінаючы яго ад небяспекі: «Страхотлівы выпадак адбыўся і з Валодзікам Платонавым. Валодзік – гадунец у бабы і дзеда. <…> У мінулым годзе пастухі з суседняй Выгнанкі гналі свой статак праз Пруску, і адна жывёліна прыціснула яго рагамі да плоту. Стаў слёзна крычаць, спадзеючыся на дапамогу. На крык прыбеглі Лявон з Фёклай, яны ля клуні пілавалі дровы. Адагналі дурніцу, вызвалілі ўнучка» [15, с. 295]; «Валодзік ажно тросся ад перажытага жаху. Выбраўшыся з халоднай купелі ўвесь мокры, у набраклым вадой адзенні, ён агародамі з плачам прыбег дадому. <…> Фёкла напарыла зверабою з ліпавым цветам, падала ўнуку кубак адвару. <…> Давер да бабулі быў у ім непахісны, а любоў – адданая і бязмежная, напоўненая глыбокай верай у яе магчымасці, захапленнем і гонарам за гэтыя магчымасці. Бабуля заўсёды выручыць, дапаможа, знойдзе, як пераадолець любыя цяжкасці» [16, с. 46–47]; «Малы на адыход бацькоў аніяк не рэагаваў. Фёкла паклала яго спаць і прыкрыла посцілкай» [14, с. 552]. Менавіта пра гэты нябачны ахоўніцкі покрыў рода ўзгадвае цыганка Валодзіку падчас варажбы: «Бачу твой лёс, лінію жыцця, выразна бачу. Нялёгкі твой лёс, але нехта аберагаць будзе» [16, с. 7].

Мэтазгодна таксама ўспомніць выбітную сцэну з рамана «Вайна», дзе паказана, як на падсвядомым узроўні для маладога пакалення сям’і трансліруюцца і перадаюцца спрадвечныя каштоўнасці: каханне, вернасць, любоў да працы, роднай зямлі. Увосень Лявон з Фёклай разам з унукам Валодзікам паехалі ў лес, каб набраць апалага лісця для склепа, дзе захоўвалася ўзімку гародніна, бо «памерзне вырыўцо,

калі полап не акрыць, не атуліць лясным кажухом» [15, с. 103]. У лесе посцілка з асенняга лісця на доле нагадвае яркую коўдру, якую апранула зямля перад зімовым сном, утульнасць, лагоднасць і спакой адгукаюцца ў паводзінах і размовах людзей. У гэты час маленькі Валодзік назірае шчырыя адносіны бабулі і дзеда, і, нягледзячы на тое што недзе ідзе вайна, у гэты момант персанажы адчуваюць, што час быццам спыніўся пад так званым восеньскім пакрывалам з апалага лісця і ўсё вяртаецца на кругі свая.

Каляровы дыван з восеньскага лісця нагадвае стракаты ўзор льняной посцілкі з матывам сямейнага радаводу. Раскрываючы схаваныя сэнсы такога вырабу, даследчык М. Кацар адзначае: «Як бачым, тут цэлая жыццёвая паэма пра вечнасць і неўміручасць роду і сям'і. Ці не таму і выжылі беларусы, нягледзячы на войны, смерці і хваробы? Гэты дыван – яшчэ і напамін усім нам: будзем берагчы род і сям'ю – будзем неўміручыя» [17, с. 15]. Кужаль, які сімвалізуе захаванне сям'і, гістарычнай памяці, – гэта своеасаблівы духоўны каўчэг. На першых старонках рамана «Праўда жыве пасярэдзіне» ў словах дзеда Лявона Кужаля, які адпраўляе ўнука ў горад вучыцца, набываць прафесію, адлюстраваны маральныя арыенціры, да якіх, як паказана ў рамане, малодшы Платонаў звяртаецца, набываючы ўласны жыццёвы вопыт: «Першы крок павінен зрабіць сам, а далей хай ужо вядзе лёс. Вучыся, працуй! Нікому не шкодзь! Жыццёвыя цяжкасці будуць, яны яшчэ ніколі не абмінулі. Памылкі, няўдачы, нязручнасці. Гэта дадатковы стымул для чалавека, без гэтага ён ператварыўся б у бервяно. Дружбу заводзіць не спяшайся, спачатку прыгледзься, што за чалавек. Хаця жыццё паказвае, што сяброў не выбіраюць, усё адбываецца само сабой, ды і сяброў шмат не бывае… <…> Нікому не зайздросць, не адчайвайся, не вешай галавы. Вер у сябе. Не лянуйся. Да свайго ўнутранога голасу прыслухоўвайся, рабі, што ён падкажа. Усё добра будзе» [13, с. 4].

У рамане У. Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне» закранаюцца важныя пытанні захавання гістарычнай памяці, асэнсавання сутнасці чалавечага быцця, паказу асаблівасцей нацыянальнага характару.

Заключэнне

У рамане «Праўда жыве пасярэдзіне» паказаны розныя жыццёвыя сітуацыі Валодзі Платонава: студэнцкія гады і першыя працоўныя будні, пасяджэнне, на якім разбіраюцца неахайныя паводзіны члена калектыва, праца на цаліне, канікулы ў вёсцы, спатканні маладых людзей, педагагічная практыка і інш. Код сярэдзіны адсылае чытачоў рамана да такіх уласцівасцей беларускай ментальнасці, як адштурхоўванне ад крайнасцяў і патрэба ў магчымасці рабіць выбар, пошук кропкі, дзе на скрыжаванні розных поглядаў нараджаецца ісціна. У рамане У. Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне» адлюстраваны асаблівасці светасузіральнай пазіцыі розных слаёў грамадства: навучэнцаў і выкладчыкаў, жыхароў вёскі і горада, прадстаўнікоў трох пакаленняў сям'і, насельніцтва розных мясцовасцей, рэспублік і нават кантынентаў. Назапашаны вопыт пашырае кругагляд Валодзі Платонава, жыццёвыя перыпетыі вымушаюць яго задумацца над пытаннямі, якія хвалююць грамадства, і выпрацаваць уласнае стаўленне да розных гістарычных, сацыяльных сітуацый.

З дапамогай кода кужалю, які з'яўляецца скразным сімвалам для гепталогіі У. Гніламёдава, паказана каштоўнасць сям'і, роду, роднай зямлі, выбару ў поліфаніі меркаванняў, пошуку існасці. Льняное палатно сімвалізуе чалавечыя лёсы, якія яднаюцца ў агульную гісторыю народа.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Халипов ВВ. *Семиотическая модель мирового процесса. Часть 1, Структуралистская версия*. Минск: РИВШ; 2014. 142 с.

2. Сінькова ЛД. Актуалізацыя семіятычнай метадалогіі і тэрміна *дыскурс* у беларускім літаратуразнаўстве. *Весці БДПУ. Серыя 1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія.* 2022:148–151.

3. Саверчанка ІВ. *Паэтыка і семіётыка ў публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI–XVII стст.* Мінск: Беларуская навука; 2012. 463 с.

4. Часнок ІЧ. Семіятычная школа. *Метадалогія літаратуразнаўчых даследаванняў*. Мінск: БДУ; 2016. 106 с.

5. Мельнікава АМ. *Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя.* Гомель: Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны; 2016. 214 с.

6. Chałacińska-Wiertelak H. *Культурный код в литературном произведении. Интерпретаця художественных текстов русской литературы XIX и XX веков*. Poznań: Wydawnictwo Naukowe UAM; 2002. 237 с.

7. Шаладонаў ІМ. Сасна, яе сімвалічны код і станаўленне раманнага мыслення І. Навуменкі. У: Манкевіч АА, рэдактар. *Кулуарамі творчай майстэрні Івана Навуменкі*. Мінск: Беларуская навука; 2020. с. 164–184.

8. Шамякіна ТІ. Коды культуры ў паэме Якуба Коласа «Сымон-музыка». У: Рагойша ВП, рэдактар. *Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай. Частка 2*. Мінск: РІВШ; 2010. с. 30–35.

9. Гарадніцкі ЯА. Шлях вучонага і пісьменніка. Творчы партрэт Уладзіміра Гніламёдава. *Маладосць*. 2007;12:117–121.

10. Русілка ВІ. Ідэйна-мастацкія асаблівасці прозы У. Гніламёдава. В: Солодков АП, редактор. *Наука – образованию, производству, экономике. Материалы XVI региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов; 16–17 марта 2011 г.; Витебск, Беларусь. Том 1.* Витебск: Витебский государственный университет имени П. М. Машерова; 2011. с. 262–264.

11. Шчэрба СМ. Паэтыка гістарычнай прозы У. Гніламёдава. У: Мельнікава ЗП, рэдактар. *Беларуская проза XX–XXI стагоддзяў: героі, паэтыка, аксіялогія*. Брэст: Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна; 2022. с. 233–236.
12. Навасельцава ГВ. Станаўленне асобы ў рамане Уладзіміра Гніламёдава «Праўда жыве пасярэдзіне». *Полымя*. 2023;4: 100–104.
13. Гніламёдаў УВ. *Праўда жыве пасярэдзіне.* Мінск: Беларуская навука; 2022. 775 с.
14. Гніламёдаў УВ. *Валошкі на мяжы*. Мінск: Мастацкая літаратура; 2014. 574 с.
15. Гніламёдаў УВ. *Вайна*. Мінск: Беларуская навука; 2014. 628 с.
16. Гніламёдаў УВ. *Пасля вайны*. Мінск: Беларуская навука; 2021. 524 с.
17. Кацар МС. *Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка*. Мінск: БелЭН; 1996. 208 с.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 28.10.2024.
Received by editorial board 28.10.2024.

УДК 821.111(73)

АНТОЛОГИЯ КАК ФОРМА СИСТЕМАТИЗАЦИИ И ПОПУЛЯРИЗАЦИИ АМЕРИКАНСКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ О ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЕ

З. И. ТРЕТЬЯК[1)]

[1)]*Полоцкий государственный университет им. Евфросинии Полоцкой, пер. Стрелецкий, 4, 211415, г. Полоцк, Беларусь*

Аннотация. Рассмотрены антологии «Армагеддон. Мировая война в литературе», «Люди на войне», «Первая мировая война в американской художественной литературе: антология короткой прозы», опубликованные в США за сто лет после окончания Первой мировой войны. Определена их роль в популяризации наследия Т. Бойда, Э. Э. Каммингса, К. Э. Портер, Л. Столлингса, К. Сэндбурга, Дж. Б. Уортона, Б. Шинделя и формировании национального литературного канона, в который вошли произведения Дж. Дос Пассоса, У. Фолкнера, Э. Хемингуэя. Изучены подходы составителей к систематизации стилистически и тематически разнообразного литературного, художественного и документального материала. Обозначена роль читателя, который, анализируя предлагаемые произведения, замечает, что самостоятельные литературно-художественные единицы становятся взаимодополняющими, начинают функционировать как целостность, наделенная высоким суггестивным потенциалом, в котором заметны определенные тематические доминанты, аллюзии, символы.

Ключевые слова: Первая мировая война; американская литература; военная литература; антология; мемориализация; комплементарность; суггестивность; литературный канон.

АНТАЛОГІЯ ЯК ФОРМА СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ АМЕРЫКАНСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПРА ПЕРШУЮ СУСВЕТНУЮ ВАЙНУ

З. І. ТРАЦЦЯК[1*]

[1*]*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай, зав. Стралецкі, 4, 211415, г. Полацк, Беларусь*

Анатацыя. Разгледжаны анталогіі «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры», «Людзі на вайне», «Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы», выдадзеныя ў ЗША за сто гадоў пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Адзначана іх роля ў фарміраванні нацыянальнага літаратурнага канона, куды ўвайшлі творы Дж. Дос Пасаса, У. Фолкнера, Э. Хемінгуэя, і папулярызацыі спадчыны Т. Бойда, Э. Э. Камінгса, К. Э. Портэр, Л. Столінгса, К. Сэндбурга, Дж. Б. Уортана, Б. Шындэля. Даследаваны падыходы ўкладальнікаў да сістэматызацыі стылістычна і тэматычна разнастайнага літаратурна-мастацкага і дакументальнага матэрыялу. Акрэслена роля чытача, які, аналізуючы прапанаваныя творы, заўважае, што самастойныя

Образец цитирования:
Траццяк ЗІ. Анталогія як форма сістэматызацыі і папулярызацыі амерыканскай літаратуры пра Першую сусветную вайну. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:25–30.
EDN: CHOEXG

For citation:
Tratsiak ZI. Anthology as a form of systematisation and popularisation of American literature about the World War I. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2025;1:25–30. Belarusian.
EDN: CHOEXG

Автор:
Зоя Ивановна Третьяк – доктор филологических наук, доцент; профессор кафедры мировой литературы и иностранных языков гуманитарного факультета.

Author:
Zoya I. Tratsiak, doctor of science (philology), docent; professor at the department of world literature and foreign languages, faculty of humanities.
zoya.tretyak@rambler.ru

CC BY NC

літаратурна-мастацкія адзінкі пачынаюць функцыянаваць як камплементарная цэласнасць, надзеленая высокім сугестыўным патэнцыялам, дзе заўважаюцца адмысловыя тэматычныя дамінанты, алюзіі, сімвалы.

Ключавыя словы: Першая сусветная вайна; літаратура ЗША; ваенная літаратура; анталогія; мемарыялізацыя; камплементарнасць; сугестыўнасць; літаратурны канон.

ANTHOLOGY AS A FORM OF SYSTEMATISATION AND POPULARISATION OF AMERICAN LITERATURE ABOUT THE WORLD WAR I

Z. I. TRATSIAK[a]

[a]*Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk, 4 Stralecki Lane, Polack 211415, Belarus*

Abstract. Anthologies «Armageddon. The World War in literature», «Men at war», «World War I in American fiction: an anthology of short stories» published in the USA throughout the century after the end of the World War I are studied. Their role in the formation of the national literary canon (including the works by J. Dos Passos, W. Faulkner, E. Hemingway) and popularisation of T. Boyd's, E. E. Cummings's, K. A. Porter's, L. Stallings's, C. Sandburg's, J. B. Wharton's, B. Schindel's legacy is highlighted. The compilers' approaches to the systematisation of stylistically and thematically diverse literary, artistic and documentary material are studied. The role of the reader is outlined. Analysing the works proposed, the reader notices that independent literary and artistic units begin to function as a complementary unity, endowed with a highly suggestive potential, where special thematic dominants, allusions, symbols are noticed.

Keywords: World War I; American literature; war literature; anthology; memorialisation; complementarity; suggestiveness; literary canon.

Уводзіны

Анталогія твораў пра Першую сусветную вайну – адмысловая форма сістэматызацыі і мемарыялізацыі літаратурна-мастацкай спадчыны, прысвечанай падзеям 1914–1918 гг. Падобнае выданне не толькі дапамагала ў навігацыі па прасторах прозы, паэзіі і драматургіі на ваенную тэматыку, але і паскарала фарміраванне нацыянальнага і сусветнага літаратурнага канонаў, якія з цягам часу трансфармаваліся. Тым не менш у іх захоўвалася памяць пра рэпрэзентатыўныя тэксты, што разам з падручнікамі па гісторыі, а таксама дакументамі і артэфактамі эпохі ўплывалі на ўяўленні пра сусветны канфлікт новых пакаленняў чытачоў. Звышмэта анталогіі – стварэнне сінтэзаванага малюнка вайны, што немагчыма ў межах асобнага твора (нават вялікай апавядальнай формы). Абмежаваны паводле фармальна-змястоўных крытэрыяў, адзін твор не можа ўключыць усе канцэптуальна значныя праявы сусветнага канфлікту, вартыя ўвагі чытача, які знаёміцца з падзеямі 1914–1918 гг. і ваеннай літаратурай з пэўнай часавай дыстанцыі. Канцэпцыя любой анталогіі дастаткова суб'ектыўная, бо выбар тэкстаў, прапанаваных у камплементарным адзінстве, заўсёды залежыць ад задумы ўкладальніка. У анталагічным зборніку паміж яго фрагментамі ўзнікаюць новыя сэнсавыя сувязі, якія не былі гіпатэтычна прадугледжаны аўтарамі асобных твораў.

Матэрыяламі даследавання сталі анталогіі «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры» (1930), «Людзі на вайне» (1942), «Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы» (2014). Гэтыя выданні прапануюць адметны погляд укладальнікаў з ЗША на літаратуру пра Першую сусветную вайну. Адметнасць тут залежыць ад нацыянальна маркіраванай рэцэпцыі падзей 1914–1918 гг., спецыфікі амерыканскага літаратурнага працэсу, глыбіні і яскравасці асабістага вопыту (Ю. Лорке і Э. Хемінгуэй) і персанальных навуковых інтарэсаў (С. Траут, С. Эмерт) укладальнікаў. Згаданыя анталогіі прэзентуюць паказальныя метадалагічныя падыходы да сістэматызацыі тэкстаў на тэму Першай сусветнай вайны: уключэнне падобных твораў у шырокі дыяхронны і сінхронны інтэрнацыянальныя кантэксты («Людзі на вайне»); праца выключна з сінхронным інтэрнацыянальным кантэкстам, спалучэнне мастацкага і дакументальнага складнікаў («Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры»); аналіз сінхроннага нацыянальнага кантэксту («Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы»). Прапанаваныя стратэгіі дазволілі адлюстраваць глабальны ўзброены канфлікт з розных пунктаў гледжання.

Вынікі і іх абмеркаванне

Ва ўводзінах да кожнага з выданняў сцісла фармулюецца мэта іх стварэння. Так, Ю. Лорке адзначаў, што праз дзесяць гадоў пасля заканчэння вайны «людзі пачалі ўжо гаварыць пра Вялікую вайну так, як яны некалі разважалі пра землятрус у Месіне. Вельмі хутка яны пачнуць казаць пра яе ўсё тое, што кажуць пра вайну ў Троі»[1] [1, p. 21]. Ён падкрэсліваў: «Аднавіць у адным томе хаця б нейкі малюнак вялікай гістарычнай падзеі, пакуль яе абрысы не зробяцца невыразнымі ў свядомасці сведкаў, – пра гэта, прынамсі, марыў укладальнік анталогіі» [1, p. 27].

Ва ўступе да анталогіі «Людзі на вайне» Э. Хемінгуэй расказаў пра прынцыпы, пакладзеныя ў аснову кнігі. Выданне выглядала амбіцыйным, бо рэдакцыйны савет імкнуўся хаця б фрагментарна прасачыць гісторыю сусветнай літаратурнай баталістыкі пачынаючы з біблейскіх часоў. Прапанаваныя тэксты падводзілі да думкі пра паўтаральнасць тых элементаў, што складаюць абагульнены, недзе пазачасавы вобраз вайны (існаванне ілюзій навабранца-неафіта наконт пытанняў, якія тычацца баявых дзеянняў, знаёмства з ваеннай будзённасцю, адчуванне жаху, болю, сутыкненне з воляй выпадку, пераасэнсаванне базавых каштоўнасцей, вяртанне да міру). Ва ўступе падкрэсліваецца адрасаванасць выдання тым, хто патэнцыйна можа стаць удзельнікам узброеных канфліктаў у будучыні. Абапіраючыся на асабісты вопыт, Э. Хемінгуэй падкрэслівае, што яго адаптацыя да франтавога і шпітальнага існавання і вяртанне на радзіму прайшлі б менш траўматычна, калі б у свой час ён пазнаёміўся з падобным праектам, які дапамог бы яму хутчэй пазбавіцца ад ілюзій пра ўласную выбітнасць, уласцівых маладому «ганароваму лейтэнанту» [2, p. 12–13]. Паказальна, што ва ўводзінах укладальнік надае шмат увагі літаратуры пра Першую сусветную вайну. Відавочны яго інтарэс да ўласна гістарычнай падзеі і мастацкай літаратуры на дадзеную тэматыку, да стварэння якой Э. Хемінгуэй і сам меў адносіны.

Ва ўводзінах да кнігі «Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы» С. Эмерт і С. Траут разгледзелі жанр апавядання, які пэўны час знаходзіўся ў цені, прыхаваны за раманамі Дж. Дос Пасаса, Э. Э. Камінгса, Э. Коба, Д. Кэнфілд, У. Марча, Л. Столінгса, Д. Трамба, Э. Уортан, У. Фолкнера, Э. Хемінгуэя. У выданні прапанаваны «ўзоры кароткай прозы, прысвечанай Першай сусветнай вайне, супрацьпастаўлены творы высокага мадэрнізму і тыя, што былі змадэляваны паводле ранейшай літаратурнай парадыгмы, пададзены шэдэўры, роўныя творам Ф. С. Фіцджэральда і К. Э. Портэр, і сацыяльна выкрывальныя творы пісьменнікаў больш сціплага таленту… занатаваны бачанне вайны прадстаўнікамі нацыянальнай эліты і апавяданні афраамерыканскіх аўтараў» [3, p. 3]. Такі падыход адпавядае навейшым тэндэнцыям прэзентацыі і вывучэння спадчыны амерыканскіх мастакоў слова, прысвечанай падзеям 1914–1918 гг. Так, Дж. Хэйтак у кнізе «Уводзіны ў амерыканскую ваенную літаратуру» (2018) пастуліравала, што «для амерыканскіх пісьменнікаў значныя мастацкія праблемы звязаны з раскрыццём у творах класавых, расавых і гендарных пытанняў, кожнае з якіх пазначана выбітнай нацыянальнай ідэалогіяй» [4, p. 6].

У першай трэці XX ст. шэраговы чытач са Злучаных Штатаў Амерыкі, зацікаўлены і ўражаны аповедамі сведак падзей 1914–1918 гг., знаёміўся з літаратурай пра Першую сусветную вайну дзякуючы яшчэ аднаму выданню – анталогіі «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры». Рэцэнзенты заўважылі істотныя адметнасці выдання. Так, Л. Дэвіс падкрэсліў, што дадзеная кніга – «спроба пераадолець абмежаванні, уласцівыя асобным творам пра вайну» [5, p. 640]. Менавіта фармат анталогіі дазволіў спалучыць пад адной вокладкай сапраўдны калейдаскоп з уражанняў, успамінаў, аналітычных разваг мастакоў слова, якія падаваліся разам з дакументамі часоў вайны. П. Байтэнюэс, робячы грунтоўны агляд прац, прысвечаных навуковаму асэнсаванню амерыканскай літаратуры пра Першую сусветную вайну, спыняе ўвагу на гэтым выданні, якое характарызуецца ім як найбольш вычарпальны збор мастацкіх твораў на дадзеную тэматыку [6, p. 83].

Укладальнік анталогіі Ю. Лорке прапанаваў інтэрнацыянальны збор прозы і асобных паэтычных твораў, што падкрэсліла татальны характар вайны 1914–1918 гг. Паводле ўкладальніка, яго праца над праектам звязана з падарожжам у Еўропу летам 1929 г., падчас якога ён сустрэўся з С. Цвэйгам. У размове аўстрыйскі пісьменнік адзначыў, што надышоў час стварэння міжнароднай анталогіі, матэрыял якой абіраўся б выключна з улікам мастацкіх вартасцей твора [1, p. 22], а не з улікам прыярытэтнасці грамадзянскай (у прыватнасці, пацыфісцкай) пазіцыі іх аўтара. На радзіме Ю. Лорке пераканаўся, што падыход, якім карысталіся пры складанні анталогій у 1920–1927 гг. (стомленая любымі згадкамі пра сусветны ўзброены канфлікт, «публіка не сцерпіць ніводнай кнігі пра вайну» [1, p. 15]), састарэў. З 1928 г. чытач, які, здавалася, захлынуўся паводкай з кніг, прысвечаных Першай сусветнай вайне, ужо быў гатовы да фармату анталогіі. Розныя па форме і змесце, сродках рэалізацыі аўтарскай задумы, аднак у многім аналагічныя, шматлікія творы на гэтую тэму патрабавалі тэрміновай сістэматызацыі. На думку ўкладальніка анталогіі

[1]Тут і далей пераклад наш. – *З. Т.*

«Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры», новы ўсплёск цікавасці да ваеннай літаратуры на мяжы 1920–30-х гг. тлумачыўся некалькімі фактарамі: за дзесяць гадоў успрыманне вайны змянілася, бо яна пачала набываць усе ўласцівасці гістарычнага факта (часткова ці цалкам пазбаўленага той эмацыянальнай афарбоўкі, якая абумоўлена вопытам чытача), што, у сваю чаргу, дазволіла ўспрымаць перыпетыі сюжэта як мастацкі вымысел, не пазбаўлены пэўнай займальнасці.

Анталогія складалася з дзесяці частак: «Узнялася бура», «Пад агнём», «Водгулле буры», «Вайна ў гарах, на моры, у пустыні», «У паветры і пад зямлёй», «Недзе там!», «Адценні», «Заканчэнне», «Рэвалюцыя», «Наступствы». Падобны падзел на часткі, на нашу думку, звязаны з жаданнем расказаць адмысловую «гісторыю» сусветнай вайны, якая складаецца з некалькіх «раздзелаў» і падпарадкуецца ўнутранай логіцы баявых дзеянняў: ад эскалацыі канфлікту ва ўсіх праявах да яго заканчэння і мірнага ўпарадкавання свету. Непасрэдна амерыканскі складнік выдання прадстаўлены фрагментамі з твораў Дж. Дос Пасаса «Тры салдаты», Э. Э. Камінгса «Вялізная камера», Э. Уортан «Францыя змагаецца», У. Фолкнера «Салдацкая ўзнагарода», Э. Хемінгуэя «Бывай, зброя!». У кнігу ўвайшлі тэксты, якія пазней пачалі ўспрымацца як «забытыя творы пра забытую вайну»: верш К. Сэндбурга «Трава», урыўкі з раманаў Т. Бойда «Праз жыта», Л. Столінгса «Плюмз», Б. Шындэля «Залатое паломніцтва» і Дж. Б. Уортана «Атрад».

Структура выдання дазваляе сцвярджаць, што ўжо ў 1930-я гг. перспектыўным бачыўся шматаспектны агляд падзей вайны, які стаў дамінаваць на мяжы XX–XXI стст., калі навукоўцы, пераадольваючы інерцыю разгляду літаратуры, прысвечанай падзеям 1914–1918 гг., выключна як прозы страчанага пакалення і брытанскай акопнай паэзіі, звярнуліся да забытых твораў пра вайну на моры і ў паветры, вопыт разведкі, жыццё ваеннапалонных, быццё хворых і параненых, працу пахавальных каманд, сапёраў і медыцынскага персаналу ў шпіталі, побыт дэзерціраў ці цывільных у тыле [7, p. 14].

У анталогію «Людзі на вайне» ўвайшлі 82 тэксты, размеркаваныя па раздзелах «Вайна – частка грамадскіх зносін», «Вайна – зона небяспекі, таму мужнасць – найпершая якасць воіна», «Вайна – сфера фізічных высілкаў і пакут», «Вайна – вобласць няпэўнасці», «Вайна – гаспадарства шанцу», «Вайна – зона рознагалосся», «Вайна патрабуе рашучасці, трываласці і непахіснасці», «Чалавек змагаецца на вайне».

Уласна амерыканская літаратурная баталістыка прэзентавана ўрыўкамі з твораў пра два знакавыя для ЗША ўзброеныя канфлікты: Грамадзянскую вайну (проза С. Крэйна і А. Бірса, спадчына Л. Льюіса) і Першую сусветную вайну (вытрымкі з кніг Д. Паркер, Л. Столінгса, У. Фолкнера, Э. Хемінгуэя). У перавыданні 1955 г. Э. Хемінгуэй падкрэсліў адкрытую структуру кнігі і выказаў меркаванне, што яна пашырыцца за кошт твораў пра ўзброеныя канфлікты, якія апанавалі свет пасля 1945 г. Рэдакцыйны савет звяртаў увагу на тое, што структура анталогіі грунтуецца на назіраннях К. фон Клаўзевіца [2, p. 13], выкладзеных у працы «Пра вайну».

Ва ўступным слове Э. Хемінгуэй падкрэсліў шэраг момантаў, што тычацца ваеннай літаратуры. Вартым абмеркавання аспектам было абазначана пытанне праўдзівасці мастацкага выказвання пра ўзброены канфлікт. Плён рэфлексіі і фантазіі не выключаўся, бо дзякуючы адмысловаму таленту і назіральнасці творцы ён мог пераўзыходзіць праўдзівасць рэчаіснасці (згадаем гісторыю стварэння раманаў С. Крэйна «Пунсовы знак за мужнасць» і Э. Хемінгуэя «Бывай, зброя!»). Здатнасць да рэфлексіі і актыўнасць уяўлення (мадэляванне гіпатэтычных сітуацый), на думку ўкладальніка, кардынальна адрознівалі літаратара з ваенным вопытам ад добрага вайскоўца. Апошні, паводле амерыканскага празаіка, павінен быў забыць прагнастычныя функцыі ўласнай свядомасці, таму што гэта паралізавала волю да дзеяння, адцягвала ўвагу ад змен у аператыўнай сітуацыі на полі бою. Э. Хемінгуэй лічыў, што якасці здольнага мастака слова і годнага воіна рэдка спалучаліся ў адной асобе [2, p. 24].

Вяртаючыся да пытання праўдзівасці твора пра вайну, Э. Хемінгуэй спыніўся на такім плёне фантазіі, што меў на сабе адбітак свядомага скажэння рэчаіснасці. Падобны «кампраміс з мастакоўскім сумленнем» атаясамліваўся са здрадай мастацтву, дэфармацыяй творчых здольнасцей, і «апраўдацца» было немагчыма ні прапагандысцкімі мэтамі, ні прагай атрымаць станоўчыя рэцэнзіі крытыкаў ці ўхвалу пэўных грамадскіх арганізацый і палітычных дзеячаў [2, p. 14]. Разам з тым надзвычайны натуралізм, адмысловая эстэтызацыя болю, празмерная цікавасць да зменена вайной стану свядомасці адцягвала ўвагу і пісьменніка, і чытача ад не менш значных праблем, звязаных з татальным руйнаваннем. Адзначаючы мастацкія вартасці рамана А. Барбюса «Агонь», Э. Хемінгуэй параўнаў манеру барбюсаўскага аповеду з крыкам. Экзальтаваныя пачуцці, зразумелыя сучасніку падзей, выглядалі недарэчна тэатральнымі ўжо праз некалькі гадоў пасля заканчэння баявых дзеянняў. Нягледзячы на гэтую акалічнасць, падобныя кнігі – помнікі эпохі застаюцца актуальнымі ў сваім спецыфічным фармаце.

Галоўныя інтэнцыі ўкладальнікаў анталогій «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры» і «Людзі на вайне» былі звязаны з недахопам належнай увагі да ваеннай літаратуры ЗША, якая заставалася аддаленай ад заходнееўрапейскага кантэксту; патрабавалася пацвярджэнне яе нацыянальнай адметнасці,

што скасоўвала стэрэатып пра другаснасць літаратурнай баталістыкі пісьменнікаў са Злучаных Штатаў Амерыкі ў параўнанні з творамі мастакоў слова з іншых краін. Па меркаванні ўкладальнікаў анталогіі «Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы» ідэя самабытнасці нацыянальнага прыгожага пісьменства, прысвечанага падзеям 1914–1918 гг., патрабуе папулярызацыі ў шырокіх грамадскіх колах. Высновы С. Эмерта і С. Траута грунтуюцца на багатым назапашаным матэрыяле, што дазваляе разважаць пра тэматычную гетэрагеннасць амерыканскай малой прозы пра Першую сусветную вайну, якая ўступае ў палілог з раманамі пра ўзброенае супрацьстаянне ў Еўропе. Падобная гетэрагеннасць тлумачылася тым, што «калектыўная памяць пра вялікую вайну раздробнена, яна падзелена на асобныя версіі мінулага, якія не супадаюць, бо кожная з іх падтрымліваецца ўласнымі апантанымі прыхільнікамі» [3, p. 11].

У выданні прапанавана 26 апавяданняў, якія паказваюць вайну з розых ракурсаў: разглядаюць яе з пункту гледжання прапаганды (Д. Кэнфілд «Адпускнік»), апісваюць падзеі праз прызму расчаравання ў гвалце, характэрным перш за ўсё для цывільных (Э. С. Хантынг «Грэшная душа», Дж. Л. Стаут «Прах», М. Бордэн «Роза»), увасабляюць баявыя дзеянні, перажытыя загартаваным вайскоўцам (Л. Столінгс «Вялікі парад»), распавядаюць пра перараджэнне персанажа ў неўротыка (У. Марч «У тыл», Х. Ален «Прага крыві»). Значнае месца ў анталогіі займаюць творы афраамерыканцаў (К. Колінз «Як Уолтэр вярнуў сабе годнасць», К. Маккэй «Вяртанне салдата») і інш.

Цікава, што ў анталогію малой прозы не ўключана культавае апавяданне Э. Хемінгуэя «Салдацкі дом». Такая сітуацыя тлумачыцца не толькі тонкасцямі захавання аўтарскага права, але і агульнай канцэпцыяй твора. На думку С. Траута, апавяданне было прысвечана не столькі падзеям вайны, колькі праблемам памяці («не асабістым, амаль цалкам пазітыўным, успамінам Крэбса пра вайну, а адсутнасці калектыўнай памяці ў гараджан» [3, p. 24]), якія не мелі магчымасці адэкватна інтэрпрэтаваць перажытае ветэранамі ў Еўропе.

Праблема вылучэння рэпрэзентатыўных тэкстаў пра падзеі 1914–1918 гг. у значнай ступені тычылася анталогій «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры» і «Людзі на вайне». Ю. Лорке і Э. Хемінгуэй бачылі вытокі амерыканскай літаратурнай баталістыкі XX ст. у рамане С. Крэйна «Пунсовы знак за мужнасць». Укладальнікі адзначалі ролю рамана А. Барбюса «Агонь» для сусветнай мастацкай прозы, якая імкнулася асэнсаваць першую ў гісторыі татальную вайну. Так, Ю. Лорке сцвярджаў, што твор французскага пісьменніка «быў першай значнай для любой літаратуры кнігай, якая засведчыла, наколькі рэальныя сцэны ваенных жахаў могуць стаць агіднымі для чалавека з багатай фантазіяй» [1, p. 6]. Укладальнік анталогіі «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры» палічыў вартымі чытацкай увагі ўрыўкі з твораў Э. Э. Камінгса «Вялізная камера» і Дж. Дос Пасаса «Тры салдаты», апошні з якіх названы «працай абсалютнай шчырасці, выбітнай прывабнасці і глыбіні» [1, p. 15]. Для Э. Хемінгуэя раман – прыклад няўдалага твора, прысвечанага Першай сусветнай вайне, бо «дыялог гучыць фальшыва, а малюнак сапраўднага бою абсалютна не пераконвае» [2, p. 15]. Па гэтай прычыне ніводны ўрывак са знакамітай кнігі не трапіў у анталогію «Людзі на вайне». Сітуацыю не выратавала нават тое, што Дж. Дос Пасас пісаў раман у тым ліку і пад уплывам спадчыны А. Барбюса, ухваленай Э. Хемінгуэем. Укладальнікі анталогіі «Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы» засяродзіліся на апавяданнях, большасць з якіх ніколі не ўваходзілі ў літаратурны канон. Тым не менш гэтыя творы дазвалялі меркаваць пра тэматычную разнастайнасць прозы ЗША пра падзеі 1914–1918 гг.

Заключэнне

Вывучэнне анталогій твораў, прысвечаных Першай сусветнай вайне, дазваляе сцвердзіць важную ролю падобных выданняў у мемарыялізацыі падзей 1914–1918 гг., сістэматызацыі шматмернага і складанага для інтэрпрэтацыі феномена ваеннай літаратуры. Анталогіі «Армагедон. Сусветная вайна ў літаратуры», «Людзі на вайне», «Першая сусветная вайна ў амерыканскай мастацкай літаратуры: анталогія малой прозы», укладзеныя ў ЗША, успрымаюцца як нацыянальнамаркіраваная форма камунікацыі з чытачом. Гэты чытач, з аднаго боку, рэканструюе інтэнцыі кожнага з мастакоў слова, творы якога змешчаны ў выданні, і суадносіць іх з мэтамі ўкладальнікаў, якія з усёй масы матэрыялу выбіралі пэўныя літаратурныя помнікі эпохі, а з другога – карэкціруе ўласныя ўяўленні пра вайну і народжаную ёю паэтычную і празаічную спадчыну. Вынікам працы рэдакцыйнага савета стала адмысловае камплементарнае адзінства: застаючыся самакаштоўнай фармальна-змястоўнай адзінкай, кожны твор уступае ў палілог з іншымі, і такім чынам нараджаецца сістэма аналогій і супадзенняў, тэматычных дамінант, вылучэнне і інтэрпрэтацыя якіх залежаць ад спрактыкаванасці чытача, яго здольнасці да аналітычнага ўспрымання вялікага масіву інфармацыі. Разгледжаныя ў артыкуле анталогіі дапамаглі пераадолець спрошчаныя погляды на літаратуру пра Першую сусветную вайну, бо, паводле звыклых стэрэатыпаў, найбольш аўтарытэтнымі творамі на гэтую тэму прызнаваліся брытанская акопная паэзія і проза прадстаўнікоў страчанага пакалення.

Укладальнікі падкрэслілі тэматычную разнастайнасць твораў, значна шырэйшую за банальныя ўяўленні пра літаратуру, прысвечаную Першай сусветнай вайне. Уласна амерыканская славеснасць разгледжана ў рэчышчы пераемнасці пэўных традыцый, якія аб'ядналі прозу пра Грамадзянскую вайну ў ЗША і падзеі 1914–1918 гг. (урыўкі з твораў Т. Бойда, Э. Э. Камінгса, Дж. Дос Пасаса, Л. Столінгса, К. Сэндбурга, Э. Уортан, Дж. Б. Уортана, У. Фолкнера, Э. Хемінгуэя, Б. Шындэля).

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Lohrke E, editor. *Armageddon. The World War in literature*. New York: Jonathan Cape and Harrison Smith; 1930. 820 p.
2. Hemingway E, editor. *Men at war*. New York: Bramhall House; 1955. 1072 p.
3. Emmert S, Trout S, editors. *World War I in American fiction: an anthology of short stories*. Kent: Kent University Press; 2014. 408 p.
4. Haytock J. *The routledge introduction to American war literature*. New York: Routledge; 2018. 196 p.
5. Davis L. Armageddon – twelve years after. *Virginia Quarterly Review*. 1930;6(4):630–640.
6. Buitenhuis P. American literature of the Great War. *American Studies International*. 1985;23(2):79–86.
7. Hopkins Ch. Beyond fiction? The examples of winged warfare (1918). In: Quinn PT, Trout S, editors. *The literature of the Great War reconsidered. Beyond modern memory*. London: Palgrave Publishers; 2001. p. 9–23.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 11.12.2024.
Received by editorial board 11.12.2024.

УДК 821.161.3

ВООБРАЖЕНИЕ ОБЩЕГО: БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК И БЕЛОРУССКОЕ СОДЕРЖАНИЕ ПРОИЗВЕДЕНИЙ АЛЕКСАНДРА ЕЛЬСКОГО

П. Г. КОШМАН[1)]

[1)]*Мозырский государственный педагогический университет им. И. П. Шамякина, ул. Студенческая, 28, 247760, г. Мозырь, Беларусь*

Аннотация. Изучаются процессы формирования и выражения идей белорусского сообщества в отечественной литературной традиции. На материале произведений А. Ельского показывается роль белорусского языка в консолидации творческих сил Беларуси и поиске ими общей ценностной основы с белорусским народом. В ситуациях художественной коммуникации автора с читателем на белорусском языке прослеживается преемственность задач по репрезентации белорусской самобытности и конструированию белорусской идентичности. Раскрывается личный творческий вклад А. Ельского в наполнение литературы конца XIX – начала XX в. представлением об исторической субъектности белорусского народа.

Ключевые слова: Александр Ельский; белорусская литература XIX в.; белорусский язык; родина; белорусское сообщество; идентичность.

Благодарность. Работа выполнена в рамках государственной программы научных исследований «Общество и гуманитарная безопасность белорусского государства на 2021–2025 гг.» (подпрограмма «Национальный нарратив в белорусской литературе XIX–XX вв.: специфика конструирования и художественной репрезентации»).

УЯЎЛЕННЕ СУПОЛЬНАГА: БЕЛАРУСКАЯ МОВА І БЕЛАРУСКІ ЗМЕСТ ТВОРАЎ АЛЯКСАНДРА ЕЛЬСКАГА

П. Р. КОШМАН[1*]

[1*]*Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна, вул. Студэнцкая, 28, 247760, г. Мазыр, Беларусь*

Анатацыя. Вывучаецца працэс фарміравання і выражэння ідэй беларускай супольнасці ў айчыннай літаратурнай традыцыі. На матэрыяле твораў А. Ельскага паказваецца роля беларускай мовы ў кансалідацыі творчых сіл Беларусі і пошуку імі агульнай каштоўнаснай асновы з беларускім народам. У сітуацыях мастацкай камунікацыі аўтара з чытачом на беларускай мове прасочваецца пераемнасць задач па рэпрэзентацыі беларускай адметнасці і канструяванні беларускай ідэнтычнасці. Раскрываецца асабісты творчы ўнёсак А. Ельскага ў напаўненне літаратуры канца XIX – пачатку XX ст. уяўленнем аб гістарычнай суб'ектнасці беларускага народа.

Ключавыя словы: Аляксандр Ельскі; беларуская літаратура XIX ст.; беларуская мова; радзіма; беларуская супольнасць; ідэнтычнасць.

Образец цитирования:
Кошман ПР. Уяўленне супольнага: беларуская мова і беларускі змест твораў Аляксандра Ельскага. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:31–37.
EDN: CXOBUP

For citation:
Koshman PR. Imagination of the general: the Belarusian language and the Belarusian content of Alexander Yelsky's works. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2025;1:31–37. Belarusian.
EDN: CXOBUP

Автор:
Павел Григорьевич Кошман – кандидат филологических наук, доцент; декан факультета повышения квалификации и переподготовки кадров.

Author:
Pavel R. Koshman, PhD (philology), docent; dean of the faculty of advanced training and retraining.
pauloko7h@gmail.com

CC BY NC

Падзяка. Работа выканана ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы на 2021–2025 гг.» (падпраграма «Нацыянальны наратыў у беларускай літаратуры XIX – XX стст.: спецыфіка канструявання і мастацкай рэпрэзентацыі»).

IMAGINATION OF THE GENERAL: THE BELARUSIAN LANGUAGE AND THE BELARUSIAN CONTENT OF ALEXANDER YELSKY'S WORKS

P. R. KOSHMAN[a]

[a]*Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamyakin, 28 Studenckaja Street, Mazyr 247760, Belarus*

Abstract. The article is devoted to the process of formation and expression of the ideas of the Belarusian community in the national literary tradition. Based on the material of A. Yelsky's works, the role of the Belarusian language in consolidating the creative forces of Belarus and their search for a common value basis with the Belarusian people are indicated. In the artistic situations of the author's Belarusian-language communication with the reader, the continuity of tasks for the representation of the Belarusian peculiarity and the construction of the Belarusian identity is traced. The personal creative contribution of A. Yelsky to filling the literature of the late 19th and early 20th centuries with the idea of the historical subjectivity of the Belarusian people is revealed.

Keywords: Alexander Yelsky; Belarusian literature of the 19th century; Belarusian language; Motherland; Belarusian community; identity.

Acknowledgements. The article was prepared in the framework of the state scientific research programme «Society and humanitarian security of the Belarusian state for 2021–2025» (subprogramme «National narrative in Belarusian literature of the 19th – 20th centuries: the specifics of construction and artistic representation»).

Уводзіны

Кожны выпадак звароту да беларускай мовы на этапе станаўлення новай беларускай літаратуры ў XIX – пачатку XX ст. уяўляе важкую падставу для ўзнікнення ўвагі з боку айчыннага літаратуразнаўства. На фоне прызнаных тагачасных літаратурных практык польскай і рускай моў стварэнне мастацкіх тэкстаў на беларускай мове выглядае дастаткова неардынарным творчым учынкам. Тым не менш бачыцца, што менавіта гэта акалічнасць выяўляе стаўленне тагачаснага грамадства да сваёй літаратуры – таго мастацтва, якое і па змесце, і па форме адпавядала патрэбам і магчымасцям беларусаў. Па гэтай прычыне асабліва цікавымі для даследчыкаў з'яўляюцца сітуацыі, калі беларускае слова не проста прыходзіла ў літаратуру ў выніку творчага азарэння, а выступала ўсвядомленым элементам аўтарскага замыслу. За выкарыстаннем мовы ў якасці творчага інструмента стаіць комплекс прычын, абставін і дасягненняў, якія, з аднаго боку, характарызуюць уклад пісьменніка ў нацыянальную літаратуру, з другога – даюць магчымасць убачыць асаблівасці яе развіцця.

У дадзеным даследаванні пытанне ўзаемасувязі паміж выбарам беларускай мовы, асабістымі аўтарскімі пошукамі і агульнымі тэндэнцыямі развіцця літаратуры прапануецца разглядзець на прыкладзе творчасці Аляксандра Ельскага. У гісторыі беларускага мастацкага слова ён адыграў важную ролю ў абуджэнні літаратурнага жыцця Беларусі на схіле XIX ст. Уладальнік маёнтка Замосце Ігуменскага павета Мінскай губерні, дзякуючы сваім камунікатыўным здольнасцям, змог наладзіць творчыя сувязі з многімі вядомымі дзеячамі культуры і навукі свайго часу. Шчырая зацікаўленасць у развіцці роднага краю спрыяла прызнанню яго кампетэнтным знаўцам «беларускіх спраў» [1, с. 473]. А. Ельскі актыўна супрацоўнічаў са стваральнікамі энцыклапедый, публікаваўся ў папулярных перыядычных выданнях, а яго беларускамоўныя творы, размешчаныя ў тым ліку ў афіцыйных газетах, па шырыні ахопленай чытацкай аўдыторыі відавочна не мелі ў той час канкурэнтаў. Між тым у разнастайнасці і маштабнасці творчай спадчыны пісьменніка даследчыкі У. Казбярук [2] і М. Хаўстовіч [3] прасочваюць адпаведнасць працэсам фарміравання беларускай нацыі. Мэта дадзенага артыкула – вызначыць нацыятворчы патэнцыял беларускамоўных твораў А. Ельскага, выявіць іх праблемна-вобразны змест, арыентаваны на актуалізацыю супольных каштоўнасцей беларускага народа.

Вынікі і іх абмеркаванне

З вядомай сёння беларускамоўнай спадчыны пісьменніка храналагічна першым з'яўляецца верш «Вінцуку Дуніну-Марцінкевічу». Прыпіска да твора ўказвае месца і час яго напісання («Замосце, 27 чэрвеня 1872 г.»), а назва адсылае да асобы першага ў гісторыі новай літаратуры прафесійнага беларускамоўнага аўтара. Верш важны тым, што фіксуе зацікаўленасць творчых сіл у паслядоўнай працы на ніве беларускай літаратуры і заадно дэманструе функцыю кансалідацыі, уласцівую беларускай мове.

Выбіраючы беларускую мову для звароту да В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Ельскі не быў арыгінальным, а выкарыстоўваў прыняты сярод мясцовых літаратараў спосаб выказвання падтрымкі таварышаў па пяру і прыязнасці да іх. Аб такім беларускамоўным этыкеце выдатна сведчыць унікальны дакумент літаратурнага жыцця 1850–60-х гг. – альбом А. Вярыгі-Дарэўскага. Пажаданні (сярод іх «у довад прыязні» [4, с. 258]) і словы самога В. Дуніна-Марцінкевіча, запісаныя на яго старонках па-беларуску, выяўляюць сітуацыю шырокага ўжывання народнай гаворкі ў зносінах паміж пісьменнікамі, дзе яна, відавочна, служыла паказчыкам прыналежнасці да *сваёй* агульнай радзімы. У святле такой камунікатыўнай практыкі мова спрыяла наладжванню творчых кантактаў. А. Ельскі на момант напісання верша «Вінцуку Дуніну-Марцінкевічу», як вынікае са зместу твора, не быў асабіста знаёмы з адрасатам твора, але, звяртаючыся да яго на мове іх роднага краю, меў падставы быць прызнаным *сваім*. Аўтар верша якраз на гэтым і настойваў, ён прадстаўляў сябе ментальна блізкай класіку асобай, быў гатовы дапамагчы ў яго справе: *Мяне не знаеш, а я – хват, // Такі жа дужы, як ты, брат… // Як хочаш магу я пісаць, // Усякі мыслі выкладаць* [1, с. 366].

У сяброўскім звароце пачынальніка да аўтарытэтнага аўтара раскрываецца разуменне тагачаснай беларускай літаратурай свайго прызначэння. У матывацыйнай частцы верша, адрасаванай В. Дуніну-Марцінкевічу, акрэсліваецца чытацкая аўдыторыя паэта-класіка і яе чаканні: *Ды пацеш жа мужычкоў, // Ім трэба песенькі сваёй* [1, с. 366]. Сэнс гэтых радкоў выходзіў за межы пажаданняў толькі аўтару «Гапона» і выяўляў галоўную задачу беларускай літратуры, якая заключалася ў тым, каб дбаць аб народзе, несці яму веды, асвету, спрыяць яго духоўнаму развіццю. З гэтай мэтай А. Ельскі і прапаноўваў гуртаваць сілы. Яго герой, выяўляючы напачатку толькі асабістае меркаванне, на пэўным адрэзку прамовы пачынае гаварыць ад імя творцаў. Верш стварае вобраз творчай супольнасці, гаворыць пра агульную працу песняроў у будучым часе: *А ціхамір'е як настане, // Тады зайграем мы, маспане!..* [1, с. 366]. У творы аўтар дзеліцца планамі: *Злых рэзаць будзем языком // А добрым слаць паклон і чэсць* [1, с. 366]. Намінальна гэтыя пажаданні звернуты да В. Дуніна-Марцінкевіча, але паказваюць найперш запыт самога А. Ельскага на ідэнтыфікацыю сябе як прадстаўніка беларускай літаратуры. Паводле верша, прыналежнасць да гэтай кагорты была важным складнікам самаўсведамлення аўтара і патрабавала ад яго засяроджанасці на навакольнай мясцовасці, яе людзях і культуры, заахвочвала да іх творчага ўзнаўлення на беларускай мове. Не будзе перабольшваннем аднясенне гэтых характарыстык у цэлым да пісьменнікаў XIX ст., якія прыхільна ставіліся да беларускага слова і імкнуліся падзяліцца гэтым стаўленнем як са сваім сацыяльным асяродкам, так і з беларускімі сялянамі.

Асабіста А. Ельскі магчымасці беларускага слова ў паэтычным асэнсаванні вобраза радзімы праверыў, працуючы над перакладам паэмы «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча. Пацвярджаючы прыхільнасць да сваёй аўдыторыі, перакладчык суправаджаў беларускамоўнае выданне твора прысвячэннем: «Працу гэту ахвяруе тлумач ад шчырага сэрца на пажытак братняму беларускаму народу…» [1, с. 388]. Да яго аўтар звяртаўся далей у прадмове «Слоўца ад тлумача», дзе сярод іншага ацэньваў вартасці беларускай мовы менавіта як творчага інструмента. Аўтар згадваў даўнія традыцыі яе выкарыстання, фактычна прыраўніваў да іншых моў, на якія ўжо была перакладзена паэма А. Міцкевіча, і ўрэшце рэзюмаваў: «Ваш старадаўны беларускі язык, мусіць, варт чагось, калі можна на яго склад пераглумачыць найцальнейшыя паэтычныя творы вялікіх пісацялей» [1, с. 388].

Прыведзеная характарыстыка вылучае ў мове важныя для перакладчыка і даследчыка якасці, якія адлюстроўвалі каштоўнасны зрэз мясцовай творчай супольнасці, але не былі прыняты беларускімі сялянамі. Чакаць ад іх імгненнай і масавай рэакцыі на ўсхваленне беларускай мовы было б неапраўдана наіўна. Але словы А. Ельскага гучалі не ўпустую. Яны мелі доўгатэрміновае дзеянне, назапашвалі эфект прысутнасці беларускай мовы ў грамадскай думцы ў цэлым, спрыялі пазітыўнаму стаўленню да культуры беларусаў. У прадмове А. Ельскага паўставала асоба апавядальніка, які не атаясамлівае сябе з беларускасцю, але апякуецца над ёю. Звяртаючыся да беларусаў, перакладчык гаварыў не пра «наш», а пра «ваш старадаўны беларускі язык» і пазіцыянаваў сябе прадстаўніком польскамоўнай мясцовай традыцыі. Гэты факт варта разглядаць з улікам той камунікатыўнай сітуацыі, якую ствараў пераклад. Яго аўтар фактычна выконваў ролю пасрэдніка ў міжнародных культурных стасунках і бачыў сваю місію ў тым, каб зрабіць знакаміты паэтычны твор здабыткам братняга народа. Такія ўмовы не прадугледжвалі супадзення ідэнтычнасці перакладчыка і чытача, пры гэтым размежаванне паміж імі не было

абсалютным. Пераклад паэмы А. Міцкевіча адрасаваўся чытачам, якія належалі да іншай моўнай традыцыі і мелі іншы сацыяльны стан, але жылі з аўтарам і перакладчыкам у адным краі. Радзіма пераважвала адрозненні, выступала агульнай каштоўнасцю, а абраны для перакладу паэтычны тэкст служыў мастацкім увасабленнем гэтай ідэі. Прадстаўляючы беларускамоўным чытачам паэму «Пан Тадэвуш», А. Ельскі рабіў акцэнт на адзінстве, падкрэсліваў, што ў творы «жыве ўся быліна дарагога нам і Вам краю» [1, с. 389].

Слова «ваш» у прадмове «Слоўца ад тлумача» ўжывалася перакладчыкам не для супрацьпастаўлення сябе і іншых, а для таго, каб данесці да адрасата, да братняга беларускага народа, думку, што гэта мова менавіта яго і што яна ўяўляе вялікі духоўны скарб. Зрэшты, калі ўзнікала неабходнасць, то А. Ельскі глядзеў на прыналежнасць беларускай мовы шырока, паказваў яе агульным набыткам сваёй радзімы і ўсіх яе жыхароў. Так, на старонках польскамоўнай газеты «Kraj», разважаючы пра стан народных гаворак у іншых славянскіх краінах, ён пазіцыянаваў сябе жыхаром Літоўскай Русі і зазначаў: «І наша беларуская мова, ці, як хочацца іншым, крывічанска-дрыгавічанска-драўлянская мова народа, можа спаборнічаць за лепшае» [5, с. 9]. У цэлым А. Ельскі ўздымаў пытанне выкарыстання беларускай мовы ў касцёльных набажэнствах. Для абгрунтавання важнасці гэтага пытання аўтар маляваў карціну краю, у якім, за выключэннем касцёла, беларуская мова карыстаецца надзвычай шырокай падтрымкай: «Беларуская гаворка мілая была заўжды вуху і сэрцу ўсіх слаёў тутэйшага грамадства так доўга, што нават вельмі моцна заразіла мову тутэйшых палякаў. Дапоўнім, што, шануючы патрыярхальную мову нашага люду, заўжды яе, а не іншую ўжываем у стасунках з народам. Праваслаўнае духавенства ў нас на споведзі і ў стасунках з народам ужывае амаль толькі правінцыяльную мову, г. зн. беларускую. Дапоўнім, што нават урад у Мінскай губ. 1863 г. у дыялекце, набліжаным да народнага, рабіў адозвы да сялян з мэтай дакладнага ўплыву на думкі» [5, с. 10].

Пільная ўвага А. Ельскага да беларускай мовы тлумачыцца яе рэпрэзентатыўнымі магчымасцямі для ўзнаўлення вобліку радзімы. Словы беларуса, як і ў цэлым адзнакі народнай культуры, неслі ў яго аповедзе функцыянальную нагрузку па выяўленні ўнікальнасці роднага краю. Разам з тым сфера выкарыстання беларускай мовы пераўзыходзіла задачу рэпрэзентацыі каштоўнасцей культурнага артэфакта. Пісьменнік бачыў у мове беларусаў дзейсны сродак развіцця духоўных традыцый народа і заклікаў іншых дапамагаць гэтай справе: «Калі народ любіць і ўшаноўвае песняй сваё гняздо, гэта ўжо адно добра аб ім сведчыць; у такім выпадку, хто можа, няхай памагае яму палюбіць і захаваць для ўласнай славы і шчасця айчынную мову, якая з’яўляецца яго сапраўдным скарбам, без якога не быў бы ён тым, чым ёсць, і не спяваў бы так чуллівa і слаўна, як спявае пра родны край» [1, с. 320].

Большая частка беларускамоўнай спадчыны А. Ельскага звернута непасрэдна да селяніна. Аўтару было важна гаварыць з ім літаральна на адной мове, каб быць пачутым і зразумелым у сваіх перажываннях. Гаспадар маёнтка Замосце разлічваў на тое, што роднае слова зробіць беларуса больш успрымальным да настаўленняў. А. Ельскі прыклаў шмат намаганняў, каб выдаць у брашурах вершаванае апавяданне «Сынок» (1895), а потым пад адной вокладкай апавяданні «Слова аб праклятай гарэлцы» і «Аб жыцці і смерці п’яніцы» (1900). У гэтых напісаных па-беларуску творах асуджалася парушэнне традыцыйнай маралі, выкрывалася п’янства. Такі дыдактычны змест і даступнае афармленне былі павінны спрыяць росту духоўнасці і пашырэнню асветы сярод сялян. Аўтарскі замысел прадугледжваў для іх немудрагелісты, засяроджаны на павучанні сюжэт без прэтэнзій на тое, каб быць узорам высокага мастацтва. Тым не менш згаданыя творы на сваім узроўні выконвалі задачы па ўмацаванні пазіцыі беларускай літаратуры. Маючы танны кошт і, як відаць, вялікі наклад, дыдактычныя брашуры А. Ельскага былі разлічаны на значную колькасць чытачоў, фактам свайго існавання сцвярджалі звычайнасць сітуацыі, калі творы пішуцца па-беларуску.

Праз абмеркаванне такіх вечных праблем, як п’янства, гультайства, сацыяльная неўладкаванасць і адсутнасць асветы, размова пісьменніка з братнім беларускім народам непазбежна прыходзіла да надзённага пытання пра лёс Бацькаўшчыны. Клопат аб яе сённяшнім і заўтрашнім дні паўставаў важным аргументам у аўтарскім непрыманні грамадскіх заган і класавай варожасці, прымушаў пісьменніка востра рэагаваць на падзеі, у якіх ён бачыў негатыўныя наступствы для роднай зямлі. Так, адзін з найбольш патрыятычных тэкстаў А. Ельскага – празаічная гутарка «Выбіраймася ўпрочкі! Скарэй у Томск!» (1895) – быў створаны з нагоды масавай эміграцыі беларускіх сялян у Сібір. Да іх пісьменнік звяртаўся на беларускай мове, каб засцерагчы ад неабдуманых учынкаў. Твор даваў рэзка адмоўную ацэнку ідэі пошуку лепшай долі ў чужых краях, вучыў не верыць у «казку аб кісельных берагах, аб дармовым, гатовым скарбе за тысячу вёрст» [1, с. 379] і расказваў пра далёкую Томскую губерню, дзе перасяленцаў чакае выпрабаванне суровым кліматам і дзікай прыродай. Аўтар заклікаў беларусаў быць разважлівымі і ўлічыць усе недахопы жыцця ў чужым краі, але галоўная яго аргументацыя супраць пераезду зыходзіла з каштоўнаснага ўспрымання радзімы.

У свой час А. Ельскі ў артыкуле «Беларусь», змешчаным у выданні «Wielka encyklopedia powszechna ilustrowana», вызначаў адно з ключавых правіл існавання тутэйшага краю: беларускі народ «заўсёды сцеражэ бацькоўскі двор і неахвотна аддаляецца ад яго больш як на некалькі міль…» [1, с. 22]. Спасылаючыся на досвед жыцця, праверaны продкамі, аўтар у новай сітуацыі ўжо для самога народа шукаў вобразы, якія змогуць перасцерагчы суайчыннікаў ад непрадуманых дзеянняў. Гутарка «Выбіраймася ўпрочкі! Скарэй у Томск!» была звернута да сумлення тых, хто збіраўся пакінуць «зямельку, нашу маці», нагадвала ім, што «святая бацькоўская ніўка» ніколі не дасць свайму гаспадару стаць жабраком. Прыведзеныя метанімічныя абазначэнні радзімы выяўляюць прыклады адаптацыі яе вобраза пад светапогляд вясковага чалавека. Уласцівае селяніну экзістэнцыяльнае ўспрыманне зямелькі і ніўкі пашыралася на стаўленне да свайго свету ў цэлым, а іх персаніфікаванае атаясамліванне з вобразамі маці і бацькі замацоўвала думку аб прадвызначанай залежнасці чалавека ад месца нараджэння. У гэтых натуральных спрадвечных сувязях аўтар шукаў аснову для прызнання беларускімі сялянамі той супольнай радзімы, якая выходзіла за межы іх прыватнага існавання. Яго гутарка пафасна прамаўляла: «Якое ж гэта вялікае, святое слова: родны край!» [6, с. 86], а пасля павучала: «Да трэба толькі зразумець яго і з чэсцю, глыбока хаваць у сэрцы!» [6, с. 86].

Уяўленне агульнай радзімы, паводле канструктывісцкай тэорыі нацыі, з'яўляецца неабходнай умовай для фарміравання пачуцця нацыянальнага адзінства. Спадчына А. Ельскага адлюстроўвае таксама і іншыя прыметы ўключанасці ў працэс нацыянальнага будаўніцтва. Гутарка «Выбіраймася ўпрочкі. Скарэй у Томск!» замацоўвала вобраз калектыўнага «мы» ў часавым вымярэнні: паказвала ідэальным яго даўняе мінулае, тлумачыла праблемы сучаснага дня падзеннем маралі, адыходам ад традыцый і давала канкрэтныя парады на будучыню. Апавядальнік вызначаў залішняе захапленне чужым і недаацэнку свайго як галоўную пагрозу для існавання супольнасці. У ходзе разважанняў дыяпазон такога супрацьпастаўлення пашыраўся на многія праявы духоўнай і матэрыяльнай культуры, уключаў песні, танцы, адзенне, але вышэйшы ўзровень небяспекі аўтар аб'яўляў, калі размова заходзіла пра перасяленне. Такая перамена месцажыхарства непазбежна вяла да страты сувязі са сваімі каранямі, сваёй супольнасцю і адназначна трактавалася як парушэнне фундаментальных законаў народнага жыцця. А. Ельскі настойваў, што патрэбна старацца ў працы і асвеце тут, «а ўжо дасць Бог добры сута з зямелькі роднай, каторую, мусіць, Ён прызначыў вам Сам, на варстат працы вячыстай, калі вы ў ней параджаліся і рахуецеся яе сынамі» [6, с. 98].

На думку А. Ельскага, радзіма адносілася да катэгорыі вышэйшых каштоўнасцей беларускага народа літаральна з Божай ласкі. І прыведзеная інтэрпрэтацыя роднай зямлі як падарунка ад Творцы, і неаднаразовае спалучэнне слова «радзіма» з эпітэтам «святая» дэманструюць сакралізацыю яе вобраза. Падобныя характарыстыкі даваліся і беларускай мове, але ў сітуацыі ўспрымання радзімы наратар падкрэсліваў сілу яе абсалютнага прыцяжэння. Аўтар нагадваў, «што гэта ўсё ад Бога, каб былі на свеце людзі старшыя і малодшыя, гаспадары і маладцы, манархі і падданыя, – і што для ўсіх іх ёсць родны край» [1, с. 377]. Гутарка расказвала пра прыналежнасць да адной зямлі, агульнай спадчыны і імкнулася замацаваць адчуванне еднасці мастацкімі сродкамі. Характэрная для тэксту высокая частотнасць ужывання слоў «наш» і «родны» стварала дадатковыя ўмовы для прызнання чытачом сваёй асабістай далучанасці да тутэйшага краю. Паказальна, што гісторыя публікацый твора выяўляе тэндэнцыю да ўзмацнення гэтага эфекту. Аповед для беларусаў, якія «задумалі гуртам перабірацца ў Томскую губерню», вытрымаў за адзін 1886 г. тры выданні. Спачатку гутарка выйшла ў Пецярбургу, затым у Віцебску пад назвай «Нашы перасяленцы» з'явілася ў газеце «Витебские губернские ведомости» і ўрэшце была выдадзена ў мясцовай друкарні асобнай кнігай. Звесткі пра ўдзел А. Ельскага ў падрыхтоўцы віцебскага выдання адсутнічаюць [7, с. 109], але можна лічыць, што гэты зварот да твора адпавядаў планам аўтара па пашырэнні выказаных ім думак. Больш за тое, у выдадзеным у Віцебску тэксце, які меў некаторыя адрозненні ад першакрыніцы, ідэя агульнай радзімы падаецца нават крыху больш разгорнута. Так, калі першае выданне гаварыла пра шкоду ад перасялення, якая будзе нанесена «цэламу краю» [6, с. 87], і колькасць насельніцтва «ў нашым заходнім краі» [6, с. 92], то ў віцебскай рэдакцыі адпаведныя фрагменты былі ўдакладнены («цэламу роднаму краю» [1, с. 377]) і перайначаны («у нашай Беларусі» [1, с. 382]). Таксама заўважым, што ў дадзеным даследаванні часам перавага аддаецца цытатам з гутаркі «Нашы перасяленцы» па прычыне большага змястоўнага вылучэння ў ёй вобраза радзімы.

Патрыятычны змест і легальныя ўмовы распаўсюджання даюць даследчыкам падставы бачыць у гутарцы «Выбіраймася ўпрочкі! Скарэй у Томск!» «надзвычай важны мастацка-публіцыстычны твор, які сваёй ідэйна-эстэтычнай "праграмай" выконваў нацыятворчую функцыю, абуджаў нацыянальную свядомасць» [6, с. 110]. Важна, што ў спадчыне пісьменніка заяўлены нацыянальны кірунак меў развіццё. Наступны твор А. Ельскага «Гутарка аб тым, якая мае быць "Зямля і воля" сельскаму народу» (1906), надрукаваны на беларускай мове лацінскім шрыфтам з указаннем у назве нязменнага адрасата, расказвае пра неабходнасць узаемаразумення, а таксама задае арыенцір на стварэнне грамадзянскай нацыі:

Niachaj zhoda budzia z wami,
Żywicia mużyki z panami,
Saŭsimi u krai, dyk i z żydami,
Kryŭdy nia czyńcia nikomu,
Bo usie my miaszkancy adnaho domu! [6, с. 164].

Які агульны дом браўся пад увагу ў творы, можна меркаваць па падзагалоўку «Praŭdziwy obrazok, żyŭcom zniaty z ciapieraszniaho żyćcia wioski na Biełaj Rusi, daŭniaj Krywiczyźnia». Адмыслова абазначаныя ў ім акалічнасці месца і часу дзеяння працавалі на тое, каб гутарка беспамылкова знайшла сваіх чытачоў. Тапонімы, як і мова, указвалі на прызначэнне тэксту для беларусаў, дакладней для тых сялян, якія на пачатку XX ст. рыхтаваліся ўсвядоміць сваё агульнае імя і разам з тым станавіліся сведкамі і ўдзельнікамі наймацнейшага грамадскага супрацьстаяння – класавага канфлікту.

А. Ельскі збірае герояў гутаркі ў вясковай хаце для таго, каб расказаць, якім шляхам варта ісці сельскаму народу ў сітуацыі грамадскага ўзрушэння. Паводле сюжэта, пропаведзь святара аб стваральнай працы, грамадскіх інтарэсах і згодзе знаходзіць шчыры водгук у сэрцах сялян, нават галоўны бунтар пад уражаннем ад яе адразу прызнае свае памылкі. Расказаная гісторыя, нягледзячы на заяўленае сведчанне аб яе праўдзівасці, вырашала супярэчнасці паміж героямі настолькі хутка і проста, што наўрад ці магла быць паўторана з той жа эфектыўнасцю ў рэальных жыццёвых абставінах. Але аўтар, відавочна, не разлічваў на прамое перайманне ўчынкаў сваіх герояў. Створаная сцэна канфлікту і яго мірнага вырашэння выкарыстоўвалася ім як мастацкая ўмоўнасць для выказвання сваёй неабыякавай грамадзянскай пазіцыі.

Аўтарская прапанова па дээскалацыі супярэчнасцей у соцыуме малюе надзвычай важны для ідэі беларускай супольнасці вобраз краю. У яго мастацкай рэпрэзентацыі прысутнічае ўжо знаёмы па папярэдніх творах прыём сакралізацыі: пра радзіму і яе каштоўнасць пісьменнік даручае распавядаць менавіта святару. Але ў цэлым тэма супольнай радзімы ў творы «Гутарка аб тым, якая мае быць “Зямля і воля” сельскаму народу» выходзіць на новы ўзровень асэнсавання. Калі раней А. Ельскі засяроджваў увагу на традыцыях, неразрыўнай сувязі беларуса са «святой бацькоўскай ніўкай», то ў новых грамадскіх абставінах пачатку XX ст. ён ставіць пытанне ўжо пра супольную будучыню роднай зямлі. Прамаўляючы да сялянскага народу пра неабходнасць пабудовы грамадскага ладу, пры якім галоўнымі каштоўнасцямі будуць закон, свабода і справядлівасць, пісьменнік выступаў не з абстрактнымі тэзісамі, а са своеасаблівай праграмай уладкавання менавіта сваёй радзімы:

Wiedajem szto kraj biaz łàdu,
Patrebny lepszyja zakòny
I haspadarstwu dać treba nieku radu,
Kab każny byŭ zadawolony,
Kab uczyŭsia, sam zashocza jak,
Kab wieryć moh pa swajej woli,
Kab pan wialmoźny i prastak
Bazpeczny byli u swojej doli;
Kaby ziamla każnamu prystupna
Stałasia warstatam trùdu,
I mnoha jej była da kupna,
Usiamu Ajczyzny ludu… [6, с. 161].

У гутарцы А. Ельскага вобраз агульнай айчыны толькі маляваўся, яе межы яшчэ не былі вызначаны на картах. Пісьменнік гаварыў пра радзіму, каштоўнасць і гістарычную неабходнасць якой яшчэ патрабавалася прыняць і зразумець. Наступныя падзеі пачатку XX ст. дадуць чытачам твораў А. Ельскага, братняму беларускаму народу, нямала падстаў, каб ужо асабіста пераканацца ў слушнасці аўтарскай думкі аб нязменнай каштоўнасці роднай зямлі.

Заключэнне

З пазіцый сённяшняга дня добра відаць, што А. Ельскі, карыстаючыся беларускай мовай для вырашэння творчых задач, задаваў тутэйшаму літаратурнаму руху моцны імпульс развіцця. Яго творчая спадчына выяўляе этапы мэтанакіраванага і паслядоўнага асваення беларускай мовы як вызначальнай прыметы культуры беларускага краю і выключнага па сваёй даступнасці сродку зносін з беларускім народам. Творы пісьменніка наглядна прадэманстравалі нацыятворчы патэнцыял мастацтва беларускага слова, забяспечылі на памежжы XIX–XX стст. пераход яго канцэптуальнага прызначэння ад рэпрэзентацыі беларускай адметнасці да канструявання беларускай ідэнтычнасці.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Ельскі А. *Выбранае*. Мазоўка Н, Казбярук У, укладальнікі; Мазоўка Н, Казбярук У, Кісялёў Г, перакладчыкі. Мінск: Беларускі кнігазбор; 2004. 496 с.

2. Казбярук УМ. Аляксандр Ельскі. У: Мархель У, Чамярыцкі В, рэдактары. *Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў. Том 2, Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX стагоддзя.* Мінск: Беларуская навука; 2010. с. 444–462.

3. Хаўстовіч М. Аляксандар Ельскі і беларускае адраджэнне ў другой палове XIX ст. *Acta Albaruthenica*. 2017;17:23–37.

4. Барысенка В, Мальдзіс А. рэдактары. *Пачынальнікі: з гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст.* Мінск: Беларуская навука; 2003, 549 с.

5. Jelski A. Korespondencye «Kraju». *Kraj.* 1883;50:9–10.

6. Гаранін С, рэдактар. *Літаратура другой паловы XIX стагоддзя. Том 5, частка 2.* Мінск: Мастацкая літаратура; 2013. 269 с.

7. Хаўстовіч М. *Даследаванні і матэрыялы: літаратура Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзяў. Том 3.* Варшава: Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego; 2017. 360 с.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 17.12.2024.
Received by editorial board 17.12.2024.

Языкознание

Мовазнаўства

Linguistics

УДК 811.161.3

ГЛАГОЛЬНАЯ ДИСТРИБУТИВНАЯ МОДЕЛЬ КАК ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЙ ИНСТРУМЕНТ ИСТОРИЧЕСКОГО СИНТАКСИСА

С. А. ВАЖНИК[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Аннотация. Обосновывается целесообразность применения контрастивного подхода при проведении исследований в области исторического синтаксиса, заключающегося в сопоставлении двух срезов белорусского литературного языка: синтаксических моделей простого предложения начала XX в. и соотносимых с ними структур начала XXI в. Выявляются различия в архаических синтаксических моделях, синтаксическая специфика простого предложения в белорусском литературном языке начала XX в. В качестве инструмента анализа выделенного выше фрагмента синтаксических систем рассматривается глагольная дистрибутивная модель, которая в данном исследовании выполняет роль третьего компонента сопоставления. Описываются теоретические и методологические основы рассмотрения глагольной дистрибутивной модели. Подробно изучается структура глагольной дистрибутивной модели, которая включает логико-семантический (пропозиционный), категориально-семантический (селективный), формально-грамматический и лексический уровни. Выстраивается контрастивная типология синтаксических моделей, где выделены тождественные, эквивалентные и неэквивалентные структуры.

Ключевые слова: контрастивная лингвистика; дистрибутивный анализ; валентность глагольного предиката; дистрибуция; глагольная дистрибутивная модель; контрастивная типология синтаксических моделей; синтаксические архаизмы.

Образец цитирования:
Важнік СА. Дзеяслоўная дыстрыбуцыйная мадэль як тэарэтыка-метадалагічны інструмент гістарычнага сінтаксісу. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:38–49.
EDN: BWTOVX

For citation:
Vazhnik SA. Verbal distributional model as a theoretical and methodological tool of historical syntax. *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2025;1:38–49. Belarusian.
EDN: BWTOVX

Автор:
Сергей Александрович Важник – кандидат филологических наук, доцент; профессор кафедры белорусского языкознания, декан филологического факультета.

Author:
Syarhei A. Vazhnik, PhD (philology), docent; professor at the department of Belarusian linguistics, dean of the faculty of philology.
vazhnik@bsu.by
https://orcid.org/0009-0000-1679-0746

ДЗЕЯСЛОЎНАЯ ДЫСТРЫБУЦЫЙНАЯ МАДЭЛЬ ЯК ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫ ІНСТРУМЕНТ ГІСТАРЫЧНАГА СІНТАКСІСУ

С. А. ВАЖНІК[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Анатацыя. Абгрунтоўваецца прыдатнасць кантрастыўнага падыходу пры правядзенні даследаванняў у галіне гістарычнага сінтаксісу, які заключаецца ў супастаўленні двух зрэзаў беларускай літаратурнай мовы: сінтаксічных мадэлей простага сказа пачатку XX ст. і суадносных структур пачатку XXI ст. Выяўляюцца адрозненні ў архаічных сінтаксічных мадэлях, сінтаксічная спецыфіка простага сказа ў беларускай літаратурнай мове пачатку XX ст. У якасці інструмента аналізу вызначанага вышэй фрагмента сінтаксічных сістэм разглядаецца дзеяслоўная дыстрыбуцыйная мадэль, якая ў дадзеным даследаванні выконвае ролю трэцяга кампанента супастаўлення. Апісваюцца тэарэтыка-метадалагічныя асновы разгляду дзеяслоўнай дыстрыбуцыйнай мадэлі. Падрабязна вывучаецца структура дзеяслоўнай дыстрыбуцыйнай мадэлі, што ўключае логіка-семантычны (прапазіцыйны), катэгарыяльна-семантычны (селекцыйны), фармальна-граматычны і лексічны ўзроўні. Складаецца кантрастыўная тыпалогія сінтаксічных мадэлей, дзе вылучаны тоесныя, эквівалентныя і неэквівалентныя структуры.

Ключавыя словы: кантрастыўная лінгвістыка; дыстрыбуцыйны аналіз; валентнасць дзеяслоўнага прэдыката; дыстрыбуцыя; дзеяслоўная дыстрыбуцыйная мадэль; кантрастыўная тыпалогія сінтаксічных мадэлей; сінтаксічныя архаізмы.

VERBAL DISTRIBUTIONAL MODEL AS A THEORETICAL AND METHODOLOGICAL TOOL OF HISTORICAL SYNTAX

S. A. VAZHNIK[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Abstract. The publication substantiates the expediency of using the contrastive approach when conducting research in the field of historical syntax: when comparing two sections of the Belarusian literary language – syntactic models of a simple sentence of the early 20th century and the structures of the early 21st century that are related to them. Comparison of syntactic facts of the Belarusian language in a hundred-year perspective is carried out by means of contrastive distributional analysis in order to identify differences in archaic syntactic models, identify syntactic specifics in the archaic version of a simple sentence of the Belarusian literary language of the early 20th century compared to the modern version. As a tool suitable for describing the above-identified fragment of syntactic systems, we propose to consider the verbal distributional model, which in this paper plays the role of the third component of comparison. The theoretical and methodological foundations of the verbal distributional model are described. The structure of the verbal distributional model is described in detail, which includes logical-semantic (propositional), categorical-semantic (selective), formal-grammatical and lexical levels. A contrastive typology of syntactic models is constructed, in which we distinguish identical, equivalent and nonequivalent structures.

Keywords: contrastive linguistics; distributional analysis; valence of the verbal predicate; distribution; verbal distributional model; contrastive typology of syntactic models; syntactic archaisms.

Уводзіны

У сучасным мовазнаўстве кантрастыўны падыход прадугледжвае выяўленне адрозненняў (кантрастаў) у працэсе супастаўлення розных моў. Такое даследаванне праведзена намі на матэрыяле беларускай і польскай моў [1]. У дадзенай публікацыі мы прапануем выявіць сінтаксічную спецыфіку простага сказа ў межах адной мовы, супастаўляючы моўны зрэз беларускай літаратурнай мовы пачатку XX ст. (мікрадыяхранія) і моўны зрэз пачатку XXI ст. (сінхранія). У сувязі з гэтай акалічнасцю ўводзім паняцце ўнутрымоўнага супастаўлення.

Дасягнуць пастаўленую вышэй мэту нам дапаможа дзеяслоўная дыстрыбуцыйная мадэль (ДДМ) – наўмысна збудаваная тэарэтычная мадэль, дзякуючы якой мы можам супастаўляць дыстрыбуцыю тых

ці іншых архаічных і сучасных дзеяслоўных прэдыкатаў. ДДМ распрацавана ў рэчышчы вербацэнтрычнай канцэпцыі сказа (А. А. Пацябня, Я. Лёсік, Л. Тэнер, У. Чэйф, Ч. Філмар, З. Салёні) з улікам дасягненняў семантычнага сінтаксісу (Ц. П. Ломцеў, А. Я. Міхневіч, В. У. Мартынаў, Г. Хэльбіг, С. Кароляк, Б. Ю. Норман) і функцыянальнай граматыкі (М. У. Усеваладава, Г. А. Золатава, К. Паляньскі, П. П. Шуба, М. І. Канюшкевіч, А. К. Кіклевіч).

Апісваючы валентнасныя патэнцыі і дыстрыбуцыю дзеясловаў, мы выходзім на сінтаксічны ўзровень: дыстрыбуцыйная формула (ДФ) таго ці іншага дзеяслова – гэта, па сутнасці, сінтаксічная мадэль (СМ) простага сказа з тым ці іншым вяршынным прэдыкатам.

Сінтаксічная спецыфіка кожнай мовы выяўляецца толькі праз «паслядоўнае вызначэнне кантрастаў і адрозненняў свайго і чужога» [2, с. 41]. Такі катэгарычны падыход, арыентаваны перш за ўсё на выяўленне сінтаксічных адрозненняў у глыбіннай і паверхневай структурах простага сказа ў беларускай мове пачатку XX ст., прымаецца і аўтарам дадзенага даследавання.

Матэрыялы і метады даследавання

Кваліфікацыя дзеяслова ў якасці цэнтральнага элемента (простага) сказа (прынцып вербацэнтрызму) з'яўляецца асноўным метадалагічным палажэннем дастаткова вялікай колькасці даследаванняў, праведзеных у славістыцы за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў. Ёсць такія работы і ў беларускім мовазнаўстве. Да іх адносяцца працы В. У. Мартынава, А. Я. Міхневіча, С. М. Прохаравай, Л. М. Чумак, Б. Ю. Нормана і інш. Прынята лічыць, што ад валентнасных уласцівасцей дзеяслова залежыць сінтаксічная перспектыва сказа. Просты сказ, такім чынам, інтэрпрэтуецца як рэалізацыя семантыка-сінтаксічных асаблівасцей дзеяслоўнага прэдыката (як рэалізацыя прэдыкатна-актантнай структуры, дзе колькасць і якасць актантных пераменных абумоўлены адпаведным прэдыкатам).

Такі падыход дае падставы лічыць дзеяслоўны прэдыкат і яго сінтаксічнае акружэнне суадносным па сваім аб'ёме з такімі паняццямі, як мінімальная структура сказа (У. Р. Гак, І. Ф. Андэрш), мінімальны сказ (С. Кароляк, Р. Гжэгарчыкова) або арыентаваная фраза (Ю. Д. Апрэсян). У семантычнай структуры дзеяслова фактычна «запраграмавана» прапазіцыйная структура сказа, што дазваляе выйсці дзеяслову за тэарэтычныя межы словазлучэння [3, с. 369; 4, с. 178]. Са сказанага вынікае, што непасрэдным аб'ектам даследавання ў працы выступае не проста дзеяслоў, а структура простага сказа, арганізаваная пэўным дзеяслоўным прэдыкатам.

Ідэя аб тым, што моўныя адзінкі могуць быць вызначаны непасрэдна праз іх акружэнне, гэта значыць праз іх адносіны да іншых адзінак таго ж парадку, не з'яўляецца новай. Яе пачалі актыўна распрацоўваць з канца 1930-х гг. у адной з найбольш вядомых і ўплывовых школ амерыканскага структуралізму – школ амерыканскай дыстрыбуцыйнай лінгвістыкі (Б. Блок, Е. Найда, З. Харыс, Ч. Хокет і інш.).

Асноўныя эксперыментальныя прыёмы дыстрыбуцыйнай лінгвістыкі, што ўзніклі для «дэшыфроўкі» моўных фактаў індзейскіх моў, сталі шырока выкарыстоўвацца і ў славянскім мовазнаўстве. Так, адну з першых сістэмных спроб аналізу значэнняў дзеясловаў на аснове іх сінтаксічных уласцівасцей зрабіў у пачатку 1960-х гг. Ю. Д. Апрэсян [5–9]. Яго працы, а таксама працы іншых прадстаўнікоў маскоўскай семантычнай школы (І. А. Мяльчук, А. К. Жалкоўскі, Л. М. Іарданская і інш.) былі знакавымі не толькі ў парадыгме савецкага мовазнаўства. Яны моцна паўплывалі на развіццё нацыянальных семантычных і сінтаксічных школ у розных славянскіх краінах.

Сінтаксічная ўласцівасць моўнай адзінкі ўступаць у пастаянныя сінтаксічныя сувязі (спалучаюцца) не з усімі (любымі) адзінкамі, а толькі з некаторымі з іх, што адносяцца да таго ж узроўню і з'яўляюцца абмежаванымі пэўнымі семантычнымі ці фармальнымі класамі, называецца ў лінгвістычнай навуцы селекцыяй [10, с. 53–68, 107–127; 11]. Паралельна ўжываецца і больш шырокі тэрмін – дыстрыбуцыя (сукупнасць усіх акружэнняў (кантэкстаў), у якіх можа выступаць пэўная моўная адзінка (фанема, марфема, слова), што мае вельмі абмежаваную здольнасць спалучацца з іншымі адзінкамі таго ж узроўню) [12, s. 123; 13, с. 50]. Пры гэтым заўважым, што словы з рознымі селектыўнымі абмежаваннямі адрозніваюцца сваёй дыстрыбуцыяй і належаць да розных дыстрыбуцыйных класаў.

Дыстрыбуцыйныя рысы той ці іншай моўнай адзінкі выяўляюцца на семантыка-сінтаксічным і фармальна-сінтаксічным узроўнях. Такі падзел абумоўлены адным з асноўных метадалагічных прынцыпаў апісання моўных адзінак – прынцыпам бінарнай структуралізацыі моўных элементаў, у адпаведнасці з якім гэтыя адзінкі маюць двухбаковы характар і таму павінны аналізавацца як у плане зместу, так і ў плане выражэння.

Аднак у ранейшых апісаннях сінтаксісу беларускай мовы, «фармальных» па сваёй сутнасці, семантычныя ўласцівасці моўных адзінак часта не ўлічваліся. Сучасныя сінтаксічныя даследаванні маюць семантычную аснову. Гэтым жа падыходам карыстаемся і мы, праводзячы дыстрыбуцыйны аналіз у напрамку ад глыбінных структур да паверхневых.

Кантрастыўная лінгвістыка, пра якую пачалі пісаць у англамоўнай літаратуры як пра асобы лінгвістычны напрамак яшчэ ў 1960-я гг., у цяперашні час уяўляе сабой самастойную мовазнаўчую дысцыпліну са сваімі мэтамі, задачамі, аб'ектам і метадамі даследавання. Яна ўзнікла на стыку структурнай тыпалогіі моў і лінгвадыдактыкі і першапачаткова мела практычнае прызначэнне. Вынікі кантрастыўнага аналізу выкарыстоўваліся пераважна для аптымізацыі працэсу навучання замежным (народнасным) мовам або для ажыццяўлення рэлевантнага перакладу з адной мовы на другую. З цягам часу ўласна прыкладныя праблемы кантрастыўнай лінгвістыкі атрымалі належнае тэарэтычнае асэнсаванне. Перадусім гаворка ідзе пра паняцце мовы-пасрэдніцы, што з'яўляецца ключавой праблемай для сучаснай кантрастыўнай граматыкі (гл. працы В. Касэкі-Тошэвай, З. Грэня, Д. Рытэль-Куц, М. Карыткоўскай і інш.).

Вынікі і іх абмеркаванне

Спецыфіка апісання дыстрыбуцыі дзеяслоўнага прэдыката. Гаворачы пра дыстрыбуцыю дзеяслоўнага прэдыката, некарэктным, відаць, будзе вылучэнне толькі фармальнага акружэння гэтай адзінкі. Дыстрыбуцыя дзеяслоўнага прэдыката павінна апісвацца шматмерна, што абумоўлена яго статусам у структуры простага сказа: дзеяслоў як прэдыкат мае логіка-семантычнае акружэнне, дзеяслоў як семантычная адзінка – акружэнне, абумоўленае прыналежнасцю актантаў да адпаведных катэгарыяльна-семантычных класаў, дзеяслоў як марфалагічная адзінка – фармальна-граматычнае акружэнне, дзеяслоў як лексічная адзінка – лексічнае акружэнне. Такім чынам, рэлевантнымі для вывучэння дыстрыбуцыйных уласцівасцей дзеяслова з'яўляюцца логіка-семантычны (прапазіцыйны), катэгарыяльна-семантычны, фармальна-граматычны і лексічны ўзроўні.

Кожны дыстрыбуцыйны ўзровень суадносіцца з адпаведным узроўнем валентнасці: узровень логіка-семантычнай дыстрыбуцыі – з узроўнем логіка-семантычнай валентнасці, узровень семантычнай дыстрыбуцыі – з узроўнем семантычнай валентнасці, узровень фармальна-граматычнай дыстрыбуцыі – з узроўнем сінтаксічнай валентнасці [14; 15, с. 146–168, 152–170, 227–228].

Факт, што дзеяслоўны прэдыкат накладвае на сваё акружэнне абмежаванні ў спалучальнасці (гэта значыць, што ў ім могуць ужывацца толькі словы адпаведных функцыянальных класаў), дазваляе вылучыць наступныя тыпы дыстрыбуцыйных абмежаванняў:

1) логіка-семантычныя (абумоўліваюцца прапазіцыйнай якасцю таго ці іншага актанта);

2) катэгарыяльна-семантычныя (абумоўліваюцца дзеяннем у мове закона семантычнага дапасавання і вызначаюцца прыналежнасцю таго ці іншага актанта ў сінтаксічным акружэнні дзеяслова да пэўнага катэгарыяльна-семантычнага класа, напрыклад да класа адушаўлёных, абстрактных, персанальных і іншых імёнаў);

3) фармальныя (абумоўліваюцца прыналежнасцю таго ці іншага актанта да пэўнага фармальна-граматычнага класа (намінатыў (далей – N_{nom}), акузатыў (далей – N_{acc}) і г. д.));


4) лексічныя (вызначаюцца індывідуальнай (а не абагульненай) характарыстыкай слова – яго лексічным значэннем).

Вылучаныя тыпы дзеяслоўнага акружэння з'яўляюцца адначасова ўмовамі (логіка-семантычнымі, семантычнымі, фармальна-граматычнымі і лексічнымі) рэалізацыі актуальнага дзеяслоўнага значэння.

Пад дыстрыбуцыйнымі ўласцівасцямі дзеяслоўнага прэдыката ў дадзенай працы будуць разумецца наступныя колькасныя і якасныя характарыстыкі актантаў: колькасць адкрытых дзеясловам актантных пазіцый, іх аблігаторны або факультатыўны характар, якасць актантаў (логіка-семантычная, катэгарыяльна-семантычная, фармальна-граматычная, лексічная).

Такім чынам, кожны асобны дзеяслоў будзе мець унікальны, у пэўнай ступені непаўторны набор дыстрыбуцыйных прымет, што нельга не ўлічваць пры кантрастыўным аналізе.

Дадзены падыход дазваляе пабудаваць чатырохузроўневую дзеяслоўную дыстрыбуцыйную мадэль, рэлевантную для аналізу сінтаксічных мадэлей простага сказа, якая адлюстравана на мал. 1.



Мал. 1. Дзеяслоўная дыстрыбуцыйная мадэль

Fig. 1. Verbal distributional model

ДДМ: агульная характарыстыка. ДДМ – гэта тэарэтычная (аксіяматычная, дэдуктыўна вызначаная, метамоўная) мадэль. Яна не з'яўляецца суцэльнай абстракцыяй і прадстаўляе сабой тэарэтычна вызначаны, але аб'ектыўна дадзены, падказаны рэальнымі сінтаксічнымі паводзінамі дзеяслоўных прэдыкатаў «прадукт» аналітычнай працы даследчыка. ДДМ настолькі ж рэальная, наколькі рэальна можна апісаць семантыку адпаведнага дзеяслова праз яго дыстрыбуцыю.

ДДМ пры супастаўленні моў або ўнутрымоўных зрэзаў выконвае функцыю мовы-пасрэдніцы, якая з'яўляецца трэцім кампанентам супастаўлення, або *tertium comparationis*. Такі падыход дазваляе вылучыць наступныя этапы даследчыцкай працы: 1) вызначэнне мовы-пасрэдніцы; 2) супастаўленне кожнай з моў (А і В) з мовай-пасрэдніцай; 3) вызначэнне міжмоўных адпаведнасцей паміж мовамі А і В на аснове фактаў, атрыманых пры супастаўленні кожнай канкрэтнай мовы з мовай-пасрэдніцай; 4) праверка атрыманых даных праз так званы аднабаковы метад – ад мовы А да мовы В і наадварот.

Мова-пасрэдніца займае, такім чынам, становішча паміж мовамі (у англамоўнай літаратуры прыняты тэрмін *interlanguage* [16; 17]).

Аб'ём ДДМ абумоўлены валентнаснымі і дыстрыбуцыйнымі ўласцівасцямі дзеяслова. Ёсць падставы ўлічваць пры дыстрыбуцыйным аналізе як аблігаторныя, так і факультатыўныя дзеяслоўныя валентнасці. Паводле Ю. Д. Апрэсяна, пры апісанні ДФ мэтазгодна паказваць усе факультатыўныя пазіцыі, бо толькі «разгорнутыя» ДФ з'яўляюцца найбольш эфектыўнымі ў плане семантычнай дыферэнцыяцыі слоў. Параўнаем выразы *група бяжыць* і *час бяжыць*, у якіх фармальная ДФ $N_{nom} – V_f$ (дзе V_f – фінітная форма дзеяслова) не адрознівае значэнні дзеяслова *бегчы* ў прыведзеных выпадках, і толькі яе пашырэнне (*група бяжыць у сталоўку абедаць*) дазваляе ДФ выканаць сэнсаадрознівальную функцыю [7, с. 152–153].

ДДМ, як і любая сінтаксічная адзінка, мае двухбаковы характар, гэта значыць характарызуецца наяўнасцю ўзаемазалежных і ўзаемаабумоўленых плана зместу і плана выражэння. Вопыт «добрай сінтаксічнай тэорыі» [18, с. 302] паказвае, што ў сувязі з асіметрыяй глыбінных і паверхневых структур найбольш перспектыўна вылучаць мадэлі на аснове семантычных і структурных прымет адначасова [19, с. 70]. Адметна, што некаторыя вучоныя спрабуюць вылучаць адначасова семантычную і фармальную мадэлі сказа. Параўнаем, напрыклад, паняцці *семантыка-сінтаксічная мадэль* і *фармальна-граматычная схема сказа* [20, с. 5–6; 21, с. 74], *schemat syntaktyczny* і *szablon syntaktyczny* [22], *план зместу* (*прапазіцыя*) *сінтаксічнай мадэлі* і *план выражэння* (*фармальная структура*) *сінтаксічнай мадэлі* [21; 23, с. 4–5; 26]. Пры гэтым глыбінная структура разглядаецца як зыходная, а паверхневая лічыцца рэалізацыяй зыходнай структуры, што з'яўляецца яшчэ адным аргументам на карысць тэзіса аб непасрэднай абумоўленасці сінтаксісу глыбінных і сінтаксісу паверхневых структур як двух асноўных аспектаў апісання сінтаксічных адзінак.

ДДМ мае комплексны характар. Яна ўлічвае магчымасці дзеяслова спалучацца на чатырох узроўнях, на якіх ён функцыянуе адпаведна як логіка-семантычная, семантычная, марфалагічная і лексічная адзінка.

Апісанне дыстрыбуцыйных уласцівасцей дзеяслова праз ДДМ уяўляе сабой паўузроўневы комплексны аналіз дыстрыбуцыі дзеяслоўнага прэдыката, што ў межах адной мадэлі дазваляе аб'яднаць прапазіцыйную, семантычную, фармальную і лексічную структуры і праз іх апісаць розныя тыпы архаічных і сучасных простых сказаў.

Такое інтэграванае апісанне мовы, якое прадугледжвае адзінства сінтаксісу і семантыкі, граматыкі і лексікі, адпавядае агульнай тэндэнцыі развіцця лінгвістыкі канца XX – пачатку XXI ст. [24, с. 4; 25, с. 16, 45–46].

Будова ДДМ

План зместу (глыбінная структура) ДДМ. ***Узровень 1.1 ДДМ.*** На ўзроўні 1.1 ДДМ праводзіцца апісанне логіка-семантычных дыстрыбуцыйных уласцівасцей дзеяслоўных прэдыкатаў, пад якімі разумеюцца колькасць імплікаваных праз прэдыкат актантных пазіцый, іх аблігаторны або факультатыўны характар і прапазіцыйная якасць актантаў. Іншымі словамі, на ўзроўні 1.1 ДДМ для кожнага дзеяслова вызначаецца зыходная прэдыкатна-актантная структура (ЗПАС), колькасць і прапазіцыйная якасць актантаў у якой прадвызначаюцца значэннем прэдыкатаў. ЗПАС суадносіцца са структурай той ці іншай тыповай пазамоўнай сітуацыі: у складзе прапазіцыі ДДМ прыватныя функцыі глыбінных склонаў зводзяцца да абазначэння роляў партыцыпантаў у структуры сітуацыі [4, с. 174; 26; 27, с. 126].

Набор глыбінных склонаў мае традыцыйны ўніверсальны для розных моў характар і суадносіцца з такімі паняццямі, як агенс, пацыенс, эксперыенсіў, інструмент, лакатыў, адрасат, пасесар, бенефіцыянт і інш. У розных аўтарскіх канцэпцыях прыводзяцца розныя колькасць і якасць глыбінных склонаў. Так, пачынальнік склонавай граматыкі Ч. Філмар у розныя перыяды вылучае 5–8 глыбінных склонаў. У працах А. А. Халадовіча фігуруюць 3 «удзельнікі сітуацыі», У. Чэйфа – 7 глыбінных склонаў, В. В. Багданавай і Т. Б. Алісавай – 14. М. Каўка даводзіць колькасць семантычных функцый да 16, Ю. Д. Апрэсян піша пра 25 відаў валентнасці, Н. М. Лявонцьева – пра 50 актантаў і г. д. Колькасць

актантаў у розных навуковых класіфікацыях вагаецца ад 2 (А. Хэйл) да 86 (М. У. Усеваладава)[1]. «Глыбіня» гэтых класіфікацый залежыць «ад парога дробнасці семантычных валентнасцей прэдыкатаў» [23, с. 7; 28, с. 57–58, 66–67]. Больш за тое, дадзены «падзел можна давесці да кожнай асобнай аргументнай ролі канкрэтных слоў» [29, с. 125].

Логіка-семантычны ўзровень ДДМ у нашай працы базіруецца на інвентары семантычных функцый, вылучаных М. У. Усеваладавай [30, с. 134–153].


Узровень 1.2 ДДМ. На ўзроўні 1.2 акружэнне кожнага дзеяслоўнага прэдыката характарызуецца якасна шляхам указання семантычных дыстрыбуцыйных абмежаванняў праз такія паняційныя катэгорыі, як адушаўлёнасць ці неадушаўлёнасць (далей – ±Anim), персанальнасць ці неперсанальнасць (далей – ±Pers), абстрактнасць (канкрэтнасць) і інш. Пры неабходнасці магчыма далейшая канкрэтызацыя значэння. Для большасці дзеясловаў характэрна семантычная выбіральнасць: каб сказ быў правільным, яны павінны спалучацца не з любымі актантамі, а толькі з некаторымі, абмежаванымі пэўнымі функцыянальна-семантычнымі класамі. Гэты выпадак – той самы прыклад, калі «ў сінтаксіс “умешваецца” не семантыка асобных слоў, а семантыка пэўных (больш ці менш агульных) катэгорый» [31, с. 178].

Канстатуем адсутнасць навукова абгрунтаванага комплексу семантычных характарыстык актантаў, які задавальняў бы ўсіх даследчыкаў. У розных аўтарскіх канцэпцыях прыводзяцца неаднолькавыя па колькасці і якасці таксаноміі. Так, Г. Хэльбіг і В. Шэнкель, якія аднымі з першых у лексікаграфічнай практыцы выкарысталі для апісання семантычнага акружэння дзеясловаў дакладна вызначаны комплекс семантычных дыстрыбуцыйных характарыстык у якасці лексікаграфічных параметраў, вылучалі 12 прымет: abstract – [Abstr]; abstract (als human) – [Abstr (als Hum)]; action – [Act]; +animate – [+Anim]; –animate – [–Anim]; human – [Hum]; –human – [–Hum]; causal – [Caus]; direction – [Dir]; local – [Loc]; modal – [Mod]; temporal – [Temp] [14, S. 72–74].

На думку Ю. Д. Апрэсяна, спалучальнасць павінна быць абагульнена ў тых катэгорыях, якія маюць структурную аснову ў пэўнай мове (12 катэгорый): адушаўлёныя прадметы (асоба, не асоба, асоба мужчынскага полу, асоба жаночага полу), неадушаўлёныя прадметы (канкрэтныя прадметы, рэчы, адзінкавасць рэчаў, зборнасць як прымета рэчаў, рэчывы, абстрактныя паняцці) [5, с. 56].

Найбольш поўны набор (16 адзінак) семантычных уласцівасцей дзеяслоўнага акружэння прадстаўлены ў працы [32, t. 1, s. 6–7, 9–10]: abstrakcyjność [+Abstr], konkretność [–Abstr], żywotność [+Anim], nieżywotność [–Anim], osobowość [+Hum], nieosobowość [–Hum], zbiorowość [Coll], żywioł [Elm], roślina [Fl], informacja [Inf], instytucja [Instit], narzędzie [Instr], płyn [Liqu], maszyna [Mach], materiał [Mat], część [Pars]. Некаторыя з гэтых семантычных характарыстык утвараюць камбінацыі тыпу [–Abstr/–Anim], [+Hum/Pars].

Пры апісанні спалучальнасці прамаперахадных дзеяслоўных прэдыкатаў апрабацыю прайшла класіфікацыя селекцыйных катэгорый, адлюстраваная на мал. 2 (курсівам вылучаны селекцыйныя катэгорыі, што прадвызначаюць будову сучаснай (С) і архаічнай (А) транзітыўных мадэлей: на катэгорыю адушаўлёнасці (неадушаўлёнасці) арыентуецца сучасная беларуская літаратурная мова, на катэгорыі персанальнасці (неперсанальнасці) і дарасласці (недарасласці) – беларуская літаратурная мова пачатку XX ст. [1, с. 341–350; 33–36].



Мал. 2. Класіфікацыя селекцыйных катэгорый
Fig. 2. Classification of selective categories

[1]Спісы дэнататыўных роляў у розных аўтараў будуюцца на розных падставах, таму адрозніваюцца па колькасці і якасці. Адны вылучаюць мінімальныя наборы актантаў, іншыя, у тым ліку і М. У. Усеваладава, бачаць патрэбу ў канкрэтызацыі, дэталізацыі ролевых функцый, што абумоўлена ў першую чаргу характарам прэдыката і агульным тыпам сітуацыі. Так, у аўтара найбольш шматлікай класіфікацыі актанты падзелены на наступныя класы (праз працяжнік указваецца колькасць тыпаў актантаў, якія з’яўляюцца прадстаўнікамі пэўнага класа): ролі тыпу «пратаганіст» – 18; ролі тыпу «пацыенс» – 11; ролі тыпу «адрасат» – 4; ролі тыпу «інструмент» – 8; ролі тыпу «сітуанты» – 13; ролі тыпу «сірканстанты» – 32 [30, с. 133–153].

Пры дапамозе гэтай класіфікацыі можа быць апісана спецыфіка не толькі транзітыўных канструкцый. Ёсць спробы апісаць таксама селекцыйную катэгорыю адчужальнасці (неадчужальнасці) і беларускія пасесіўныя мадэлі [21, с. 214–216; 37].

План выражэння (паверхневая структура) ДДМ. Глыбінная структура ДДМ, якая, па сутнасці, уяўляе сабой семантычную структуру простага сказа, на паверхневым узроўні «маніфестуецца» праз самыя разнастайныя лексіка-граматычныя варыянты [38, с. 28].

Узровень 2.1 ДДМ. На ўзроўні 2.1 для кожнага дзеяслоўнага прэдыката прыводзяцца колькасныя і якасныя характарыстыкі яго фармальна-граматычнага акружэння: колькасць эксплікаваных актантаў, іх аблігаторны або факультатыўны характар; марфолага-сінтаксічныя тыпы дзеяслоўных пашыральнікаў, што ўказваюць на прыналежнасць залежных ад дзеяслова элементаў да пэўнай часціны мовы і на ўжыванне ў адпаведнай склонавай форме.

Элементарнай адзінкай плана выражэння на фармальна-сінтаксічным узроўні з'яўляецца граматычная форма актанта. У сістэме дзеяслоўных пашыральнікаў базіс складаюць склонавыя формы назоўнікаў: сінтэтычныя (намінатыў (N_{nom}), генітыў (N_{gen}), датыў (N_{dat}), акузатыў (N_{acc}), інструменталь (N_{instr}), лакатыў (N_{loc})), аналітычныя (назоўнік у пэўнай склонавай форме з прыназоўнікам (nN_n)), а таксама іншыя тыпы сінтаксічных пашыральнікаў (дэвербатыў (N_v), інфінітыў (Inf), прыметнік (Adj), прыслоўе (Adv), даданая частка (Sent)).

Заўважым, што адна і тая ж прэдыкатна-актантная структура можа мець некалькі варыянтаў свайго фармальнага ўвасаблення на паверхневым узроўні. Фармальная варыянтнасць сведчыць пра спецыфіку той ці іншай мовы на ўзроўні паверхневых структур.

Узровень 2.2 ДДМ. Як зазначае Б. Ю. Норман, функцыянальная нагрузка мадэлі звязана не толькі з варыянтамі яе марфалагічнага выражэння, але і з дыяпазонам лексем, што адпавядаюць прэдыкатнай пазіцыі мадэлі [23, с. 18]. Аднак не менш важна, на нашу думку, гаварыць пра дыяпазон лексем, суадносных з актантнымі пазіцыямі.

Запаўненне адкрытых праз дзеяслоўны прэдыкат актантных пазіцый канкрэтнай лексікай адбываецца пры актуалізацыі сказа і фарміраванні выказвання [39, с. 35], прычым тая ці іншая ЗПАС можа мець мноства лексічных варыянтаў сваёй рэалізацыі ў маўленні [40, с. 20]. Кожная прэдыкатна-актантная структура суадносіцца з пэўным наборам лексем, здольных без парушэння правіл семантычнага дапасавання займаць некаторую пазіцыю.

Замяшчэнне актантных пазіцый на ўзроўні 2.2 ДДМ абумоўлена тымі дыстрыбуцыйнымі абмежаваннямі, што былі вылучаны на ўзроўні 1.2 ДДМ. У выніку дзеяння закона семантычнай выбіральнасці ў актантныя пазіцыі прэдыката могуць уваходзіць толькі такія лексемы, якія супадаюць з прэдыкатнай лексемай па сваім «семантычным кодзе», гэта значыць утрымліваюць у сваёй семантычнай структуры агульныя з прэдыкатам семантычныя кампаненты. Іншымі словамі, у рэальнай моўнай плыні кожны дзеяслоў рэалізуе вызначаныя на ўзроўні 1.2 ДДМ дыстрыбуцыйныя абмежаванні ў адпаведнасці з індывідуальным парогам сваіх спалучальнасных абмежаванняў.

Кантрастыўная тыпалогія ДДМ. Вызначым магчымыя тыпы адпаведнасцей на ўзроўні кантрастыўных пар.

Як паказвае наш уласны вопыт супастаўлення ДДМ, больш зручна зыходзіць з традыцыйнай бінарнай сістэмы міжмоўных адпаведнасцей. У розных аўтарскіх канцэпцыях два асноўныя тыпы сінтаксічных адпаведнасцей называюцца па-рознаму: адпаведнасць тоеснасці – адпаведнасць адрознення [41, с. 3], ізамарфізм (падабенства) – аламарфізм (разыходжанне) [42, с. 27], універсальнае – спецыфічнае [23].

Параметрамі супастаўлення сінтаксічных адзінак у дадзенай працы прапануем лічыць усе ўзроўні, што былі вылучаны ў структуры ДДМ, а іменна логіка-семантычны (прапазіцыйны), катэгарыяльна-семантычны, фармальна-граматычны і лексічны. Пры гэтым на кожным з чатырох узроўняў супастаўлення будзем зыходзіць з бінарнай сістэмы міжмоўных адпаведнасцей, вылучаючы тоесныя (цалкам падобныя, ізаморфныя) і нятоесныя (адрозныя, аламорфныя) элементы.

Вынікі дыстрыбуцыйнага аналізу, прадстаўленыя ў табл. 1, дазваляюць вызначыць наступную кантрастыўную тыпалогію: тоесныя, нятоесныя (эквівалентныя і неэквівалентныя) ДДМ. Праілюструем кожную разнавіднасць кантрастыўнай тыпалогіі на прыкладзе сінтаксічных мадэлей дзеяслоўнага прэдыката *смяяцца*.

У сінхраніі ў беларускай літаратурнай мове ўжываюцца дзеясловы *смяяцца-1* як прэдыкат праявы пэўнага стану (смяяцца ад радасці) і *смяяцца-2 + з* N_{gen} як прэдыкат адносін з адмоўнай ацэнкай (з пакрыўджанай жонкі) [43, с. 97–98].

У дыяхраніі зафіксавана пяць разнавіднасцей дзеяслова *смяяцца* з розным іменным пашырэннем: традыцыйныя для беларускай мовы разнавіднасці *смяяцца-1* і *смяяцца-2 + з* N_{gen}, *смяяцца-3 + над* N_{instr} як прэдыкат адносін з адмоўнай ацэнкай, *смяяцца-4 + перад* N_{instr} як прэдыкат адносін з адмоўнай ацэнкай, *смяяцца-5 + да* N_{gen} як прэдыкат адносін са станоўчай ацэнкай [43, с. 100–103].

Табліца 1

Кантрастыўная тыпалогія дзеяслоўных мадэлей

Table 1

Contrastive typology of verbal models

Тып мадэлі	План зместу	План выражэння
Тоесныя мадэлі	+	+
Нятоесныя мадэлі: эквівалентныя мадэлі неэквівалентныя мадэлі	 + –	 – –

Заўвага. Знак «плюс» абазначае тоеснасць СМ дзеясловаў адной кантрастыўнай пары на адпаведным узроўні супастаўлення, знак «мінус» абазначае нятоеснасць.

Тоесныя мадэлі. Тоесныя мадэлі маюць поўнае супадзенне як на ўзроўні плана зместу (глыбінных структур), так і на ўзроўні плана выражэння (паверхневых структур). Да ліку такіх мадэлей можна аднесці, напрыклад, мадэлі архаічных і сучасных прэдыкатаў *смяяцца-1* і *смяяцца-2* (табл. 2 і 3).

Табліца 2

Кантрастыўная пара *смяяцца-1* (А) – *смяяцца-1* (С)

Table 2

Contrastive pair *смяяцца-1* (archaic) – *смяяцца-1* (modern)

План зместу		План выражэння	
Узровень 1.1	Узровень 1.2	Узровень 2.1	Узровень 2.2
Exp	[+Pers]	N_{nom}	Хлопец
Pred	статальны	V_f	смяецца
(Caus)	[+Abstr]	(ад N_{gen} / з N_{gen})	ад хвалявання / з радасці
(Mod)	–	(Adv)	(гучна)

Заўвага. Акрамя згаданых вышэй, у табл. 2–6 ужыты наступныя скарачэнні: Abstr – эксабстрактнасць; Caus – прычына; Exp – перыенсіў; Mod – спосаб дзеяння; Pred – прэдыкат.

У абодвух выпадках дзеяслоў *смяяцца* выступае як статальны прэдыкат з адпаведным наборам глыбінных склонаў. Актанты «прычына» і «спосаб дзеяння» маюць факультатыўны характар, што пацвярджаюць прыклады з акадэмічных слоўнікаў: *Мішка расказвае нешта, а хлопцы смяюцца* (Я. Брыль); *Унь пяе, смяецца з радасці народ* (З. Бядуля); *Роберт ненатуральна смяяўся ад хвалявання і бездапаможна махаў рукамі ў паветры* (С. Анісаў); *Вочы дзяўчыны радасна смяяліся, хоць выгляд у яе быў паніклы і разгублены* (М. Ракітны).

Табліца 3

Кантрастыўная пара *смяяцца-2 + з N_{gen}* (А) – *смяяцца-2 + з N_{gen}* (С)

Table 3

Contrastive pair *смяяцца-2 + з N_{gen}* (archaic) – *смяяцца-2 + з N_{gen}* (modern)

План зместу		План выражэння	
Узровень 1.1	Узровень 1.2	Узровень 2.1	Узровень 2.2
Ag	[+Pers]	N_{nom}	Муж
Pred	рэляцыйны	V_f	смяецца
Pat	[±Anim]	з N_{gen}	з пакрыўджанай жонкі
(Mod)	–	(Adv)	(злосна або гучна)

Заўвага. Акрамя згаданых вышэй, у табл. 3–6 ужыты наступныя скарачэнні: Ag – агенс; Pat – пацыенс.

Архаічны і сучасны рэляцыйныя прэдыкаты *смяяцца-2* таксама ўтвараюць тоесныя мадэлі з поўным супадзеннем глыбінных і паверхневых структур: *З мяне смяюцца, пагарджаюць,/бо я мужык, дурны мужык* (Я. Купала); *Пачуўшы смех сваіх мужыкоў, яны спыняюць калатню, ускакваюць з зямлі, і кожная злосна кідаецца на свайго мужа за тое, што, гад, не толькі не памагае ў гэткай бядзе, каб выйсці з гонарам, ды яшчэ смяецца з пакрыўджанай жонкі* (З. Бядуля).

Эквівалентныя мадэлі. Эквівалентныя мадэлі супадаюць толькі на ўзроўні плана зместу і маюць істотныя адрозненні на ўзроўні плана выражэння.

Эквівалентнымі, напрыклад, будуць мадэлі дзеяслоўных прэдыкатаў адносін з адмоўнай ацэнкай архаічных прэдыкатаў *смяяцца-3 + над* N_{instr}, *смяяцца-4 + перад* N_{instr} і сучаснага прэдыката *смяяцца-2 + з* N_{gen} (табл. 4 і 5).

Табліца 4

Кантрастыўная пара *смяяцца-3 + над* N_{instr} (A) – *смяяцца-2 + з* N_{gen} (C)

Table 4

Contrastive pair *смяяцца-3 + над* N_{instr} (archaic) – *смяяцца-2 + з* N_{gen} (modern)

План зместу			План выражэння	
Узровень 1.1	Узровень 1.2	Узровень 2.1 (A)	Узровень 2.1	Узровень 2.2
Ag	[+Pers]	N_{nom}	N_{nom}	A: ён C: ён
Pred	рэляцыйны	V_f	V_f	A: смяецца C: смяецца
Pat	[±Anim]	над N_{instr}	з N_{gen}	A: над маімі словамі C: з маіх слоў
(Mod)	–	(Adv)	(Adv)	(злосна)

Табліца 5

Кантрастыўная пара *смяяцца-4 + перад* N_{instr} (A) – *смяяцца-2 + з* N_{gen} (C)

Table 5

Contrastive pair *смяяцца-4 + перад* N_{instr} (archaic) – *смяяцца-2 + з* N_{gen} (modern)

План зместу			План выражэння	
Узровень 1.1	Узровень 1.2	Узровень 2.1 (A)	Узровень 2.1 (C)	Узровень 2.2
Ag	[+Pers]	N_{nom}	N_{nom}	A: ён C: ён
Pred	рэляцыйны	V_f	V_f	A: смяецца C: смяецца
Pat	[±Anim]	перад N_{instr}	з N_{gen}	A: перад разгневаным законам C: з разгневанага закону
(Mod)	–	(Adv)	(Adv)	(злосна)

Супастаўленне сінтаксічных мадэлей архаічных прэдыкатаў *смяяцца-3* і *смяяцца-4* і сучаснага прэдыката *смяяцца-2* на ўзроўнях 2.1 і 2.2 карэктнае, бо ў такіх рэляцыйных прэдыкатаў агульная прапазіцыйная структура. Як бачым, ДДМ архаічнага і сучаснага дзеясловаў адрозніваюцца фармальнымі сродкамі рэалізацыі на паверхневым (фармальна-граматычным) узроўні семантычнай функцыі пацыенса.

Звернем увагу на тое, што ў адпаведных мадэлях пры выражэнні пацыенса на пачатковым этапе фарміравання беларускай літаратурнай мовы будзе назірацца пэўная варыятыўнасць: …*смяяцца перэд законом*[2] (Наша доля. 1906. № 4. С. 2); …*здзекавацца над ім* (Наша доля. 1906. № 2. С. 4); …*насмешки над правасудзем* (Наша доля. 1906. № 6. С. 2); *Съмеялися некаторые з Андрэя, што ён балотам палиць ў печы и гатуе есьци* (Наша ніва. 1908. № 5. С. 5); *Съмяецца над сваей роднай мовай, каторай навучыла яго матка, значыць, съмяецца и над сваей маткай* (Наша ніва. 1912. № 22. С. 2); …*и лесу адкрываў*

[2] Тут і далей цытаты прыводзяцца з захаваннем асаблівасцей арыгінала.

Меншы Брат свае думки, бо людзи смяялися з яго слоў и песень (Наша ніва. 1906. № 4. С. 4); *З яго мовы смяялися старшые браты* (Наша ніва. 1906. № 4. С. 5); *Над ім зьдзекуюцца ад часоў*; *Чаму гэта дэталі жыцьця так зьдзекуюцца з яго*; *…гвалт над нашымі душамі*; *…за даўгія вякі гвалту і зьдзеку над нашай душой* (І. Абдзіраловіч); *Так ён з паднятымі рукамі стаў і смяецца перад разгневаным законам* (Цётка); *З мяне смяюцца, пагарджаюць,/бо я мужык, дурны мужык*; *Паношыцца ў кожнай прыгодзе, сьмяяцца ня дасьць над сабой…* (Я. Купала); *…зьдзекавацца над казакамі*; *Зьдзек не с права, а з сілы* (В. Ластоўскі); *…смяяцца з маіх скокаў*; *…вярнуўся зьбянтэжаны, ня ведаючы, жартуюць з ім ці кажуць праўду*; *Ціпержа нада мною таварішчы сьміютца*; *…над ім пасмяяўся*; *…насмяханне над маімі словамі* (М. Гарэцкі); *Над бацькавымі мазалямі смяешся…*; *А ты цябер і смяешся з бацькі, з маткі…* (А. Мрый).

Як бачым, назіраецца пэўны разнабой, які сведчыць пра тое, што на той час сінтаксічная норма адносна спалучальнасці дзеяслова *смяяцца* пакуль не склалася. Нават адны і тыя ж аўтары ўжываюць сінанімічныя канструкцыі. Пераважаюць пры гэтым сінтаксемы *над кім* (*чым*) і *з каго* (*чаго*). Тагачасныя канструкцыі тыпу *смяяцца*, *насміхацца*, *здзекавацца над* N_{instr} (норма сучаснай рускай мовы) варта разглядаць як беларуска-рускія ізасінтаксічныя структуры.

Неэквівалентныя мадэлі. У СМ дзеясловаў з адпаведным кантрастыўным тыпам адрозненні выяўляюцца як на ўзроўні прэдыкатна-актантных структур, так і на ўзроўні іх фармальна-граматычнай рэалізацыі (табл. 6).

Табліца 6

Кантрастыўная пара *смяяцца-5* + N_{gen} (А) – *смяяцца-2* + *з* N_{gen} (С)

Table 6

Contrastive pair *смяяцца-5* + *да* N_{gen} (archaic) – *смяяцца-2* + *з* N_{gen} (modern)

План зместу				План выражэння		
Узровень 1.1 (А)	Узровень 1.1 (С)	Узровень 1.2 (А)	Узровень 1.2 (С)	Узровень 2.1 (А)	Узровень 2.1 (С)	Узровень 2.2
Ag	Ag	[+Pers]	[+Pers]	N_{nom}	N_{nom}	А: яна С: яна
Pred	Pred	рэляцыйны: +	рэляцыйны: –	V_f	V_f	А: засмяялася С: смяялася
Adr	Pat	[±Anim]	[±Anim]	да N_{gen}	з N_{gen}	А: да яго С: з яго
(Mod)	(Mod)	–	–	(Adv)	(Adv)	(цёпла) (пагардліва)

Неэквівалентнасць выяўляецца тут ужо на ўзроўні прэдыкатаў: архаічны прэдыкат адносін утрымлівае станоўчую ацэнку, а сучасны прэдыкат адносін – адмоўную. Гэта акалічнасць абумоўлівае адрозныя прапазіцыйныя структуры.

Так, у ДДМ архаічнага дзеяслова *смяяцца-5* вылучаецца адрасатная функцыя са спосабам выражэння *да* N_{gen} (параўнаем з тоеснай польскай структурай: *śmiać się-3 do kogoś*). Смех тут выконвае фатычную функцыю: дапамагае падтрымліваць або наладжваць добрыя адносіны з іншымі людзьмі. Семантыка прыназоўніка *да* [44, с. 18–20], аднак, дазваляе разглядаць адпаведны дзеяслоў і як прэдыкат перадачы інфармацыі. Такім чынам, відавочнай становіцца беларуска-польская ізасінтаксічная структура таго часу.

Архаічная канструкцыя *смяяцца* + *да* N_{gen} выяўлена намі ў творах Цёткі і Янкі Купалы: *Мілыя, бясконца багатыя мінуты смяяліся да яе, ласкаліся вяснянымі ўздохамі, апляталі чаромхі шэптам змучаны мозг…*; *Засмяялася да ігрывых хімер і паверыла абману* (Цётка); *Рэчка ўецца і смяецца да зялёных лоз і вольх…*; *Жаль, нуда хай ідуць перад намі, / І маркотнасць, і любасць бясконца, / А ты, маці, сваймі каласкамі / Шумі, цешся і смейся да сонца* (Я. Купала). Адзінкавыя сучасныя кантэксты з твораў В. Адамчыка, У. Караткевіча і А. Васілевіч сведчаць пра дыялектны характар адпаведнай канструкцыі ў тэкстах сучаснай прозы.

Сучасны дзеяслоўны адпаведнік як рэляцыйны прэдыкат адносін з адмоўнай ацэнкай мае ў адпаведнай пазіцыі пацыенс[3], выражаны праз сінтаксему *з* N_{gen}.

Як бачым, для неэквівалентных мадэлей характэрна наступная карэляцыя: адрозненні на прапазіцыйным узроўні абумоўліваюць адрозненні на фармальна-граматычным узроўні.

Яшчэ адзін відавочны прыклад такой «залежнасці» прадстаўлены ў ДДМ архаічнага і сучаснага прэдыкатаў *сядаць* (табл. 7):

[3]Ёсць, аднак, меркаванне, што ў адпаведнай пазіцыі будзе выступаць такі актант, як стымул [43, с. 98–99].

Табліца 7

Кантрастыўная пара *сядаць + на N_{loc}* (А) – *сядаць + на N_{acc}* (С)

Table 7

Contrastive pair *сядаць + на N_{loc}* (archaic) – *сядаць + на N_{gen}* (modern)

План зместу			План выражэння		
Узровень 1.1 (А)	Узровень 1.1 (С)	Узровень 1.2	Узровень 2.1 (А)	Узровень 2.1 (С)	Узровень 2.2
Ag	Ag	[+Pers]	N_{nom}	N_{nom}	А: я С: я
Pred	Pred	акцыянальны	V_f	V_f	А: сядаю С: сядаю
Adr	Dir / Loc / Obj	[–Anim]	на N_{loc}	на N_{acc}	А: да яго С: з яго

Заўвага. Акрамя згаданых вышэй, у табліцы выкарыстаны наступныя скарачэнні: Dir – дырэктыў; Loc – лакатыў; Obj – аб’ект.

Як бачым, прэдыкатна-актантныя структуры архаічнага дзеяслова *сядаць* і яго сучаснага адпаведніка ўтрымліваюць розныя семантычныя функцыі. Так, архаічны прэдыкат мае ўласна лакатыў. Канструкцыя з лакатывам, выражаным месным склонам (беларуска-польская ізасінтаксічная структура таго часу), мае месца, напрыклад, у творах Цёткі: *Сядаю на лаўцы, гляджу на творы рук людскіх*; *Аднаго разу між іншымі птушкамі і салавейка ўпаў на спячага марака і ўсеўся на ім адпачыць, марак, абудзіўшыся, накарміў птушачку, прыгарнуў*.

Сучасны прэдыкат утрымлівае ў сваёй ДДМ гіперфункцыю *дырэктыў / лакатыў / аб’ект*. Менавіта гэта прапазіцыйнае адрозненне абумоўлівае спецыфіку выражэння другога актанта: для архаічнага прэдыката праз сінтаксему *на N_{loc}*, для сучаснага прэдыката праз сінтаксему *на N_{acc}*. Вось чаму ў сучаснай беларускай мове ўжываецца выраз *сесці на што*, а не *сесці на чым* у адрозненне, скажам, ад польскай мовы. Адпаведна ўжываюцца формы *на лаву* ці *на лаўку*, якія выступаюць тут у якасці дырэктыва [1, с. 292–293].

Заключэнне

Праведзенае намі даследаванне дазваляе канстатаваць прыдатнасць кантрастыўнага падыходу пры ўнутрымоўных сінтаксічных даследаваннях, калі пры супастаўленні дыяхронных і сінхронных канструкцый (у нашым выпадку сінтаксічных мадэлей дзеяслоўных прэдыкатаў пачатку XX і XXI стст.) вызначаецца нацыянальная сінтаксічная спецыфіка той ці іншай мовы, а таксама выяўляецца дынаміка станаўлення яе сінтаксічных норм.

Распрацаваная намі ДДМ з’яўляецца рэлевантнай і для ўнутрымоўнага, і для міжмоўнага апісання дыстрыбуцыйных уласцівасцей дзеясловаў (сінтаксічных мадэлей простага сказа). Яна дае магчымасць супастаўляць сінтаксічныя мадэлі як розных моў, так і розных сінхронна-дыяхронных зрэзаў адной мовы, што дазваляе лічыць ДДМ універсальным тэарэтыка-метадалагічным інструментам кантрастыўнага аналізу.

З вышэйсказанага відаць, што апісанне дыстрыбуцыйных уласцівасцей дзеяслова павінна праводзіцца на двух узроўнях: плане зместу, калі ўлічваецца не толькі склад прапазіцыі, але і селекцыйныя абмежаванні прыдзеяслоўных пазіцый, і плане выражэння, калі ўлічваюцца спосабы эксплікацыі той ці іншай семантычнай функцыі, а таксама дыяпазон і характар «лексічных уваходжанняў» у эксплікаваныя пазіцыі.

У даследаванні распрацавана кантрастыўная тыпалогія мадэлей. Відавочна, тоесныя мадэлі будуць пераважаць сярод іншых кантрастыўных тыпаў СМ. Беларуска-польскі матэрыял паказаў 65 % такіх мадэлей [1, с. 381–382]. Сярод нятоесных мадэлей прэваліруюць эквівалентныя канструкцыі – структуры з універсальнай прапазіцыяй і шматлікімі адрозненнямі на паверхневым узроўні пры фармальна-граматычным выражэнні таго ці іншага актанта (узровень 2.1 ДДМ), што складае прыкладна 30 % ад агульнай колькасці ДДМ.

Неэквівалентныя мадэлі з адрознымі глыбіннай і паверхневай структурамі будуць мець адзінкавы характар (прыкладна 5 % выпадкаў), бо ў асноўным склад прапазіцый, што адлюстроўваюць пазамоўны свет, універсальны для розных моў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Важнік СА. *Кантрастыўны сінтаксіс польскай і беларускай моў: семантыка і дыстрыбуцыя дзеяслоўнага прэдыката*. Мінск: Права і эканоміка; 2008. 498 с.

2. Реформатский АА. О сопоставительном методе. В: Реформатский АА. *Лингвистика и поэтика*. Москва: Наука; 1987. с. 40–52.

3. Норман БЮ. Управление и его изучение в условиях близкородственного двуязычия. В: Шанский НМ, редактор. *Всесоюзная научная конференция по проблемам обучения русскому языку в условиях близкородственного билингвизма*. Минск: БГУ; 1975. с. 367–372.

4. Киклевич АК. *Лекции по функциональной лингвистике*. Минск: БГУ; 1999. 215 с.
5. Апресян ЮД. Дистрибутивный анализ значений и структурные семантические поля. В: Ахманова ОС, редактор. *Лексикографический сборник. Выпуск 5*. Москва: Государственное издательство иностранных и национальных словарей; 1962. с. 52–72.
6. Апресян ЮД. К вопросу о структурной лексикологии. *Вопросы языкознания*. 1962;3:38–46.
7. Апресян ЮД. О понятиях и методах структурной лексикологии (на материале русского глагола). В: Шаумян СК, редактор. *Проблемы структурной лингвистики*. Москва: Издательство Академии наук СССР; 1962. с.141–162.
8. Апресян ЮД. Опыт описания значений глаголов по их синтаксическим признакам (типам уравнения). *Вопросы языкознания*. 1965;5:51–66.
9. Апресян ЮД. *Экспериментальное исследование семантики русского глагола*. Москва: Наука; 1967. 251 с.
10. Karolak S. Składnia wyrażeń predykatywnych. W: Topolińska Z, redaktor. *Gramatyka współczesnego języka polskiego. Składnia*. Warszawa: PWN; 1984. s. 11–212.
11. Karolak S. Selekcja. W: Polański K, redaktor. *Encyklopedia językoznawstwa ogólnego*. Wrocław: Zakład narodowy imja Ossolińskich; 1993. s. 475–478.
12. Polański K, Laskowski R. Dystrybucja. W: Polański K, redaktor. *Encyklopedia językoznawstwa ogólnego*. Wrocław: Zakład narodowy imja Ossolińskich; 1993. s. 123–124.
13. Сцяцко ПУ, Гуліцкі МФ, Антанюк ЛА. *Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў*. Мінск: Вышэйшая школа; 1990. 222 с.
14. Helbig G, Schenkel W. *Wörterbuch zur Valenz und Distribution deutscher Verben*. Leipzig: VEB Bibliographisches Institut; 1969. 312 S.
15. Хельбиг Г. Части речи в синтагматике. В: Степанова МД, Хельбиг Г. *Части речи и проблема валентности в современном немецком языке*. Москва: Высшая школа; 1978. с. 138–240.
16. Selinker L. Interlanguage. *International Review of Applied Linguistics in Language Teaching*. 1972;10(3):209–231.
17. Krzeszowski TP. Interlanguage and contrastive generative grammar. *Interlanguage Studies Bulletin*. 1976;1:58–78.
18. Апресян ЮД. Синтаксис и семантика в синтаксическом описании. В: Ярцева ВН, Шведова НЮ, редакторы. *Единицы разных уровней грамматического строя языка и их взаимодействие*. Москва: Наука; 1969. с. 302–306.
19. Гак ВГ. *Теоретическая грамматика французского языка*. *Синтаксис*. Москва: Высшая школа; 1981. 208 с.
20. Міхневіч АЯ. *Сінтаксічна непадзельныя словалучэнні ў беларускай мове. Трансфармацыйны аналіз*. Мінск: Навука і тэхніка; 1965. 160 с.
21. Міхневіч АЯ. *Праблемы семантыка-сінтаксічнага даследавання беларускай мовы*. Мінск: Навука і тэхніка; 1976. 263 с.
22. Klemensiewicz Z. Schemat syntaktyczny i szablon syntaktyczny. W: Lewicki A, redaktor. *Problemy składni polskiej*. Kraków: PWN; 1971. s. 120–121.
23. Норман БЮ. *Универсальное и специфическое в синтаксических моделях славянских языков*. Минск: Университетское; 1988. 28 с.
24. Золотова ГА. *Синтаксический словарь. Репертуар элементарных единиц русского синтаксиса*. Москва: Наука; 1988. 440 с.
25. Бабенко ЛГ, редактор. *Русская глагольная лексика: пересекаемость парадигм. Памяти Э. В. Кузнецовой*. Екатеринбург: Издательство Уральского университета; 1997. 517 с.
26. Филлмор Ч. Дело о падеже. В: Звегинцев ВА, редактор. *Новое в зарубежной лингвистике. Лингвистическая семантика. Выпуск 10.* Москва: Прогресс; 1981. с. 369–495.
27. Левицкий ЮА. *От высказывания – к предложению. От предложения – к высказыванию*. Пермь: Пермский государственный университет; 1995. 196 с.
28. Богданов ВВ. *Семантико-синтаксическая организация предложения*. Ленинград: Издательство Ленинградского университета; 1977. 204 с.
29. Никитин МВ. *Основы лингвистической теории значения*. Москва: Высшая школа; 1988. 168 с.
30. Всеволодова МВ. *Теория функционально-коммуникативного синтаксиса: фрагмент прикладной (педагогической) модели языка.* Москва: Издательство Московского государственного университета имени М. В. Ломоносова; 2000; 502 с.
31. Будагов РА. *Человек и его язык*. Москва: Издательство Московского государственного университета имени М. В. Ломоносова; 1976. 428 с.
32. Polański K. *Słownik syntaktyczno-generatywny czasowników polskich. Tom 1–5.* Wrocław: PAN; 1980–1992.
33. Важнік СА. Транзітыўная мадэль як паказальнік безэквівалентнасці сінтаксісу беларускай мовы (пры супастаўленні з польскай мовай). *Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія*. 2000;1:43–47.
34. Важнік СА. Праблема апісання сінтаксічных архаізмаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове: змены ў семантычнай структуры транзітыўных сказаў. В: Загнітко А, редактор. *Лінгвістичні студії. Випуск 16.* Донецьк: Донецький національний університет; 2008. с. 100–103.
35. Важнік СА. Дарасласць / недарасласць як сінтаксічная катэгорыя беларускага сінтаксісу пачатку XX ст. В: Пивоварчик ТА, Минчук ИИ, Зезюлевич АВ, редакторы. *Язык как ценность бытия*. Гродно: Гродненский государственный университет имени Янки Купалы; 2023. с. 92–99.
36. Важнік СА. Цётка: моўная асоба – сінтаксіс. *Сафія*. 2024;1:21–35.
37. Важнік СА. Сінкрэтызм беларускага сінтаксісу: на прыкладзе пасесіўных канструкцый з прэдыкатамі *мець* і *быць*. *Труды БГТУ. Серия 4, Принт- и медиатехнологии*. 2022;1:102–110.
38. Васильев ЛМ. *Семантика русского глагола*. Москва: Высшая школа; 1981. 184 с.
39. Лещенко МИ. *Виртуальный и актуальный аспекты предложения*. Минск: Вышэйшая школа; 1988. 131 с.
40. Бабенко ЛГ, редактор. *Семантические модели русских глагольных предложений. Экспериментальный синтаксический словарь. Проспект*. Екатеринбург: Издательство Уральского университета; 1998. 169 с.
41. Ломтев ТП. *О синтаксических соответствиях тождества и различия в глагольно-именных сочетаниях в славянских языках*. Москва: Московский университет имени М. В. Ломоносова; 1958. 24 с.
42. Гак ВГ. *Сравнительная типология французского и русского языков*. Москва: Просвещение; 1983. 288 с.
43. Важнік СА. Кантрастыўны сінтаксіс дзеяслова *смяяцца*. *Беларуская лінгвістыка*. 2024;93:96–105.
44. Шуба ПП. *Тлумачальны слоўнік беларускіх прыназоўнікаў.* Мінск: Народная асвета; 1993. 168 с.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 03.02.2025.
Received by editorial board 03.02.2025.

УДК 811.581’37 + 811.581’35

СТРУКТУРНО-СЕМАНТИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ МОДИФИКАЦИЙ ИЕРОГЛИФИЧЕСКИХ ЗНАКОВ КИТАЙСКОГО ЯЗЫКА

Н. В. МИХАЛЬКОВА[1)]

[1)]*Минский государственный лингвистический университет, ул. Захарова, 21, 220034, г. Минск, Беларусь*

Аннотация. Рассмотрены изменения графики китайских иероглифов, которые связаны с проведенной в середине XX в. реформой письменности, обусловленной проблемами понимания и использования китайской иероглифики. В результате выполненного этимологического и компонентного анализа определены структурно-семантические особенности модификации традиционных иероглифических знаков. Выявлено, что процесс преобразования наиболее характерен для обозначения тех объектов живой или неживой природы, которые могут выступать конкретизаторами понятий через указание на прототипическое представление о животном, артефакте и т. д. Установлено, что наименьшей модификации подверглись элементы, которые наиболее точно репрезентировали определенные категории лексем, например категорию архитектурно-строительных объектов. Отмечено, что реформа письменности привела к обострению проблемы омонимии в китайском языке. Сделан вывод о том, что китайские лингвисты осторожно подошли к трансформации семантических компонентов иероглифов, что позволило как упростить нерелевантные части знаков, утратившие по сравнению с иными схожими графемами функцию дифференциации, так и сохранить высокую степень мотивированности единиц китайской письменности.

В русской и белорусской языковых картинах мира ворота концептуализируются как границы дозволенного, допустимого в социуме. В обоих языках есть фразеологические единицы, в которых ворота задают рамки приличий: *ни в какие ворота не лезет* ‘очень плохо, никуда не годится’ (ФССРЛЯ, т. 1, с. 171); *не лезе* (*не лезла*) *ні ў якія вароты* ‘вельмі дрэнны, не ўкладваецца ў агульнапрынятыя нормы’ (СФБМ, т. 1, с. 641). Данные фразеологические единицы демонстрируют нарушение установленных социокультурных норм приличия.

В китайской лингвокультуре образ закрытых дверей является, помимо прочего, символом оторванности от реальности: 闭门造车 ‘не принимать во внимание реальное положение вещей, занимаясь делами, полагаться лишь на субъективный взгляд’ (букв. ‘делать телегу при закрытых дверях’) (ZHCYCH, с. 62). Значение данного фразеологизма связано с критической оценкой непрофессиональных действий человека. Работа при закрытых дверях – сложившийся в китайской лингвокультуре эмоционально-образный стереотип субъективизма, неполноты и поверхностности знаний.

В русском и белорусском языковом сознании нерегламентированный вход или выход, осуществляемый не через ворота или двери, кодирует неудачный результат действия (*пришел в дверь, выйдешь в трубу* (БСРП 2010, с. 235)); бесполезность каких-либо действий (*займі чорта ад варот, дык ён цераз плот* ‘гаворыцца пра бескарыснасць якіх-н. дзеянняў, бо яны не дадуць станоўчых вынікаў’ (ТСП, с. 199)); неожиданность появления кого-либо (*ты з варот, а ён цераз плот* ‘кажуць пра таго, хто можа нечакана, непрадбачана аказацца перад кім-н.’ (ТСП, с. 489)); отражает отрицательные качества и неподобающее поведение человека: наглость, самодурство, изворотливость, хитрость (*ворота открыты, а он лезет в подворотню* (БСРП 2010, с. 157); *не хочу в ворота – разбирай забор* (БСРП 2010, с. 157); *выпхнуць яго дзвярыма, то ён акном улезе* (ПП, кн. 2, с. 346); *мы ад варот, а ён чэраз плот* (ПП, кн. 2, с. 306); *мы да варот, а фашыст праз плот* (ПП, кн. 2, с. 546)).

В белорусских фразеологизированных сравнениях со значением бесполезности действия дверь соотносится с антропным кодом культуры через оценочное обозначение *дурак*: *цягаць, насіць як дурань са ступу* (*дзверы*) ‘бяссэнсава, недарэчна’ (СФБМ, т. 1, с. 394); *насіцца як дурань з дзвярмі* (*дзвярыма*) ‘пра недарэчнае перасоўванне з месца на месца грубасткай рэчы; пра празмерную ўвагу да чаго-н. недарэчнага, неістотнага’ (СБНП, с. 140). В белорусских фразеологизмах *шукаць як дзвярэй у полі* ‘пра марнасць пошукаў чаго-н. там, дзе яго і быць не можа’ (СБНП, с. 127); *мёртваму хоць варота падапры* (ПП, кн. 2, с. 417) компонент *дзверы* (*варота*) формирует эталон нецелесообразности или нелепости действий.

Взаимоотношения и взаимодействие людей. Двери являются одним из важнейших интеркультурных символов, кодирующих возможность (невозможность) коммуникации, объединения, совместной деятельности. Так, открытые ворота (двери) в русском и белорусском языках символизируют гостеприимство, желание вступить в контакт и наладить связь: *держать дверь открытой* ‘быть гостеприимным’ (БСРП 2007, с. 175); *для дарагога госця і вароты насцеж* (ПП, кн. 1, с. 404).

Архитектурный код китайской лингвокультуры обнаруживает свою специфику: образ открытой двери репрезентирует социальную стабильность (夜不闭户, 路不拾遗 ‘безопасность и великое спокойствие, хороший общественный порядок’ (букв. ‘на ночь не запирать дверей, не подбирать оброненного на дорогах’) (YYDCD, с. 887)). В семантике данной пословицы воплощены важнейшие для китайской традиционной культуры социальные и духовно-идейные смыслы, значимые для общественного устройства. Образ пословицы восходит к концепции да тун (大同) ‘Великое Единение’, которая была представлена в конфуцианском трактате «Записки о правилах благопристойности» об идеальном обществе: «В эпоху, когда существовал Великий Путь, Поднебесная принадлежала всем. <…> …Злые козни находились под запретом и канули в прошлое, неоткуда было взяться кражам и мятежам, и дверь за пределы дома не нужно было запирать. Это и называется миром Великого Единения (大同—да тун)» [6, с. 34].

Образ закрытых ворот, дверей в трех лингвокультурах символизирует следующие варианты поведения в социуме:

• отказ от потенциальных контактов, лишение каких-либо возможностей: *закрывать*/*закрыть двери* (перед кем-л., для кого-л.) ‘активно препятствуя, лишать кого-л. возможности что-л. сделать, чего-л. добиться’ (ФССРЛЯ, т. 1, с. 409); *от ворот поворот дать* (кому) ‘решительно отказать кому-л. в чем-л.’ (БСРП 2007, с. 102)[12]; *дзверы зачынены*/*зачыніліся* (каму, перад кім) ‘хто-н. не мае свабоднага доступу куды-н., пазбаўлены якіх-н. магчымасцей’ (СФБМ, т. 1, с. 371); *ад варот паварот* (каму) ‘рашуча, катэгарычна адмовіць каму-н. у чым-н.’ (СФБМ, т. 2, с. 167); 拒之门外 ‘отказать в переговорах или в ведении общего дела’ (букв. ‘держать за дверью’) (ZHCYCH, с. 643); 闭门谢客 ‘отвергать контакты с внешним миром’ (букв. ‘запереть двери и отказывать в приеме гостям’) (ZHCYCH, с. 62);

• разрыв уже существующих контактов, нежелание иметь дело с кем-либо: *выбрасывать*/*выбросить*/*выкидывать*/*выкинуть*/*вышвыривать*/*вышвырнуть за ворота* (кого) ‘увольнять, лишать работы, места’ (ФССРЛЯ, т. 1, с. 171); *выкідванне за вароты* (каго)*, выкідваць/выкінуць за вароты* (каго) ‘звальненне з работы, пазбаўленне сродкаў існавання’ (СФБМ, т. 1, с. 241); 扫地出门 ‘избавиться от всего; лишить всего семейного имущества и выгнать из дома с пустыми руками’ (букв. ‘подмести и вымести за дверь’) (ZHCYCH, с. 1005).

В образе закрываемой двери кодируется агрессивное действие по отношению к другому человеку: 关门打狗 ‘окружить противника и нанести удар, не позволять бежать’ (букв. ‘закрыть дверь и избить собаку’) (HYGYYCD, с. 383). Закрытые двери символизируют беспомощность и уязвимость изолированного человека. В основном фразеологизмы, включающие образ закрытой двери, передают представление о нанесении ущерба противнику, например русская пословица *ему по-за дверью лоб набили* (БСРП 2010, с. 235).

В русском и белорусском языковом сознании открытость (закрытость) ворот может служить признаком социального разграничения входящих: *на богатого ворота настежь, на убогого – запор* (БСРП 2010, с. 157); *багатага за варотамі сустракаюць, а ад беднага дзверы запіраюць* (ПП, кн. 1, с. 422). Схожие идеи отражены и в китайской фразеологии, где существует фразеологизм, подчеркивающий необходимость соответствия социального статуса во взаимоотношениях людей: 侯门似海 ‘в древние времена ворота знатных семей, местных органов власти строго охранялись, простому человеку было сложно проникнуть; люди, которые в прошлом были знакомы, но потом из-за большой разницы в статусе отдалились друг от друга и не могут встретиться’ (букв. ‘ворота знатной семьи подобны морю’) (ZHCYCH, с. 494). Использование образа закрытых ворот, которые можно открыть только с помощью подношения, демонстрирует стереотипные представления о ситуации вынужденного подкупа в русской и китайской лингвокультурах: *судейские ворота без серебра не отворяются* (БСРП 2010, с. 157); 进奉门户 ‘заниматься шантажом и вымогательствами с помощью всевозможных ухищрений’ (букв. ‘подношение к дверям’) (ZHCYCH, с. 612). Особенностью китайского языка является наличие метафоры задних дверей: 走后门 ‘использовать личные связи или злоупотреблять служебным положением в корыстных целях’ (букв. ‘идти через заднюю дверь’) (HYGYYCD, с. 1351). В силу того, что задний вход невидим для человеческих глаз, задняя дверь символизирует тайный, обходной путь, который может быть использован для достижения цели.

[12]Данный фразеологизм также имеет значение ‘получение отказа при сватовстве’. Он восходит к древнейшей форме канонизированного упорядоченного поведения – к ритуалу сватовства. При отказе со стороны невесты приехавших сватов не пускали в дом, и они вынуждены были поворачивать от ворот [4, с. 499].

В трех лингвокультурах дверь является символом надежды, ассоциируется с местом, где могут помочь: *стучаться в дверь/двери* (кого, чью) ‘обращаться к кому-л. с просьбой, добиваться чего-л.’ (БСРП 2007, с. 175); *стукацца ў дзверы, стукаць у* (*ва ўсе*) *дзверы* ‘часта звяртацца з просьбамі да каго-н.’ (СФБМ, т. 2, с. 648); 沿门托钵 ‘повсюду просить милостыню’ (букв. ‘ходить от двери до двери и подносить чашку для милостыни’) (ZHCYCH, с. 1362).

Для китайского языкового сознания особенно важно восприятие двери как неотъемлемой части дома, придающей оформленность «своему» пространству. Этим объясняется семантическая роль лексемы 门 ‘дверь’ во фразеологизмах, связанных с семьей и близким окружением: 门内之口 ‘члены семьи’ (букв. ‘члены семьи внутри дверей’) (ZHCYCH, с. 774); 一门百指 ‘семья из десяти человек’ (букв. ‘одна дверь, сто пальцев’) (ZHCYCH, с. 1405).

В русском и китайском языках лексемы *ворота* (*дверь*) символизируют персональное пространство и границу, соблюдение которой способствует формированию хороших взаимоотношений между людьми: *мети всяк перед своими воротами* (БСРП 2010, с. 158); 各家自扫门前雪, 莫管他家屋上霜 ‘каждый занимается своим делом и не вмешивается в чужие дела’ (букв. ‘каждая семья подметает снег у своих ворот, не заботясь об инее на крыше другой семьи’) (YYDCD, с. 255). Данные пословицы метафорически фиксируют необходимость четкого разделения личных границ и обязанностей.

Во фразеологии всех сопоставляемых языков в образе дверей (ворот) кодируются разнообразные отношения между членами семьи и родственниками: *ворота стоят на двух вереях, а дом – на двух головах* (БСРП 2010, с. 157); *з сынам сварыся – за печ бярыся, а з зяцем сварыся да за дзверы бярыся* (ПП, кн. 2, с. 98); 房顶开门 – 六亲不认 ‘человек, который не сходится с людьми, не испытывает привязанности’ (букв. ‘на крыше дома открывать дверь – не признавать близких родственников и друзей’) (XHXHYCD, с. 87).

В русском языковом сознании отражены древнейшие народные представления о воротах, связанные со свадебным обрядом. Ворота выступают как ритуальная граница, на которой сталкиваются две стороны: «свои» и «чужие». Жених, будучи представителем «чужого» мира, должен был преодолеть ворота как одну из первых границ личного пространства невесты, чтобы породниться с ней и стать «своим»: *закладывать*/*заложить* (*заваливать*/*завалить*,*заламывать*/*заломить*) *ворота* ‘в свадебном обряде: закрывать ворота в дом невесты с целью получения выкупа от жениха; преграждать путь невесте к жениху’ (БСРП 2007, с. 102).

Заключение

Проведенный анализ позволил выявить следующие сходства реализации архитектурного кода в русском, белорусском и китайском языках (в рамках отдельной группы фразеологизмов): в трех сопоставляемых лингвокультурах ворота и дверь как средства связи с внешним миром реализуют культурную семантику на основе оппозиции «свой – чужой», выполняют роль символа метрической сферы, метонимически замещают дом, выступают как символ перехода из одного состояния в другое, являются частью образной аналогии «рот – дверь (ворота)».

Результаты проведенного исследования позволяют выявить некоторые национально-культурные различия. Для русского и белорусского языков специфичными являются фразеологизмы, в которых ворота указывают на рамки дозволенного и допустимого в обществе. В китайском языке специфику обнаруживают фразеологические единицы, где ворота (дверь) символизируют способ разрешения трудной ситуации, вхождение человека в духовную сферу, а также ассоциируются с семьей, родом, социальным объединением. Обнаружены закономерности и различия в активности единиц *ворота*, *вароты*, 门/大门 и *двери*, *дзверы*, 门/户/门户 при кодировании реальности во фразеологических картинах мира. Так, значительная часть фразеологизмов русского, белорусского и китайского языков, содержащих образы ворот и дверей, характеризуют взаимоотношения между людьми (33,6; 30 и 27,2 % соответственно). В русском языке компоненты *ворота* и *дверь* наиболее частотны при передаче образного представления о пространственных и временных отношениях (14 %); в белорусском языке – при оценке качеств и поведения человека (19,2 %). В китайской лингвокультуре образы ворот и дверей участвуют преимущественно в кодировании социального статуса (18,7 %), явлений из области духовной культуры и мировоззрения (11,5 %), физической и речевой деятельности (9,4 %), трудных ситуаций и угроз жизни человека (8,4 %). В сопоставляемых языках выявлены следующие бинарные отношения между компонентами фразеологизмов *ворота – подворотня* (*забор*); *дверь – труба*; *вароты – плот*; *дзверы – акно* (во фразеологизмах, содержащих оппозицию правильного и неправильного входа (выхода)); 户 ‘дверь’ – 牖 ‘окно’; 室 ‘комната’ – 户 ‘дверь’, а также контекстные синонимические пары композитов, характеризующих материал и декоративное оформление ворот и дверей: 朱门 ‘красные ворота’ и 绣户 ‘разукрашенные двери’, 蓬户 ‘дверь из соломы’ и 柴门 ‘ворота из хвороста’ (во фразеологизмах, характеризующих социальный статус).

Сокращения

HYGYYCD – 汉语惯用语词典 / 黄斌宏主编. 北京: 商务印书馆国际有限公司, 2009. 1504 页 = Словарь привычных выражений китайского языка / гл. ред. Хуан Биньхун. Пекин : Международ. коммерч. изд-во, 2009 ; **XDHCD** – 现代汉语词典 / 中国社会科学院语言研究所词典编辑室. 7版. 北京: 商务印书馆, 2016. 1800 页 = Словарь современного китайского языка. 7-е изд. Пекин : Коммерч. изд-во, 2016. 1800 с. ; **XHXHYCD** – 新华歇后语词典 / 温端政主编. 北京: 商务印书馆, 2008. 646 页 = Словарь недоговорок-иносказаний / гл. ред. Вэнь Дуаньчжэн. Пекин : Коммерч. изд-во, 2008. 646 с. ; **YYDCD** – 谚语大词典 / 高歌东主编. 2版. 成都: 四川辞书出版社, 2022. 1049 页 = Большой словарь пословиц / гл. ред. Гао Гэдун. 2-е изд. Чэнду : Сычуань, 2022. 1049 с. ; **ZHCYCH** – 中华成语辞海 / 编委会主任陈霞村. 长沙: 湖南教育出版社, 2013. 1796 页 = Китайский фразеологический словарь Цыхай / гл. ред. Чэнь Сяцунь. Чанша : Хунань, 2013. 1796 с. ; **БСРНС** – Большой словарь русских народных сравнений / В. М. Мокиенко, Т. Г. Никитина; под общ. ред. В. М. Мокиенко. М. : Олма медиа групп, 2008. 800 с. ; **БСРП 2007** – Большой словарь русских поговорок / В. М. Мокиенко, Т. Г. Никитина; под общ. ред. В. М. Мокиенко. М. : Олма медиа групп, 2007. 784 с. ; **БСРП 2010** – Большой словарь русских пословиц / В. М. Мокиенко, Т. Г. Никитина, Е. К. Николаева ; под общ. ред. В. М. Мокиенко. М. : Олма медиа групп, 2010. 1023 с. ; **НБТСРЯ** – Новейший большой толковый словарь русского языка / гл. ред. С. А. Кузнецов. СПб. : Рипол-Норинт, 2008. 1534 с. ; **ПП** – Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / рэдкал.: А. С. Фядосік (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : Навука і тэхніка, 1976. 2 кн. ; **СБНП** – Слоўнік беларускіх народных параўнанняў / уклад.: Т. В. Валодзіна, Л. М. Салавей; навук. рэд. В. М. Макіенка. Мінск : Беларус. навука, 2011. 482 с. ; **СФБМ** – Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы : у 2 т. / склад. І. Я. Лепешаў. Мінск : БелЭн, 2008. 2 т. ; **ТСБМ** – Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад. рэд. К. К. Атраховіча. Мінск : БелСЭ, 1978. 5 т. ; **ТСП** – Тлумачальны слоўнік прыказак / І. Я. Лепешаў, М. А. Якалцэвіч. Гродна : ГрДУ, 2011. 695 с. ; **ФССРЛЯ** – Фразеологический словарь современного русского литературного языка : в 2 т. / сост.: А. В. Королькова, А. Г. Ломов, А. Н. Тихонов ; под ред. А. Н. Тихонова. М. : Флинта : Наука, 2004. 2 т.

Библиографические ссылки

1. Гудков ДБ, Ковшова МЛ. *Телесный код русской культуры: материалы к словарю*. Москва: Гнозис; 2007. 285 с.

2. Ляшчынская ВА. Дзверы – сімвальны кампанент фразеалагізмаў архітэктурна-домаўладкавальнага кода культуры. У: Ермакова АМ, рэдактар. *Скарынаўскія традыцыі: гісторыя і сучаснасць. Частка 1*. Гомель: Гомельскі дзяржаўны ўніверстэт імя Ф. Скарыны; 2015. с. 194–202.

3. Стоянова Е. *Метафора сквозь призму лингвокультурной ситуации*. Шумен: Епископ Константин Преславски; 2013. 276 с.

4. Телия ВН, редактор. *Большой фразеологический словарь русского языка. Значение. Употребление. Культурологический комментарий*. Москва: АСТ-пресс книга; 2014. 784 с.

5. Даль ВИ. *Толковый словарь живого великорусского языка. Том 1, А–З*. Москва: Рипол Классик; 2006. 752 с.

6. Сы Баофэн, Хуан Жунхуа, составители. *В этикете ищи опору. «Три книги о ритуале»: «Чжоу ли», «И ли», «Ли цзи»*. Ольховская ЕВ, Кочмина СА, переводчики. Москва: Шанс; 2023. 280 с.

Статья поступила в редколлегию 03.07.2024.
Received by editorial board 03.07.2024.

УДК 81.373.423

СТРУКТУРНО-КВАНТИТАТИВНЫЕ СХОДСТВА И РАЗЛИЧИЯ ОМОПАРАДИГМ В БЕЛОРУССКОМ И ИТАЛЬЯНСКОМ ЯЗЫКАХ (НА МАТЕРИАЛЕ ТОЛКОВЫХ СЛОВАРЕЙ)

В. Б. СКРОМБЛЕВИЧ[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Аннотация. Определены и сопоставлены структурно-квантитативные характеристики омонимических парадигм в белорусском и итальянском языках. Установлены общие и специфические аспекты в подходах к описанию омонимов в лексикографических источниках, выявлены количественные и структурные сходства и различия омопарадигм. В зависимости от характеристик компонента омопарадигмы выделены следующие ее типы: тождественный и смешанный (по количественному параметру); гомогенный и комбинированный (по морфологической принадлежности компонента); графический и фонетико-графический (по форме совпадения структурных единиц). С учетом функционально-стилистических особенностей определены семь типов, пять из которых являются общими для обоих языков.

Ключевые слова: омонимы; омопарадигма; структурный компонент омопарадигмы; квантитативный параметр; лексикография.

СТРУКТУРНА-КВАНТЫТАТЫЎНЫЯ ПАДАБЕНСТВЫ І РАЗЫХОДЖАННІ АМАПАРАДЫГМ У БЕЛАРУСКАЙ І ІТАЛЬЯНСКАЙ МОВАХ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТЛУМАЧАЛЬНЫХ СЛОЎНІКАЎ)

В. Б. СКРАМБЛЕВІЧ[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Анатацыя. Вызначаны і супастаўлены структурна-квантытатыўныя характарыстыкі аманімічных парадыгм у беларускай і італьянскай мовах. Устаноўлены агульныя і спецыфічныя аспекты ў падыходах да апісання амонімаў у лексікаграфічных крыніцах, выяўлены колькасныя і структурныя падабенствы і разыходжанні амапарадыгм. У залежнасці ад характарыстык кампанента вылучаны наступныя тыпы амапарадыгмы: тоесны і змешаны (па колькасным параметры); гамагенны і камбінаваны (па марфалагічнай прыналежнасці кампанента); графічны і фанетыка-графічны (па форме супадзення структурных адзінак). З улікам функцыянальна-стылістычных асаблівасцей вызначаны сем тыпаў, пяць з якіх з'яўляюцца агульнымі для абедзвюх моў.

Ключавыя словы: амонімы; амапарадыгма; структурны кампанент амапарадыгмы; квантытатыўны параметр; лексікаграфія.

Образец цитирования:
Скрамблевіч ВБ. Структурна-квантытатыўныя падабенствы і разыходжанні амапарадыгм у беларускай і італьянскай мовах (на матэрыяле тлумачальных слоўнікаў). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2025;1:76–89. EDN: BJRTPB

For citation:
Skromblevich VB. Structural and quantitative similarities and differences of homoparadigms in Belarusian and Italian languages (based on the material of explanatory dictionaries). *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2025;1:76–89. Belarusian. EDN: BJRTPB

Автор:
Валерия Болеславовна Скромблевич – соискатель кафедры русского языка филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор И. Э. Ратникова.

Author:
Valeria B. Skromblevich, competitor at the department of Russian language, faculty of philology.
lera2304@gmail.com

STRUCTURAL AND QUANTITATIVE SIMILARITIES AND DIFFERENCES OF HOMOPARADIGMS IN BELARUSIAN AND ITALIAN LANGUAGES (BASED ON THE MATERIAL OF EXPLANATORY DICTIONARIES)

V. B. SKROMBLEVICH[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Abstract. The structural and quantitative characteristics of homonymous paradigms in Belarusian and Italian languages are defined and compared. The general and specific aspects of approaches to the description of homonyms in lexicographical sources are specified, quantitative and structural similarities and differences between homoparadigms are revealed. Depending on the characteristics of the component of homoparadigm, the following types were identified: identical and mixed (according to the quantitative parameter); homogeneous and combined (according to the morphological affiliation of the component); graphical and phonetical-graphical (according to the form of coincidence of structural units). According to functional and stylistic features, seven types were identified, five of which are common to both languages.

Keywords: homonyms; homoparadigm; structural component of homoparadigm; quantitative parameter; lexicography.

Уводзіны

Пытанні аманіміі ўсё часцей трапляюць у цэнтр увагі не толькі лексіколагаў, але і лексікографаў, паколькі адсутнасць тоеснага адлюстравання структуры аманімічнай парадыгмы ў слоўніках і адпаведна разыходжанні слоўнікавых артыкулаў – праблема не толькі тэарэтычная, але і практычная, звязаная з адэкватным разуменнем лексічных адзінак і іх выкарыстаннем у камунікацыі.

Традыцыйна ў лінгвістыцы тэрмін «парадыгма» суадносіцца з марфалогіяй і фаналогіяй. Аднак прызнанне таго, што парадыгматычныя адносіны пранізваюць усю моўную сістэму, дазваляе выкарыстоўваць гэты тэрмін таксама ў адносінах да сінтаксісу і лексікалогіі: «Сістэмны характар слоўнікавага складу мовы выяўляецца ў першую чаргу ў размеркаванні слоў па некаторых семантычна аб'яднаных лексічных групах – лексіка-семантычных парадыгмах. Кожнае слова мовы ўваходзіць у пэўную лексіка-семантычную парадыгму, пры гэтым, часцей за ўсё ў сілу сваёй мнагазначнасці, не толькі ў адну»[1*] [1, с. 48]. Усе адзінкі лексічнай парадыгмы атаясамліваюцца па якой-небудзь істотнай і асноўнай прымеце, уласцівай усім без выключэння членам шэрага, і супрацьпастаўляюцца па іншых (дыферэнцыяльных) прыметах [2].

У граматыцы парадыгма суадносіцца з пэўнай граматычнай катэгорыяй, якая з'яўляецца сродкам рэалізацыі граматычнага значэння. У лексіцы тэрмін «парадыгма» неабходна разглядаць у сувязі з паняццем пэўнай лексічнай катэгорыі, якая аб'ядноўвае клас аднастайных лексічных адзінак. Амонімы не існуюць у мове адасоблена, слова трапляе ў катэгорыю амонімаў толькі ў тым выпадку, калі яно суадносіцца з якім-небудзь іншым словам ці словамі, якія маюць аднолькавую форму (супадаюць па напісанні і (або) вымаўленні), але адрозніваюцца па значэнні. Такім чынам, асноўнай структурнай адзінкай аманіміі з'яўляецца не асобны амонім, а група аманімічных слоў. Як адзначае Т. І. Пятрова, толькі ў рамках амагрупы праяўляецца аманімічнасць слоў[2*]. У навуковай літаратуры сустракаюцца розныя найменні для абазначэння такіх груп: аманімічныя гнёзды (Т. Б. Назарава, Л. М. Дударова), аманімічныя ланцужкі (І. У. Роднева), аманімічныя радкі, або аманімічныя групы (Ю. П. Касцючэнка, В. М. Кім, Т. І. Пятрова, Л. У. Малахоўскі). У нашай працы аб'яднанне аманімічных адзінак мы будзем абазначаць тэрмінам «амапарадыгма» (далей – АП), пад якім разумеецца «сістэмная групоўка аднолькавых па фанетычнай/графічнай форме слоў, семантычна супрацьпастаўленых» [3, с. 252].

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляюцца АП сучаснай беларускай і італьянскай моў, мэтай даследавання – выяўленне і супастаўленне структурна-квантытатыўных характарыстык АП у беларускай і італьянскай мовах.

Актуальнасць супастаўляльнага вывучэння АП звязана ў першую чаргу з надзённымі патрабаваннямі двухмоўнай лексікаграфіі. Па прычыне наяўнасці разыходжанняў у кваліфікацыі значэнняў колькасць элементаў АП адрозніваецца. Так, некаторыя лексемы ў адным слоўніку могуць быць варыянтамі полісемічнага слова, а ў іншым – амонімамі. У той жа час адна і тая ж лексема можа быць зафіксавана як

[1*]Тут і далей пераклад наш. – *В. С.*

[2*]*Петрова Т. И.* Структурно-семантическая характеристика лексической омонимии в современном английском языке : дис. … канд. филол. наук : 10.02.04. Ростов н/Д, 1983. С. 25.

адназначная ў адным слоўніку і як мнагазначная ў іншым (семантычнае адрозненне, якое адзін слоўнік падае як выпадак полісеміі, іншы прадстаўляе як адценне значэння). З тэарэтычнага пункту гледжання вынікі працы могуць спрыяць вывучэнню працэсаў камунікацыі і ўспрымання гаворкі, даследаванням у галіне псіхалінгвістыкі і машыннай апрацоўкі тэксту. У практычным плане яны стануць карыснымі для лексікаграфіі, паколькі паспрыяюць больш якаснаму адбору слоў і рацыянальнаму падыходу да складання слоўнікавага артыкула. Акрамя таго, вынікамі даследавання можна будзе карыстацца пры ўдасканаленні методыкі выкладання замежных моў.

Матэрыялы і метады даследавання

Пры выяўленні аманімічных парадыгм мы прытрымліваліся метадалогіі Л. У. Малахоўскага, прыменена для апісання структурных асаблівасцей амагрупы ў англійскай мове. Пошук амагруп у межах графічных амонімаў ажыццяўляўся на матэрыяле слоўнікаў, якія максімальна поўна адлюстроўваюць склад сучаснай англійскай мовы і змяшчаюць невялікую колькасць устарэлых, вузкаспецыяльных і дыялектных слоў. Размежаванне аманіміі і полісеміі адпавядала даным слоўнікавых артыкулаў, а ў выпадках іх несупадзення перавага аддавалася крыніцам, дзе прадстаўлены больш дыферэнцыраваны падыход [4, с. 162–163].

Для таго каб выявіць магчымыя тыпы АП, а таксама прасачыць разыходжанні ў падыходах да апісання амонімаў у беларускіх лексікаграфічных крыніцах, мы звярнуліся да наступных выданняў: ТСБМ, ТСБЛМ 2002, ТСБЛМ 2022.

У якасці крыніц моўнага матэрыялу для структурна-квантытатыўнага апісання АП італьянскай мовы былі выкарыстаны GDIH, DLIM, DLIT. Улічваючы разнастайнасць тлумачальных слоўнікаў італьянскай мовы, пры выбары крыніц для нашага даследавання мы звярнуліся да выданняў, рэкамендаваных Акадэміяй Круска (Accademia della Crusca)[3*], якая каардынуе лексікаграфічную дзейнасць і прапаганду італьянскай мовы ў Італіі.

Вывучэнне беларускай і італьянскай аманімікі ажыццяўлялася ў межах фанетыка-графічных амонімаў (лексічных, лексіка-граматычных і граматычных). З мэтай правядзення папярэдняга параўнальнага структурна-квантытатыўнага аналізу АП была зроблена выбарка ў 2000 беларускіх і італьянскіх АП (па 1000 для кожнай мовы).

Размежаванне аманіміі і полісеміі грунтуецца на даных усіх шасці слоўнікаў. У беларускіх крыніцах гэтыя даныя ў асноўным супадаюць, а ў італьянскіх даволі часта адрозніваюцца. У нашым даследаванні ўлічваліся ўсе выпадкі такіх супадзенняў і несупадзенняў, што дазволіла максімальна падрабязна прадставіць асаблівасці АП абедзвюх моў.

Амонімы-дзеепрыметнікі ўлічваліся толькі ў тых выпадках, калі яны ўваходзілі ў склад АП разам з прыметнікам або назоўнікам. Улік АП, якія складаюцца выключна з амонімаў-дзеепрыметнікаў, не з'яўляецца, на нашу думку, істотным, паколькі дубліруе аднайменныя дзеяслоўныя АП. Напрыклад, АП дзеясловаў *збаўляцца*, *запусціць*, *падаслаць*, *перахаваць* змяшчаюць у сабе АП дзеепрыметнікаў *збаўлены*, *запушчаны*, *падасланы*, *перахаваны.* У ТСБЛМ 2002 і ТСБЛМ 2022 такія амонімы не выносяцца ў асобныя слоўнікавыя артыкулы, яны могуць указвацца непасрэдна ў артыкуле, прысвечаным адпаведнаму дзеяслову. У ТСБМ амонімы-дзеепрыметнікі вылучаюцца асобна, аднак пры іх тлумачэнні даецца спасылка на дзеяслоў: *перахаваны*[1] *дзеепрым. зал. ад перахаваць*[1]; *перахаваны*[2] *дзеепрым. зал. ад перахаваць*[2] (ТСБМ, т. 1, с. 232).

Даследаванне квантытатыўных характарыстык амонімаў прадугледжвае выяўленне іх агульнай колькасці і долі ў слоўнікавым складзе, супастаўленне колькасці амонімаў у розных мовах, размеркаванне амонімаў па часцінах мовы, вызначэнне залежнасці паміж аманіміяй, сярэдняй даўжынёй слова і яго ўжываннем. Супастаўляльнае вывучэнне квантытатыўных асаблівасцей амонімаў на матэрыяле рускай і англійскай моў прадстаўлена ў працах О. Есперсена, В. Скіта, А. Я. Шайкевіча, І. С. Тышлера, Ю. П. Касцючэнка і інш. Аднак вынікі колькаснага аналізу амонімаў у розных аўтараў не супадаюць па прычынах разнастайнасці крытэрыяў вылучэння амонімаў (некаторыя даследчыкі ўлічваюць выключна графічныя або фанетычныя амонімы) і дакладнага разумення структуры аманімічнага рада і паслядоўнага размежавання адзінак розных узроўняў (напрыклад, пры падліку амографаў могуць улічвацца лексічныя і граматычныя амонімы, а пры падліку фанетыка-графічных і фанетычных амонімаў – толькі граматычныя амонімы). Так, агульная колькасць амонімаў у англійскай мове складае, па розных меркаваннях, 1800 (В. Скіт), 2947 (А. Я. Шайкевіч), 4800 (Ю. П. Касцючэнка), 5096 (І. С. Тышлер) слоў [4, с. 160].

[3*] Акадэмія заснавана ў 1585 г. у Фларэнцыі групай лінгвістаў і філолагаў. Мэтай установы было ўпарадкаванне італьянскай літаратурнай мовы на аснове тасканскага дыялекту, вызваленне мовы ад неалагізмаў, рэгіяналізмаў, тэхнічнай тэрміналогіі (менавіта таму эмблема акадэміі – сіта для мукі, якое адсейвае вотруб'е). Галоўным дасягненнем установы з'яўляецца выданне ў 1612 г. слоўніка акадэмікаў Круска (Vocabolario degli Accademici della Crusca), які стаў узорам для еўрапейскіх лексікографаў.

На думку Л. У. Малахоўскага, пры колькасным вывучэнні з'явы аманіміі немагчыма атрымаць дакладны вынік без дэталёвага вывучэння структурных характарыстык аманімікі. Як адзначае навуковец, аманімічныя радкі ўзроўню лексем (амагрупы) і ўзроўню словаформ (амакамплекты) значна адрозніваюцца па сваёй лексіка-граматычнай структуры. Структура аманімічнага радка складаецца з амасегментаў і гіперлексем. Пад амасегментамі Л. У. Малахоўскі разумее словы, якія адносяцца да адной і той жа часціны мовы, але адрозніваюцца па лексічным значэнні. Гіперлексемы – гэта словы, якія маюць агульную лексічную семантыку, але адносяцца да розных часцін мовы. Разгледзім у якасці прыклада амагрупу *beetle*: *beetle*[1], *наз. тэхн.* 'трамбоўка, кувалда'; *beetle*[2], *дзеясл.* 'трамбаваць'; *beetle*[3], *наз.* 'жук'; *beetle*[4], *дзеясл.* 'навісаць'; *beetle*[5], *прым.* 'навіслы'. Згодна з Л. У. Малахоўскім дадзеная амагрупа складаецца з трох амасегментаў (субстантыўны, дзеяслоўны і ад'ектыўны) і трох гіперлексем (аб'ядноўвае словы *beetle*[1] і *beetle*[2] (з блізкім лексічным значэннем); змяшчае семантычна адасобленае слова *beetle*[3]; уключае блізкія па лексічнай семантыцы словы *beetle*[4] і *beetle*[5] [4, с. 89–91].

Такі падыход да апісання амонімаў асобна ўзятай мовы дазваляе прааналізаваць іх з пункту гледжання рознаўзроўневых сістэмных сувязей. Аднак для супастаўлення дзвюх і болей моў прымяніць яго даволі цяжка, асабліва калі параўноўваюцца аналітычная і сінтэтычная мовы. Мы прапануем сваю мадэль апісання амонімаў, якая можа быць выкарыстана пры раглядзе некалькіх моў з улікам характарыстык структурнага кампанента АП. Структурны кампанент АП вызначаецца словамі-амонімамі, пазначанымі ў слоўніках надрадковай лічбай у канцы загаловачнага слова і вынесенымі ў асобны самастойны слоўнікавы артыкул.

Вынікі і іх абмеркаванне

Для структурнага апісання АП мы паслядоўна разглядаем іх кампаненты ў залежнасці ад тыпалогіі амонімаў (табл. 1 і 2)[4*]. Такая сістэматызацыя дазваляе нам наглядна паказаць агульныя і спецыфічныя аспекты ў падыходах укладальнікаў тлумачальных слоўнікаў да з'явы аманіміі, а таксама выявіць прычыны несупадзенняў у межах як адной, так і абедзвюх разглядаемых моў.

Пры класіфікацыі амонімаў даследчыкі ў асноўным улічваюць наступныя аспекты: 1) аднолькавае або рознае напісанне; 2) поўнае ці частковае супадзенне марфалагічных форм амонімаў; 3) моўны ўзровень амонімаў; 4) этымалогію[5*]. Гэтага прынцыпу (з некаторымі ўдакладненнямі) мы будзем прытрымлівацца пры класіфікацыі структурных элементаў АП. У залежнасці ад характарыстык амонімаў мы прапануем класіфікаваць структурны кампанент АП па наступных параметрах: колькасці слоўнікавых артыкулаў, у якіх адлюстраваны амонімы (квантытатыўны); характарыстыкі амонімаў па сферы (характары) ужывання і стылістычнай афарбоўцы (функцыянальна-стылістычны); прыналежнасці амонімаў да той ці іншай часціны мовы (марфалагічны); форме супадзення (графічная, фанетыка-графічная) амонімаў (фармальны).

Табліца 1

Структура АП *бар*

Table 1

The structure of the homoparadigm *бар*

Крыніца	Параметры			
	Колькасць слоўнікавых артыкулаў	Сфера ўжывання, стылістычная афарбоўка амонімаў	Прыналежнасць амонімаў да пэўнай часціны мовы	Форма супадзення амонімаў
ТБСМ	4	Нейтральная Спецыяльная Нейтральная Спецыяльная	Назоўнікі	Фанетыка-графічная
ТСБЛМ 2002	2	Нейтральная Спецыяльная	Назоўнікі	Фанетыка-графічная
ТСБЛМ 2022	2	Нейтральная Спецыяльная	Назоўнікі	Фанетыка-графічная

[4*]Разглядаемая ў табл. 2 АП *basio* мае наступныя значэнні: *basio*[1] 'пацалунак'; *basio*[2] '1) 'цяністы, звернуты на поўнач'; 2) 'заладнаватае цяністае месца, звернутае на поўнач'.

[5*]У тлумачальных слоўніках італьянскай мовы этымалогія слоў адлюстроўваецца, у тлумачальных слоўніках беларускай мовы этымалагічны крытэрый прасачыць немагчыма. Як адзначаюць складальнікі, задача тлумачальнага слоўніка – паказаць нормы сучаснага словаўжывання (ТСБЛМ 2022, т. 1, с. 7), таму звесткі пра паходжанне слоў прыводзяцца толькі ў выключных выпадках, каб больш дакладна растлумачыць значэнне слова (ТСБЛМ 2002, с. 7). Па прычыне немагчымасці правесці параўнальны аналіз па этымалагічным крытэрыі мы не ўлічваем яго. Пад увагу бяруцца толькі тыя крытэрыі, якія прысутнічаюць у слоўніках абедзвюх моў (напрыклад, стылістычная афарбоўка і сфера (характар) ужывання згодна з паметамі).

Табліца 2

Структура АП *bacio*

Table 2

The structure of the homoparadigm *bacio*

Крыніца	Параметры			
	Колькасць слоўнікавых артыкулаў	Сфера ўжывання, стылістычная афарбоўка амонімаў	Прыналежнасць амонімаў да пэўнай часціны мовы	Форма супадзення амонімаў
GDIH	2	Нейтральная Рэдкаўжывальная	Назоўнікі	Графічная
DLIM	2	Нейтральная Дыялектная	Назоўнікі	Графічная
DLIT	Полісемант	–	–	–

З а ў в а г а. Па прычыне разыходжанняў у выяўленні значэнняў колькасць элементаў АП адрозніваецца. Некаторыя адзінкі ў адным слоўніку могуць быць варыянтамі полісемічнага слова, а ў іншым – амонімамі. У той жа час адна і тая ж лексема можа быць адназначнай у адным слоўніку і многазначнай у іншым (семантычнае адрозненне, якое адзін слоўнік падае як выпадак полісеміі, іншы прадстаўляе як адценне значэння).

Разгледзім падрабязней разнавіднасці АП у залежнасці ад асаблівасцей структурнага кампанента.

Па колькасці слоўнікавых артыкулаў АП можна падзяліць на двухкампанентныя, трохкампанентныя, чатырохкампанентныя, многакампанентныя (у склад апошніх уваходзяць пяць і болей кампанентаў). Адзначым, што калі разглядаць кожную крыніцу асобна, то максімальная колькасць кампанентаў у адной АП складае для беларускай мовы 6 адзінак, для італьянскай мовы – 7. З улікам таго што колькасныя характарыстыкі АП у розных слоўніках адрозніваюцца, то пры супольным аналізе лексікаграфічных крыніц АП можна раздзяліць на тоесныя (колькасць кампанентаў аднолькавая для ўсіх крыніц) і змешаныя (у адной або некалькіх крыніцах колькасць кампанентаў для адной і той жа АП адрозніваецца). І ў беларускай, і ў італьянскай мовах максімальная колькасць кампанентаў у тоесных АП складае 5 АП (*лава*, *смаліць*, *стан*, *lasso*). У італьянскіх слоўніках змешаныя АП могуць істотна адрозніваца. Так, парадыгма *berta* ў GDIH і DLIT складаецца з 5 адзінак, а ў DLIM – з 7 адзінак; парадыгма *ronco* ва ўсіх трох крыніцах мае розны склад: у GDIH яна ўтрымлівае 3 кампаненты, у DLIM – 6, у DLIT – 2 кампаненты. У беларускай мове ў змешаных АП розніца ў колькасці кампанентаў не перавышае, як правіла, 1 адзінку. Напрыклад, АП *каток* мае 3 амонімы ў ТСБМ, 4 амонімы ў ТСБЛМ 2002, 4 амонімы ў ТСБЛМ 2022, а АП *тур* утрымлівае 3 амонімы ў ТСБМ, 2 амонімы ў ТСБЛМ 2002, 3 амонімы ў ТСБЛМ 2022. У табл. 3 прадстаўлены тыпы АП па колькасці кампанентаў. Агульная колькасць структурных адзінак у складзе АП дазволіць вылучыць сярэднюю колькасць амонімаў у межах адной АП.

Табліца 3

Тыпалогія АП па колькасці кампанентаў

Table 3

Typology of homoparadigms according to the number of components

Тып АП па колькасці кампанентаў	Колькасць АП дадзенага тыпу				Агульная колькасць кампанентаў у складзе АП дадзенага тыпу			
	Абсалютная, адз.		Адносная, %		Абсалютная, адз.		Адносная, %	
	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова
Двухкампанентная	934	875	93,4	87,5	1868	1750	90,15	81,28
Трохкампанентная	34	35	3,4	3,5	102	105	4,93	4,88
Чатырохкампанентная	7	1	0,7	0,1	28	4	1,35	0,19
Змешаная	25	89	2,5	8,9	74	294	3,57	13,65
Усяго	*1000*	*1000*	*100*	*100*	*2072*	*2153*	*100*	*100*

У большасці выпадкаў аб'ём АП у абедзвюх мовах роўны двум кампанентам. Найменш распаўсюджаным тыпам з'яўляецца чатырохкампанентная АП. У сярэднім на адну АП у беларускай мове прыходзіцца 2,07 амоніма, у італьянскай мове – 2,15. Колькасны дыяпазон амонімаў у АП змешанага тыпу для беларускай мовы вар'іруецца ў межах 2–3 або 3–4 кампанентаў. У італьянскай мове ў межах адной АП колькасць амонімаў можа значна адрозніваца: 2–6–2, 3–4–2, 2–4–2, 5–7–5.

У залежнасці ад памет, якімі амонімы суправаджаюцца ў слоўніках, можна вылучыць наступныя тыпы АП:

• АП 1, дзе ўсе кампаненты згодна са слоўнікам з'яўляюцца стылістычна нейтральнымі і неабмежаванымі ў выкарыстанні (не маюць спецыяльных памет);

• АП 2, дзе адзін або ўсе кампаненты адносяцца да кніжнага стылю мовы (параўнаем пометы: бел. *кніжн*., іт. *LE* або *lett*. (*letterario* 'кніжны'));

• АП 3, дзе адзін або ўсе кампаненты характэрны для размоўнага стылю мовы (памета *разм*.);

• АП 4, дзе адзін або ўсе кампаненты з'яўляюцца дыялектызмам(і) або рэгіяналізмам(і) (аб гэтым сведчаць такія пометы, як *абл*., *RE* або *region*. (*regionale* 'рэгіянальнае'), *DI* або *dial*. (*dialettale* 'дыялектнае'));

• АП 5, дзе адзін або ўсе кампаненты абмежаваны колам прафесійнага або спецыяльнага (тэхнічнага, навуковага і пад.) ужывання (пометы *спец*., *TS* (*tecnico-scientifico* 'навукова-тэхнічнае'));

• АП 6, дзе адзін або ўсе кампаненты з'яўляюцца архаізмам(і) або ўстарэлым(і) словам(і) (пометы *уст*., *OB* (*obsoleto* 'устарэлы'));

• АП 7, дзе адзін або ўсе кампаненты АП адносяцца да «рэдкіх слоў, нягледзячы на тое, што яны ўсё яшчэ часта сустракаюцца ў тэкстах і гаворках XX ст.» (DLIM) (параўнаем пометы *raro*, *BU* (*basso uso*) 'рэдкі, рэдкаўжывальны', non comune 'рэдкасны'). Тып вылучаецца толькі на аснове італьянскай лексікаграфіі.

У табл. 4 прадстаўлены вынікі квантытатыўнага аналізу груп АП па функцыянальна-стылістычных асаблівасцях іх кампанентаў.

Табліца 4

Квантытатыўны аналіз груп АП
па функцыянальна-стылістычных асаблівасцях іх кампанентаў

Table 4

Quantitative analysis of homoparadigm groups
by functional and stylistic features of their components

Тып групы АП	Колькасць АП дадзенага тыпу				Аб'ём АП дадзенага тыпу па колькасці кампанентаў					
	Абсалютная, адз.		Адносная, %		Абсалютная, адз.			Адносная, %		
	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова	Колькасць кампанентаў	Беларуская мова	Італьянская мова	Колькасць кампанентаў	Беларуская мова	Італьянская мова
АП 1	627	130	63,02	12,97	2	601	126	2	60,39	12,56
					3	23	3	3	2,31	0,31
					4	3	1	4	0,30	0,11
АП 2	0	95	0	9,48	2	0	82	2	0	8,18
					3	0	10	3	0	0,99
					4	0	3	4	0	0,29
АП 3	239	0	24,02	0	2	226	0	2	22,72	0
					3	10	0	3	1,01	0
					4	3	0	4	0,30	0
АП 4	13	152	1,32	15,16	2	11	117	2	1,11	11,67
					3	1	30	3	0,10	2,99
					4	1	3	4	0,10	0,29
					5	0	1	5	0	0,11
					6	0	1	6	0	0,11

Заканчэнне табл. 4
Ending of the table 4

Тып групы АП	Колькасць АП дадзенага тыпу				Аб'ём АП дадзенага тыпу па колькасці кампанентаў					
	Абсалютная, адз.		Адносная, %		Абсалютная, адз.			Адносная, %		
	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова	Колькасць кампанентаў	Беларуская мова	Італьянская мова	Колькасць кампанентаў	Беларуская мова	Італьянская мова
АП 5	100	522	10,02	52,07	2	87	447	2	8,74	44,59
					3	9	61	3	0,90	6,09
					4	4	11	4	0,40	1,09
					6	0	2	6	0	0,19
					7	0	1	7	0	0,11
АП 6	26	181	2,62	18,06	2	25	153	2	2,52	15,26
					3	1	21	3	0,1	2,09
					4	0	5	4	0	0,49
					6	0	1	6	0	0,11
					7	0	1	7	0	0,11
АП 7	0	163	0	16,26	2	0	141	2	0	14,06
					3	0	18	3	0	1,79
					4	0	2	4	0	0,19
					5	0	1	5	0	0,11
					6	0	1	6	0	0,11
Усяго	*1005*	*1243*	*101*	*124*	–	*1005*	*1243*	–	*101*	*124*

Заўвага. Некаторыя амапарадыгмы ўключаюць дзве і болей памет, адпаведна яны ўваходзяць адначасова ў дзве або тры групы. У такіх выпадках адна амапарадыгма ўлічвалася некалькі разоў.

Для беларускай мовы перш за ўсё характэрны АП, у якія ўваходзяць стылістычна нейтральныя амонімы (63,02 %). Доля размоўных слоў у АП складае 24,02 %. Доля тэрмінаў у АП – 10,02 %. Меншую частку складаюць АП з устарэлымі і дыялектнымі словамі. Словы, што адносяцца да публіцыстычнага стылю, у АП выяўлены не былі. Адзначым, што пры вылучэнні тыпаў АП мы сутыкнуліся з праблемай розных лексікаграфічных традыцый у вылучэнні стылістычных асаблівасцей слоў. Так, напрыклад, памета *разм.* («шырокі пласт слоў або іх паасобных значэнняў, ужыванне якіх абмежавана гутарковай мовай, вуснай ці пісьмовай» (ТСБМ, т. 1, с. 10)) уласціва толькі для беларускіх слоўнікаў. Паметы *raro*, *BU* ('рэдкі, рэдкаўжывальны') прымяняюцца выключна ў італьянскай мове і не маюць дакладнага аналага ў беларускай мове. Дадзеныя асаблівасці тлумачаць адсутнасць вышэйзгаданых тыпаў у адной з дзвюх моў.

У італьянскай мове найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца АП, якія маюць у складзе тэрміны (52,07 %). Нават італьянскія даследчыкі ў галіне лексікаграфіі адзначаюць, што сучасныя тлумачальныя слоўнікі італьянскай мовы з'яўляюцца «вольнымі ад выканання строгіх тасканскіх прынцыпаў» [5, p. 104] і становяцца своеасаблівым «калодзежам навуковых тэрмінаў» [5, p. 5]. Такі вынік можна лічыць заканамерным. Доля стылістычна нейтральных амонімаў, якія складаюць большую частку беларускіх АП, у італьянскай мове складаюць толькі 12,97 % выпадкаў.

Нязначная прысутнасць многакампанентных АП у беларускай мове пры колькасным аналізе іх кампанентаў па функцыянальна-стылістычных асаблівасцях дазваляе выказаць меркаванне, што прычынай узнікнення амонімаў у беларускай мове ў большасці выпадкаў з'яўляецца этымалагічны фактар – распад полісеміі. У італьянскай мове сітуацыя крыху іншая. Амаль у кожным тыпе прысутнічаюць многакампанентныя АП (гл. табл. 4), што можа сведчыць пра разнастайнасць шляхоў узнікнення аманіміі, дзе стылістычныя афарбоўкі і канатацыі адыгрываюць больш значную ролю.

Асобна разгледзім такую характарыстыку кампанентаў АП, як паходжанне. Генетычныя прыметы адзінак АП (дакладней, колькасныя параметры гэтых прымет) з'яўляюцца істотнымі для вызначэння ролі запазычання ў фарміраванні аманіміі. Параўнаем паметы, якія ўказваюць крыніцу запазычання амонімаў у нашым матэрыяле: араб., англ., іт., кіт., ням.; ar. (*arabo* 'арабскае'), ingl. (*inglese* 'англійскае'), ted. (*tedesco*

‘нямецкае’), rum. (*rumeno* ‘румынскае’), portogh. (*portoghese* ‘партугальскае’). У італьянскіх слоўніках сустракаецца ўказанне на статус запазычання *ES* (*esotismo* ‘экзатызм’). Запазычанні з’яўляюцца даволі рэдкай прычынай узнікнення амонімаў і ў беларускай, і ў італьянскай мовах (адносная колькасць АП з запазычанымі амонімамі – 5,4 і 2,6 % адпаведна). У склад АП беларускай мовы ўваходзяць запазычанні з французскай (53,7 %), нямецкай (18,51 %), англійскай (12,96 %), грэчаскай (11,1 %), італьянскай (5,55 %), польскай, лацінскай і іспанскай (3,7 %) моў. Знойдзена па адным выпадку запазычанняў з турэцкай (*каюк*[1] ‘канец, пагібель’; *каюк*[2] тур. ‘рачное вёсла – паруснае грузавое судно’ (ТСБМ, т. 5, кн. 2, с. 267)), чэшскай (*полька*[1] ‘гл. палякі’; *полька*[2] ад. чэш. *polka* ‘танец у хуткім тэмпе, а таксама музыка да гэтага танца’; *полька*[2] ‘мужчынская стрыжка, пры якой валасы на скронях і на патыліцы злёгку падстрыгаюцца’ (ТСБМ, т. 4, с. 290)), персідскай (*туман*[1] ‘злучэнне драбнейшых кропак вады або ледзяных крышталікаў у прыземных слаях атмасферы, што робіць паветра непразрыстым’; *туман*[2] перс. ‘іранская залатая манета, якая была ў абароце да 1392 г.’ (ТСБМ, т. 5, кн. 1, с. 548–549)) і старажытнаяўрэйскай (*хедар*[1] англ. *header* ‘рабочая частка збожжаўборачнага камбайна’; *хедар*[2] ст.-яўр. ‘яўрэйская пачатковая рэлігійная школа для хлопчыкаў’ (ТСБМ, т. 5, кн. 2, с. 191)) моў. У шэраг АП уваходзяць запазычанні з дзвюх або трох моў. Напрыклад, АП *фон* уключае запазычанні з трох моў: французскай (*фон*[1] ад фр. *fond* ‘асноўны колер, тон, на якім пішацца карціна’), грэчаскай (*фон*[2] ад грэч. *phoōnē* ‘шум, трэск’) і нямецкай (*фон*[3] ад ням. *von* ‘часціца перад нямецкімі прозвішчамі, якая паказвае на дваранскае паходжанне’) (ТСБМ, т. 5, кн. 2, с. 144–145). У італьянскіх АП 73,07 % запазычанняў з’яўляюцца англійскімі і 7,69 % – арабскімі. У межах прааналізаваных АП выяўлены па адным выпадку запазычанняў з партугальскай (*boato*[1] ‘гул, грохат’; *boato*[2] ‘экзатызм партуг., неабгрунтаваныя чуткі, якія па-майстэрску і тэндэнцыйна распаўсюджваюцца’), румынскай (*braga*[1] ‘злучальны элемент’; *braga*[2] ‘экзатызм рум., гатунак піва з нізкім утрыманнем алкаголю’), японскай (*buto*[1] ‘бутус скарпіён’; *buto*[2] ‘экзатызм яп., сучасны японскі танец’), польскай (*rada*[1] ‘натуральны або штучны заліў, марскі ці азёрны, даволі прасторны і ахаваны, прызначаны для стаянкі або захоўвання караблёў’; *rada*[2] ‘экзатызм пол., у перыяд XVIII–XX стст. калегіяльны палітычны і адміністратыўны орган Польшчы і Украіны’) і французскай (*rai*[1] ‘прамяні, асабліва сонечныя’; *rai*[2] ‘музыкальны жанр, які характарызуецца зліццём традыцыйнай алжырскай музыкі з поп-музыкай’) моў (DLIM).

Па прыналежнасці амонімаў да пэўнай часціны мовы можна вылучыць наступныя тыпы АП: гамагенны (кампаненты АП адносяцца да адной і той жа часціны мовы) і камбінаваны (кампаненты АП адносяцца да розных часцін мовы). У табл. 5 сімвалам «+» адзначаны знойдзеныя ў абедзвюх мовах тыпы супадзенняў кампанентаў АП у залежнасці ад марфалагічнай прыналежнасці.

Табліца 5

Тыпы супадзенняў кампанентаў амапарадыгмы па марфалагічнай прыналежнасці

Table 5

Types of matches of homoparadigm components according to morphological affiliation

Часціна мовы	Назоўнік	Прыметнік	Дзеяслоў	Выклічнік	Прыслоўе	Займеннік	Прыназоўнік	Злучнік	Часціца	Лічэбнік
Назоўнік	+									
Прыметнік	+	+								
Дзеяслоў	+	+	+							
Выклічнік	+	+	–	–						
Прыслоўе	+	+	–	+	+					
Займеннік	+	+	–	–	–	–				
Прыназоўнік	+	–	–	+	+	–	–			
Злучнік	+	+	–	–	+	–	–	–		
Часціца	+	–	–	–	–	+	–	+	–	
Лічэбнік	–	–	+	–	–	–	–	–	–	–

З а ў в а г а. Парадак перасячэння форм не з’яўляецца для нас істотным, таму, каб пазбегнуць дубліравання форм супадзенняў кампанентаў АП, мы ставілі адзнакі толькі ў адной палове табліцы, якая знаходзіцца пад тлустай лініяй.

У ходзе аналізу было ўстаноўлена, што структура АП па прыналежнасці амонімаў да пэўнай часціны мовы вызначаецца вялікай разнастайнасцю, асабліва ў італьянскай мове. У табл. 6 прадстаўлены найбольш распаўсюджаныя тыпы гамагенных АП.

Табліца 6

Тыпы і колькасныя характарыстыкі АП па марфалагічнай прыналежнасці

Table 6

Types and quantitative characteristics of homoparadigms according to morphological affiliation

Тып АП	Колькасць АП дадзенага тыпу				Колькасць амонімаў у АП дадзенага тыпу			
	Абсалютная, адз.		Адносная, %		Абсалютная, адз.		Адносная, %	
	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова	Беларуская мова	Італьянская мова
Субстантыўная	360	520	36,0	52,0	756	1120	36,49	52,02
Вербальная	533	138	53,3	13,8	1096	288	52,90	13,37
Ад’ектыўная	74	62	7,4	6,2	151	129	7,28	5,99
Адвербіяльная	0	3	0	0,3	0	6	0	0,29
Службовая	3	0	0,3	0	6	0	0,29	0
Камбінаваная	30	277	3,0	27,7	63	610	3,04	28,33
Усяго	*1000*	*1000*	*100*	*100*	*2072*	*2153*	*100*	*100*

Такім чынам, у абедзвюх мовах выяўлена пяць тыпаў гамагенных АП і адзін тып камбінаваных АП. Найбольш распаўсюджаным тыпам у беларускай мове з’яўляецца вербальны (53,3 %), у італьянскай – субстантыўны (52 %). Ад’ектыўны тып у абедзвюх мовах сустракаецца ў 6–7 % выпадкаў. Гэта акалічнасць тлумачыцца тым, што ў працэсе выбаркі не ўлічваліся АП, якія складаюцца выключна з дзеепрыметнікаў, бо яны дубліруюць АП вербальнага тыпу і таму не з’яўляюцца рэлевантнымі для нашага даследавання. Аднак АП, якія маюць у складзе дзеепрыметнік у рамках граматычнай апазіцыі з прыметнікам або назоўнікам, былі ўлічаны і разгледжаны ў катэгорыі камбінаваных АП. Адвербіяльны тып АП у беларускай мове адсутнічае, у італьянскай мове ён адзначаны, але не з’яўляецца тыповым (0,3 %).

Для беларускай мовы камбінаваныя АП нетыповыя. У табл. 7 прадстаўлены наступныя тыпы і падтыпы такіх АП: субстантыўная (далей – С), ад’ектыўная (далей – А), адвербіяльная (далей – АВ), экскламатыўная (далей – Э), службовая (далей – СЛ), партыцыпная (далей – П), вербальная (далей – В), лічэбнікавая (далей – Л), пранамінальная (далей – ПН). Пры вылучэнні камбінаваных тыпаў парадак размяшчэння кампанентаў АП у слоўніку не ўлічваўся. Напрыклад, парадыгмы *кары* (*кары*[1] ‘карычневы (пра колер)’ і *кары*[2] ‘1) сані для перавозкі бярвення; 2) вялікія калёсы для перавозкі грузаў’) і *карэлы* (*карэлы*[1] ‘народ, які складае карэннае насельніцтва Рэспублікі Карэлія’ і *карэлы*[2] ‘пакрыты слоем засохлай гразі’) будуць адносіцца да аднаго тыпу змешанай АП – субстантыўна-ад’ектыўнага (С – А).

Табліца 7

Тыпы і падтыпы камбінаваных АП у беларускай мове

Table 7

Types and subtypes of combined homoparadigms in the Belarusian language

Нумар тыпу	Назва тыпу	Назва падтыпу (пры наяўнасці)	Структура тыпу або падтыпу	Колькасць АП, адз.
1	С – А	–	Назоўнік – прыметнік	3
2	С – АВ	С – АВ: Э	Назоўнік – прыслоўе	1
			Назоўнік – прыслоўе: выклічнік	1
		С – АВ: СЛ	Назоўнік – прыслоўе: часціца Назоўнік – прыслоўе: злучнік: часціца	1 1
3	С – СЛ	СЛ – С: ПН	Назоўнік – прыназоўнік	6
			Часціца – назоўнік: займеннік	1
4	С – П	–	Назоўнік – дзеепрыметнік	1
5	С – Э	–	Назоўнік – выклічнік	7
6	С – СЛ – Э	–	Назоўнік – злучнік – часціца – выклічнік	1

Заканчэнне табл. 7
Ending of the table 7

Нумар тыпу	Назва тыпу	Назва падтыпу (пры наяўнасці)	Структура тыпу або падтыпу	Колькасць АП, адз.
7	А – П	А – П: А	Прыметнік – дзеепрыметнік	2
			Прыметнік – дзеепрыметнік: прыметнік	1
8	АВ – Э	–	Прыслоўе – выклічнік	1
9	АВ – СЛ	–	Прыслоўе – прыназоўнік	1
10	В – Л	–	Дзеяслоў – лічэбнік	1
11	АВ – СЛ	–	Прыслоўе – злучнік	1

Згодна з друкаванымі і архіўнымі крыніцамі, на тэрыторыі Беларусі налічваецца больш за 30 азёр з назвамі, утворанымі ад асновы *свят-* (у абсалютнай большасці Святое, але сустракаюцца і намінацыі Святца (Браслаўскі раён) ці Свяцец (Полацкі раён) [10, с. 328–329]), ці ўтворанныя з дапамогай эпітэта «Святое», які можа ў дадзенай вясковай супольнасці суправаджаць іншую назву: *Яно раньшэ, гэта возера Бобрыца, яно ж было дужа гаючае. Есьлі прышчык які, ці болькі – ідзі, кажуць, пакупайся ў Бобрыцы і ні станіць. Было сьвятое, прама як сьвятое, а ціперака ў ім і топяцца, і ўсякае адусюль плывець* [6, с. 178]. Наяўнасць на той ці іншай тэрыторыі святога возера перафармацыруе і тапанімічную карціну паселішча: [А дзе царква правалілася?] *Эта ў Святом. Афіцыяльна дзярэўня называецца Кірава, а старыя людзі называюць Святоя. Гаворуць, там было возера, а тады правалілася*[3].

У адзінкавых выпадках фіксуюцца сюжэты, калі Бог адмысловым чынам асвячае возера, якое ўжо існуе: *Гавораць старынныя людзі, мы тожа так спрашывалі. Малыя былі, кажам: «А чаго гэта яго называюць Святое азяро?» Яны гавораць: «Божанька яго пераксціў» і, гавораць, туды званіў ад Божанькі нешта* [6, с. 167]. У некаторых выпадках этыялогія ўзводзіцца да біблейскіх часоў: [А чаго яна праваліласа?] – *Эта быў патоп, ліло 40 дней і сорак начэй. Эта да нас было і да нашых бацькоў*[4]. Што тычыцца культавых дзеянняў ля святых азёр, яны амаль не фіксуюцца, але да такой вады часта звяртаюцца з ачышчальна-лекавальнымі мэтамі. Пацверджаны звесткі пра народна-медыцынскія рытуалы ля возера

[1]Цытаты прыводзяцца з захаваннем асаблівасцей арыгінала. – *Т. В.*

[2]Тут і далей пераклад наш. – *Т. В.*

[3]АІМЭФ. Ф. 23. Воп. 9. Спр. 5. (Запісалі ў 2009 г. Т. Валодзіна і Т. Кухаронак у в. Сцяпы Жлобінскага раёна ад П. Б. Цімафеевай 1931 года нараджэння.)

[4]Там жа. Воп. 10. Спр. 6. (Запісала ў 2010 г. Т. Валодзіна ў в. Баранава Старадарожскага раёна ад П. К. Усік 1924 года нараджэння.)

Хотамля ў Круглянскім раёне: *Раней на месцы возера Хотамля, якое лічыцца святым, знаходзілася царква. Пад час вайны царква была разбурана. А тое, што ад яе засталося, праваліласяпад зямлю. На гэтым месцы з'явілася возера. І вось які ўжо год перад святам Купалы возера асвяшчаецца. Кожны купальны сезон сюды прыязджаюць людзі ў спадзяванні ачысціць сваю грахоўную душу і цела*[5]. Тапанімічныя легенды ў абсалютнай большасці тлумачаць лімнонім «Святое возера» праз сюжэт пра патанулы храм (паселішча).

Сюжэт пра храм, які правальваецца пад зямлю ці тоне, мае агульнаеўрапейскае распаўсюджанне і з'яўляецца ўжо даволі падрабязна прааналізаваным [11–15]. Пскоўскія даследчыкі легенды аб «провалищах» дэталізавалі гэты сюжэт праз вылучэнне наступных устойлівых элементаў: зыходнае месца знаходжання храма, капліцы ці паселішча (царква, капліца ці паселішча могуць стаяць на гары, беразе вадаёма, могілках, востраве, балоце); час падзеі (даўнія часы, служба, вайна); умовы знікнення храма, капліцы, паселішча ці званоў (сышоў пад зямлю ці ваду, у балота (як варыянт, разам з людзьмі)); прычына знікнення (прыродныя катаклізмы, разбурэнне падчас вайны, Божы гнеў, нашэсце інтэрвентаў, праклён); цяперашні выгляд месца правалу (утварылася яма, узнікла гара ці пагорак, могілкі, з'явілася возера, балота або крыніцы); стаўленне мясцовых жыхароў да месца правалу (прыслухоўваліся, ажыццяўлялі раскопкі, хавалі нячыстых нябожчыкаў, асцерагаліся, лічылі святым месцам, адзначалі выпадкі ацалення); існаванне царквы, капліцы ці паселішча пацвярджаецца весткамі (чутны звон званоў, гукі царкоўнай службы, галасы, стогны, плач людзей, бачны крыж (купал), знойдзены прадметы царкоўнага начыння, крыж, здараюцца здані, з'яўляюцца свячэнне, абраз або ўпрыгожанні) [12, с. 139]. Беларуская традыцыя ў цэлым адпавядае прапанаванай схеме, за выключэннем асобных дэталей ці рознай ступені папулярнасці матываў у складзе тэксту. Пакуль адзначым толькі адсутнасць або адзінкавасць матываў, звязаных з нашэсцем інтэрвентаў, наяўнасцю могілак і нябожчыкаў у цэлым. Разгорнутыя тэксты (якія спалучаюць у сабе найбольш частотныя элементы) у наяўнай на сёння базе даных сустракаюцца нячаста, што адпавядае прыродзе вуснай няказкавай прозы ў цэлым.

У. А. Лобач праводзіць рэканструкцыю гістарычных рэалій, якія маглі стаць асновай для фарміравання падобнага сюжэта: у якасці асноўнай прычыны знікнення паселішча (храма) фігуруе канфлікт, звязаны з парушэннем (сутыкненнем) светапоглядных (маральна-этычных, рэлігійных) каштоўнасцей і норм. Іначай кажучы, гэта канфлікт паміж калектывам і Богам (царквой), але Богам для носьбітаў фальклорнай традыцыі XIX–XX стст. ужо, безумоўна, хрысціянскім [2, с. 195–196]. Даследчык спасылаецца на легенду пра возера ля в. Навасёлкі Дзяржынскага раёна, што ўтварылася на месцы вёскі, жыхары якой не захацелі прымаць новую веру, запярэчыўшы Богу, які з'явіўся ў выглядзе дзядка: *Тых, што не пайшлі маліцца, дзядок адвёў крышку далей і ўваткнуў у зямлю кіёк… З натоўпу выйшаў адзін здаровы маладзец і вырваў кіёк… з гэтай ямкі хлынула вада і затапіла вёску разам з людзьмі. Засталіся толькі тыя, якія былі ў царкве* [5, с. 410]. У гэтым плане перамяшчэнне людзей, якія не прытрымліваюцца хрысціянскай веры і нормаў, у ніжнюю сферу светабудовы можа адлюстроўваць працэс сутыкнення дзвюх культурных традыцый (паганства і хрысціянства), калі афіцыйная перамога апошняга не знішчыла, а толькі выцесніла першае ў своеасаблівае культурнае «падполле». Прэцэдэнтам для ўзнікнення фальклорнага сюжэта, хутчэй за ўсё, станавіўся рэальны акт хрышчэння жыхароў той ці іншай мясцовасці і верагодныя канфлікты пры гэтым. Вобраз жа храма ў паданнях такога тыпу выступае эквівалентам саборнасці і ўвасабляе ўвесь калектыў у плоскасці яго духоўнага адзінства [2, с. 195–196]. Цікава, што яшчэ ў XIX ст. М. Удзеля, апісваючы польскія паданні на гэты сюжэт, выказваў думку, што затанулыя гарады, цэрквы, званы, корчмы і людзі не страчаны назаўсёды, яны толькі каюцца за свае грахі. Яны хаваюцца недзе глыбока ў зямлі і чакаюць збавення [13, s. 12].

У міфалагічнай карціне свету царква спазнае адмысловую сацыяльную катэгарызацыю, згодна з якой набывае шэраг дадатковых значэнняў, акрамя значэння 'прастора для адбывання набажэнстваў'. Звышнатуральныя характарыстыкі храма выяўляюцца ў кантэкстах, дзе ён служыць локусам прысутнасці персанажаў розных узроўняў. Тапанімічныя тэксты падкрэсліваюць агентыўны характар самога храма, калі яму прыпісваюцца здольнасці ўласнай волі і маральных установак. Царква як суб'ект рэагуе не толькі на парушэнне прыстойных паводзін уласна ў самім будынку, але і ў соцыуме. У падобных тэкстах да разумення царквы як сімвала выратавання дадаюцца значэнні кантролю і пакарання.

Сярод прычын цудадзейнай з'явы сучасныя інфарманты спрабуюць шукаць рацыянальныя матывы, але здараецца такое нячаста: *Церкаў правалілася дзе-та, яма абразавалася, можа крыніца якая падземная была і рухнула почва*[6]; *Раньшы там, дзе во тут крынічка была, дык цэрква… дык яе знясло бурай на ніз, гэту цэркву, цяпер там балота* [6, с. 174]. Моцнымі з'яляюцца пазіцыі ў матыва пакарання за грахоўнасць, адступленне ад нормаў сацыяльнага і царкоўнага жыцця: *А людзі то лі ругаліся, то лі дрэнна*

[5]АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 11. Спр. 74. (Запісала ў 2009 г. А. Саланінка ў в. Свяцілавічы Бялыніцкага раёна ад Г. М. Глазуновай 1917 года нараджэння.)

[6]Там жа. Ф. 23. Воп. 12. Спр. 10. (Запісала ў 2012 г. Т. Валодзіна ў в. Пячары Касцюковіцкага раёна ад В. П. Шаталенка 1947 года нараджэння.)

хадзілі ў царкву, патаму яна з людзьмі і правалілася пад зямлю; *цэрква правалілася, канешна, награшылі* [6, с. 166–167]. Рэгулярнасць выяўляе матыў праклёну святога месца, што таксама можа разглядацца як чалавечы грэх і святатацтва. Асаблівай сілай і незваротнасцю характарызуюцца праклён храма (гары, вадаёма) маці ў помсту за патанулае дзіця: *багатая пані з дачкой плыла ў касцёл. Перавярнулася лодка, і дачка ўтапілася, а маці закляла касцёл і ён пайшоў на дно* (пра возера каля в. Горна Зэльвенскага раёна) [7, с. 49]; праклён дзяцей, што шлюбаваліся без бацькоўскага бласлаўлення, у час вянчання [7, с. 54]. Храм у шэрагу еўрапейскіх тэкстаў [13] правальваецца і ў выніку праклёну за нявартае таго здарэнне. Так, возера ў в. Яруга Карэліцкага раёна ўтварылася пасля вокрыку «А каб гэтае месца затанула!» жанчыны, якая ўсяго толькі згубіла яйка. Падобная легенда існуе і ў Полацкім раёне: *Ішла бабка бярэменная, зачапілася, павалілася перад цэрквай і гаворыць: «Што б ты правалілась»* [6, с. 170]; *У вёсцы Крывое Сяло была царква. <…> Пастух ездзіў на кані. Калі ён злез з каня і хацеў прывязаць яго да дрэва, у гэты момант зазвінелі званы, і конь вырваўся з рук пастуха і пабег як шалёны. Пастух сказаў: Каб ты праваліўся, мой конь, разам з гэтаю царквою!.. Як толькі ён гэта вымавіў, царква правалілася… і ўтварылася цудоўнай прыгажосці возера, якое назвалі Міткаўскім*[7].

Бяздонныя азёры. На ўзроўні тапанімічнай прозы назіраем рэгулярнае перасячэнне народных этыялогій святых і бяздонных азёр. Тапонімы, якія прама паказваюць на гіпертрафіраваную глыбіню, а фактычна адсутнасць дна ў абсалютнай большасці наяўнага матэрыялу, суадносяцца з матывам затанулага храма: *Там, дзе зараз возера Бяздонніца, ці яшчэ яго называюць Бязодніца, раней было балота і стаяла там царква. І неяк было свята і шмат народу прыйшло, ну і тая царква пачала тануці, а людзі хуценька ўсе павыходзілі, нікога не засталося, але нічога не вынеслі з царквы. А яна патанула і стала на тым месцы возера. Вада ў тым возеры раны залечвае, хваробы розныя, усім памагае. Хто там купаецца, кажуць, крыжы бачылі і іконы, але нікому не ўдалося выцягнуць нічога – вада не адпускае. А яшчэ ў гэтым возеры ніхто ніколі не патануў, бо вада трымае нават тых, хто дрэнна плавае. А як вадалазы ныралі з аквалангамі, то і дна не знайшлі*[8].

Карэляцыі глыбіні з каларатывамі «цёмны» («чорны») абапіраюцца ў большай ступені на міфапаэтычную суаднесенасць глыбіні і цемры праз датычнасць да сферы гора і хаосу, чым на на фізічныя характарыстыкі, хоць яны і прысутнічаюць: *Так сразу як глянеш – чорна, ціна. Бяздэннае называецца. Усе баяліся туды хадзіць, там ціна, зачэпісся і не выплывеш* (пра возера Сталюгі ў Лепельскім раёне) [6, с. 175]; *Парядашная, і глыбіна бальшая. Ну цэрква ж схавалася. Аж чорная, глыбокая* (пра возера Капачы ў Мсціслаўскім раёне)[9].

У тапанімічнай прозе, звязанай з бяздоннымі азёрамі, этыялагічныя матывы нярэдка распрацоўваюць характэрныя для іншых гідрааб'ектаў сюжэты: гора несуцешнай маці або адданай за нялюбага дзяўчыны[10]. Легенды пра бяздонныя азёры вылучаюцца рэдкім матывам суб'ектнасці самога вадаёма ці прысутнай у ім міфалагічнай істоты. Імкненне чалавека змераць глыбіню возера або крыніцы пагражае яму смерцю, што адбілася ў формульным прыгаворы «Не мерай вяроўкаю, а то памераеш галоўкаю»: *Расказвала мне маці, што адзін хацеў памераць возера, сеў у лодку, зьвязаў вяроўку, камня ў мяшок. Прывязаў этага камня і паехаў. Прыехаў, і на этай лодкі сядзіць і едзя. І яму голас чуецца, што «Не мерай вяроўкай, бо ўпáдзеш галоўкай». Ён спужаўся і вярнуўся назад*[11].

Відавочна, характарыстыка «бяздонны» («глыбокі») выяўляе амбівалентныя рысы: яна хоць і сведчыць аб чысціні вады, але ў той жа час суадносіць вадаём са светам мёртвых, надае яму дэманічныя характарыстыкі і статус прамога ўваходу ў прадонне.

Памеры вадаёма ў вераваннях залежаць ад памера затанулага аб'екта (храма ці цэлага паселішча): *Пра азёры Гогалі, адно завём Большая, а другоя меншая. Такія байкі, што дзе-та там кагда-та ў адным дзярэўня правалілась, а ў другім – цэркаў*[12]. У беларусаў, як і ў іншых еўрапейскіх народаў (дастаткова прыгадаць горад Кіцеж), маюцца легенды пра затанулы горад. М. Грынблат у в. Прывалкі Гродзенскага раёна зафіксаваў паданне пра міфічны горад Райгруд, які нібыта некалькі тысяч гадоў таму праваліўся пад зямлю. Жыццё ў горадзе апраўдвала сваю назву: народу жылося як у раі. *А касцёлаў там было дванаццаць. Кажуць, што Вільня* (варыянт – Варшава) *праваліцца, а гэты горад зноў паявіцца*[13]. На ўзроўні чутак зафіксаваны згадкі пра затанулы горад у Сенненскім раёне: *А ці чулі, што такоя места, каб цэркава*

[7]АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 11. Спр. 74. (Запісала ў 2003 г. А. Пінчук у в. Крывое Сяло Шумілінскага раёна ад К. А. Балбатуновай 1921 года нараджэння.)

[8]Там жа. (Запісала Т. Карпоза ў в. Вашчынічы Пружанскага раёна ад А. Ц. Васюковіча 1927 года нараджэння.)

[9]АІМЭФ. Ф. 23. Воп. 11. Спр. 3. (Запісала ў 2011 г. Т. Валодзіна ў в. Капачы Мсціслаўскага раёна ад Л. А. Сіваковай 1929 года нараджэння.)

[10]Там жа. Воп.13. Спр. 15. Сш. 8. (Запісала ў 1971 г. К. Шундрык у в. Мілошавічы Слонімскага раёна ад Г. Р. Карповіч.)

[11]Там жа. Ф. 23. Воп. 12. Спр. 8. (Запісала Т. Валодзіна ў в. Смыкавічы Акцябрскага раёна ад Я. Ф. Лукашэвіч 1929 года нараджэння.)

[12]Там жа. Воп. 14. Спр. 8. (Запісалі Т. Валодзіна і У. Лобач у в. Вілы Лепельскага раёна ад А. К. Вашкевіча 1943 года нараджэння.)

[13]Там жа. Ф. 6. Воп. 3. Спр. 42. Л. 37–38. (Запісаў у 1951 г. М. Я. Грынблат у в. Прывалкі Гродзенскага раёна.)

ўвалілася? *– Да, да, эта ў нас на Кублішчыне. Усё казалі, што там утануў горад*[14]. У гэтым жа раёне апавядалі і пра затанулы горад Саколіна: *Тут кагда-та был горад Саколіна і он праваліўся, даўным-даўно. Там поля стала. Эта поля срэдзі Буяў і Парэчча ў нас. Горад калі-та быў Саколіна*[15]. Легенды пра Крывое возера ўключаюць і тапанімічныя адсылкі да знешняга выгляду аб'екта і адпаведнага тапоніма: *Гэтае азяро Крывое. А старыкі даўнія яшчэ гаварылі, што там горад нейкі, стаяў і уваліўся. І праўда ж, калі паглядзіш на гэтае азяро, то яно на самай справе сільна крывое. Гавораць, як прыглядзецца добра, то яно там выгінаецца, як вулачкі, завулачкі… Як горад. Вось і гаварылі старыя, што тут быў калісьці, даўным-даўно, горад. – А што там случылася? – Наляцеў віхор, усё кругом загрымела, усё змяшалася. Змяшалася неба з зямлёй. Горад і праваліўся пад зямлю* [6, с. 180].

На думку У. А. Лобача, паданне пра храм, што праваліўся, знакавае для фальклорнай гісторыі тым, што гэта легендарная падзея ў рамках лакальнага культурнага ландшафту азначае фінальную кропку касмагенезу, своеасаблівы рубеж, пасля якога свет (ландшафт) вышэйшай воляй (Богам) ужо не змяняецца [2, с. 457].

Матыў візіту жабрака ў паселішча. Матыў утварэння возера на месцы паселішча складае аснову яшчэ аднаго адметнага блока легенд, сюжэт якіх зводзіцца да наступнай схемы: у паселішча прыходзіць Бог у выглядзе жабрака і просіць пусціць яго на начлег або даць яму паесці. Ніхто жабрака не пускае, акрамя беднай удавы. На наступны дзень ён загадвае жанчыне пакінуць вёску і, адыходзячы, не азірацца. Тая чуе за сабой крыкі, стогны і парушае забарону, вёска сыходзіць пад ваду, а жанчына ператвараецца ў камень:

> *Ну ў нас там када-та была легенда такая. І, эта самае, прышоў старычок к бабкам. У дзеряўні нескалька хатак было. І прышоў прасіцца, каб пусцілі яго пераначаваць. Ну яго ніхто не пускаў. Ён зайшоў там к самай старэнькай бабке, і ў яе дочка была. Маленькая была дочка, маленькая была, эта самае, дзіцёнак у её. І, эта самае, ну як, у дочкі быў маленькі рэбёначак. Ён прышоў і папрасіўся пераначэваць. Сказалі: «Пажалуста, пераначуйце!» Ён паначаваў і на ўтра гавора: «Бабушка, сабірайцеся са мной». Яна гавора: «Не, дзетачка, я ўжэ старэнькая, я астануся, а пускай мая дочэнька ідзёт, з гэтым, з дзевачкай». Яна, маленькая дзевачка, дык яна ўзяла калыбель з сабой. «Я калыбельку, – гавора, – вазьму з сабой». Ну і ён гавора: «Ну пайдзём, толька кагда будзеш іці, нічэво не аглядывайся, хто там будзе дзелацца, што будзе дзелацца». Яна гавора: «Ну харашо, не буду аглядывацца». – «Даёш слова?» – «Даю!»*
>
> *Ну яна ўзяла калыбельку такую, калысачка такая, на плечы, дзяцёначка на рукі і панесла. Ідзецца. Ідзеідзе, смотра – там крычаць, пішчаць каровы, і равуць свінні, і ўсе этыя самыя, і людзі там плачуць. Яна думае: «Усё раўно я ж далжна пасматрэць». Яна ўзяла і сагнулася, этага дзяцёначка прыжала і цераз ногі вот так азірнулася, што там дзелаецца. І на гэтым месце прэвраціўся высокі камень.*
>
> *Ну вот і ўсё гэта ўсё патапілася і прэвраціласі ў возера. Усё патапілася і ён здзелаў возера, гэты Бог. Эта Бог. І здзелаў Святое возера. <…> Ён ўсё патапіў, Бог. Дзерэўня ладная была. Ён усё тут на гэтым месце, усё патапіў, так как людзі не слушалісь* [6, с. 171–172].

Матыў скамянення як выніку святатацтва і парушэння забарон належыць да ліку самых папулярных у фальклорнай этыялогіі камянёў. Каменем становіцца перадусім грэшнік, як, напрыклад, Сцяпан, што выправіўся араць менавіта на Вялікдзень, ці той шавец, што ў свята вырашыў пашыць як мага больш ботаў. Каменем ля возера Свіцязь становіцца жанчына, якая замест хлеба дала камянёў падарожнаму Богу[16]. У легендах пра ўзнікненне возера на месцы паселішча ў камень ператвараецца менавіта жанчына. Такія этыялагічныя легенды ўбудаваны ў біблейскія сюжэты. У дадзеным выпадку пераасэнсоўваецца сюжэт з Кнігі Быцця пра сыход Лота з сям'ёю з Садома:

> *Калі ўзышла зара, анёлы пачалі прысьпешваць Лота, кажучы: устань, вазьмі жонку тваю і дзьвюх дачок тваіх, якія ў цябе, каб не загінуць табе за беззаконьні горада. <…>*
>
> *І выліў Гасподзь на Садому і Гамору дажджом серку і агонь ад Госпада зь неба, і збурыў гарады гэтыя, і ўсё навакольле гэта, і ўсіх жыхароў гарадоў гэтых, і расьліны зямлі.*
>
> *А жонка Лотава за ім азірнулася і зрабілася саляным слупам* [Быццё 19:15–25].

Тэма выратавальнага зыходу з паселішча грэшнікаў непасрэдна звязана ў старазапаветным тэксце з праблемай выбару. Выпрабавальная запаведзь «выратуйся на гары, не спыняйся і не азірайся» ставіць біблейскіх герояў перад дылемай: ісці за Богам-Творцам або дзейнічаць па сваёй волі. Лот разам з дочкамі[17] без шкадавання пакідае Садом, яго жонка спыняецца і азіраецца назад, на горад граху, і адразу

[14] АІМЭФ. Ф. 23. Воп. 8. Спр. 2. (Запісалі ў 2008 г. Т. Валодзіна і У. Лобач у в. Буй Сенненскага раёна ад Н. П. Магіленка 1925 года нараджэння.)

[15] Там жа. (Запісалі ў 2008 г. Т. Валодзіна і У. Лобач у в. Парэчча Сенненскага раёна ад С. Ц. Мурашка 1922 года нараджэння.)

[16] Там жа. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 2. Сш. 4. Л. 1–3. (Запісала ў 1963 г. М. Расюкевіч у в. Парэчча Навагрудскага раёна ад А. І. Келька 1892 года нараджэння.)

[17] Як рэпліку біблейскага тэксту можна тлумачыць і рэгулярнасць акцэнтуацыі ў легендах таго факта, што жанчына сыходзіць з вёскі падкрэслена з дзіцем або дзецьмі.

ператвараецца ў саляны слуп. Парадаксальнасць сітуацыі з Лотавай жонкай заключаецца ў тым, што, атрымаўшы выратаванне, яна адразу ж гіне на шляху свайго збавення.

У дадзеным выпадку сітуацыя падаецца алагічнай. Блок тапанімічнай прозы пра ўзнікненне азёр карае ператварэннем у камень чалавека, выразна проціпастаўленага астатняй вясковай грамадзе. У абсалютнай большасці выпадкаў гэта бедная ўдава, якая выступае адным з апошніх пунктаў вясковай іерархіі (але і найбольш набліжанай да тагасветнай прасторы асобай), спагадлівы і добры чалавек, які дзеліцца з падарожным апошнім кавалачкам. Але важна адзначыць, што жанчына атрымлівае ад Бога нечуваную ўзнагароду – бясконцы спор і магчымасць выратавання з немінучай гібелі:

Гэта было вельмі даўно… Аб гэтым мне паведаміла мая бабуля. У адну вёску зайшоў старац. Заходзіў ён у кожную хату і прасіў прытулку нанач. Так ён абышоў усю вёску, але ніхто, ніводзін чалавек, не пусціў яго да сябе. Так дайшоў ён да апошняй хаты, у якой жыла бедная ўдава з маленькай дачкой. У яе ён і знайшоў прытулак. Жанчына пусціла старца ў хату, але была яна настолькі збяднелай, што ў яе нават кавалачка хлеба не знайшлося.

– Прабач, – сказала ўдава старцу, – але ў мяне няма чаго даць табе паесці.

Тады незнаёмы госць дастаў з кішэні некалькі зярняткаў і даў іх жанчыне.

– Вазьмі, – кажа ён, – змялі іх у жорнах на муку.

Жанчына здзівілася: як гэта з некалькіх зярнятак можна намалоць столькі мукі, каб з яе было дастаткова спячы хлеб. Але яна нічога не сказала і пачала малоць. Абылося дзіва: жанчына намалола цэлую дзяжу мукі. Напякла яна з гэтай мукі праснакоў. Сама з дачкой паела і старца накарміла. Раніцай старац кажа ўдаве:

– Збірайся жанчына, бяры дачку сваю і ідзі адсюль у другую вёску. Калі будзешь ісці, не азірайся, што б ты не пачула.

На гэтым старац развітаўся з удавой. Яна зрабіла так, як ён ёй сказаў. І вось, калі яна ўжо дайшла да суседняй вёскі, пачула крыкі людзей, роў жывёлы. Жанчына не азіралася. Але яна не змагла доўга вытрымаць: ёй было цікава паглядзець, што ж здарылася? і як толькі яна азірнулася, ператварылася яна, а разам з ёй і яе дачка, у вялізны камень. На месцы ж вёскі, у якой яна жыла, утварылася возера. А камень так і застаўся на тым месцы, дзе азірнулася жанчына. І як толькі не спрабавалі людзі пазбавіцца ад гэтага каменя, каб не перашкоджваў на агародзе – нічога не атрымлівалася. Нават з месца скрануць не ўдавалася. Так і да сённяшняга знаходзіцца гэты камень у вёсцы Молатава Талачынскага раёна[18].

Бог выступае ў гэтай групе легенд як цудоўны дарыльшчык невымерных дабротаў, багацця. Цікава назіраць, як перакампануецца камбінацыя тых жа матываў у былічках пра дабрахожых, якія гэтаксама за спагаду ўзнагароджваюць жанчыну бясконцым сувоем. Але жанчына губляе цудоўны сувой палатна праз сваю залішнюю цікаўнасць і ў тэкстах з такім матывам: *Яна* [дабрахожая] *сказала: ты прідзеш дамоў і ў цябе ўсё ўремя будзець палатно. Толькі ты яго да канца не раскатывай. А ей жа іньцересна, шыла-шыла ўсё, шыла-шыла, а мы ж любапытныя, ці многа там асталась. Яна расцягнула, і ўсё прапала*[19].

Матывы фатальнага ўчынку жонкі Лота і прычыны Божага пакарання ў Старым Запавеце не прыводзяцца, але ў навуковай літаратуры прадпрымаюцца спробы іх тлумачэння. Т. А. Савоськіна прапануе сваю версію, створаную на падставе сэнсавых алюзій да гісторыі Евы. Агульны тыпалагічны шэраг утвараецца дзякуючы падабенству сюжэтнай мадэлі духоўнага выпрабавання і сітуацыі грэхападзення і праведнага пакарання. У абедзвюх гісторыях Божае дзеянне накіравана на выпрабаванне чалавека, яго духоўна-маральны выбар у сітуацыі малой забароны: Адам і Ева не павінны смакаваць пладоў ад забароненага дрэва, сям'я Лота, пакідаючы Садом, – азірацца. Сіла цемры абуджае ў душы Евы першы грахоўны запал, які ўстойліва замацаваўся пасля ў жаночым характары, – пачуццё цікаўнасці. Гэту «прыродную» цікаўнасць атрымала ў спадчыну ад сваёй прабабкі і жонка Лота. Назойлівае жаданне пранікнуць у таямніцы Усемагутнага Бога прымушае яе азірнуцца, каб на ўласныя вочы пабачыць, якая кара сышла з нябёсаў на родны Садом, якому належала яе сэрца [16, с. 92–93].

Навукоўцы ўжо звярталі ўвагу на ўласна забарону азірацца, якая да сёння суправаджае вялікую колькасць рытуальных практык. В. М. Фрэйдэнберг звязвала яе з уяўленнямі аб смерці як доўгім і цяжкім падарожжы. У міфалагічных матывах «шлях, дарога азначаюць смерць, дарогу ў апраметную. Чалавек павінен прайсці шлях смерці ў літаральным сэнсе слова, і тады ён выходзіць абноўленым, зноў ажылым, выратаваным ад гібелі. Ён не павінен ні азірацца на пройдзены шлях, ні вяртацца па пройдзеным шляху, бо гэта азначае зноў памерці» [17, с. 506]. Р. Г. Назіраў працягвае гэтыя разважанні і заключае, што «паглядзець на смерць – значыць даць ёй убачыць сябе, і вынікам тады ператварэнне чалавека ў саляны слуп, камень, дрэва, карацей кажучы – у нежывое» [18, с. 36].

[18]АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 13. Спр. 74. (Запісала А. Мухіна ў в. Друцк Талачынскага раёна ад М. І. Мухінай.)

[19]Там жа. Ф. 23. Воп. 12. Спр. 7. (Запісала ў 2012 г. Т. Валодзіна ў г. п. Хоцімск ад Р. П. Галушка 1937 года нараджэння.)

Каго ж у тапанімічных легендах Бог абірае для выратавання? Найперш мужчыну. У запісе пра Альхоўскае возера ў Мастоўскім раёне Бог не праклятў толькі аднаго старога, што спаў. З далейшага тэксту вынікае, што ён чытаў святую кнігу: *Калі праведны стары азірнуўся на вёску, дык убачыў возера, а пасярэдзіне яго, якраз там, дзе стаяла яго хата, плаваў стол з раскрытаю на ім кнігаю* [5, с. 378]. У іншым тэксце выратоўваецца святар: *…у вадзе плаваў столік, а на століку ляжаў трэбнік…* [5, с. 394]. Бедства не закранае, відавочна, пабожнага мужчыну. Але легенды не ўзгадваюць пра ўмовы яго выратавання ці асаблівыя характарыстыкі. Падкрэсліваецца толькі пабожнасць. Алюзіі да біблейскага Лота відавочныя.

Блок легенд пра ўтварэнне возера і скамянелую жанчыну выяўляе ўстойлівую тэндэнцыю да кантамінацый з іншымі сюжэтнымі тыпамі, напрыклад, з сюжэтам пра жытні колас, які Бог змяншае ў пакаранне за непачцівае стаўленне людзей да хлеба, калі бачыць, як жанчына падцірае блінам дзіця: *Старык раззлаваўся, вышаў з хаты і ўваткнуў у зямлю кіёк. Як пашоў, дык гэтую дзярэўню і заліла вада*[20]. У якасці яшчэ аднаго прыклада можна прывесці сюжэт пра ўзнікненне зязюлі з самотнай сіраты: *Дзяўчынка аглянулася і замест вёскі ўбачыла камяні. Закрычала, заплакала яна, але што такое, яна стала зязюляй. Жалобна з таго часу кукуе яна, шукае сваіх бацькоў, не будуя сабе хаткі*[21].

Асобнага тлумачэння вымагае матыў кіёчка, з якога пачынае ісці вада: *А старац вышаў, палачку торкнуў, дак і пашла вада*[22]; *Старык раззлаваўся, вышаў з хаты і ўваткнуў у зямлю кіёк. Як пашоў, дык гэтую дзярэўню і заліла вада*[23]. Перад намі мадэляванне вертыкальнай прасторы, ніжні полюс якой заканамерна займае вада. Выхад яе на зямную паверхню рэгулюецца кійком, які метафарычна ўвасобіў выкананне запаветаў Божых або прытрымліванне прынятых у соцыуме правіл. Шматабяцальным стала б і супастаўленне сімвалізму гэтага кіёчка з посахам святара і нават з посахам Маісея. Наогул топіка легенд пра затанулы храм асабліва насычана біблейскімі алюзіямі. Можна было б узгадаць і адсылку да патопу як адной з прычын сыходу храма пад зямлю, а выратаваны праведны мужчына меў бы аналогіі з Ноем у яго каўчэгу. Безумоўна, для хрысціянскага дыскурсу важнымі з'яўляюцца этычныя тэмы. Аднак прэцэдэнтны эпізод трапляе ў поле міфалагічных сэнсаў, вынікам чаго становіцца выразная варыянтнасць легенды ў камбінацыі матываў, акцэнтаў, кантамінацый, пры гэтым цэнтральная лінія пакарання за непаслухмянства захоўваецца.

Святыя азёры як дэманічныя локусы. Статус возера, якое ўтварылася на месцы храма або паселішча, у абсалютнай большасці выпадкаў вылучаецца падкрэсленай святасцю. Аднак спарадычна характарыстыкі такога возера ўпісваюцца ў дэманічны хранатоп (возера з'яўляецца бяздонным, вельмі сцюдзёным, мае нейкую страшэнную сілу): *А на месцы вёскі стала возера, у якім не могуць ніяк знайсці дно, вада вельмі сцюдзёная. З трох бакоў возера акружае лес, а з аднаго боку невялікае балота. Над возерам чуецца страшэнны гул і свіст. Людзі баяцца хадзіць туды, кажуць, што яно мае нейкую страшэнную сілу*[24]. І нават на ўзроўні тапоніма такія азёры трапляюць на полюс, процілеглы полюсу, які шануецца (гл. лімнонімы «мёртвае» [6, с. 181], «дзікае»): *Яна не выцерпела і аглянулася. І от стаў з яе камень. А вёска тая правалілася і стала возерам. Страшнае яно, з цёмнай вадою. І назвалі яго Дзікім*[25]; *Там Сіняе озера, называюць і Мёртвае. Там дажа пціцы не садзяцца. Там не купайся, там змей многа. Па легендзе как будта бы там была цэркаў і там ушла пад воду*[26].

Асаблівасці такога возера або царкавішча заключаюцца ў тым, што ў ім топяцца людзі, каля возера ці ў ім самім з'яўляюцца здані, у вадаёме могуць быць закапаны скарбы. Прастору возера Бяздонка каля в. Баравуха ў Полацкім раёне залічваюць да небяспечных па той прычыне, што падчас вайны ў возера нібыта ўпаў збіты нямецкі самалёт, ад чаго пагінула шмат людзей. Адсюль узнікла павер'е пра магчымасць з'яўлення прывідаў[27]. Дадзеныя прыклады ўказваюць на амбівалентнасць паняцця святога, якое сэнсава набліжаецца да ідэі звышнатуральнага, цудоўнага, у тым ліку «нячыстага».

Часавая характарыстыка. Тапанімічныя тэксты пра святыя локусы аб'ядноўвае і яшчэ адзін важны элемент – часавая характарыстыка, прычым у іх прысутнічаюць паказчыкі часу легендарнага і рэальнага. І ў легендах пра паходжанне святога локуса, і ў апісаннях яго шанавання або ўключанасці ў рытуальныя практыкі іншага плану стабільна вылучаецца Вялікдзень. Менавіта на Вялікдзень храм правальваецца

[20]АІМЭФ. Ф. 9. Воп. 5. Спр. 9. Сш. 2. С. 21. (Запісаў у 1956 г. К. Кабашнікаў у в. Прыбалавічы Лельчыцкага раёна ад А. І. Дзякаўца.)

[21]Там жа. Ф. 13. Воп. 10. Спр. 13. Сш. 8. (Запісала ў 1961 г. Л. Вайшэль у в. Міхайлы Поразаўскага раёна (цяпер Свіслацкі раён) ад В. А. Пракопік.)

[22]Там жа. Ф. 9. Воп. 5. Спр. 9. Сш. 2. С. 22. (Запісаў у 1956 г. К. Кабашнікаў у в. Прыбалавічы Лельчыцкага раёна ад І. В. Калесніка 1869 года нараджэння.)

[23]Там жа. С. 21. (Запісаў у 1956 г. К. Кабашнікаў у в. Прыбалавічы Лельчыцкага раёна ад А. І. Дзякаўца.)

[24]Арх. вучэб.-навук. лаб. беларус. фальклору БДУ (далей – АБДУ). (Запісала ў 1992 г. А. Клунко ў в. Жыцін Асіповіцкага раёна ад В. К. Шухавай 1939 года нараджэння.)

[25]Там жа. (Запісала М. Ярашэвіч у в. Крагль Дзятлаўскага раёна ад Н. І. Гурскай 1926 года нараджэння.)

[26]AIMEF-e: 2020.004. (Запісала ў 2020 г. Т. Валодзіна ў в. Садавіцы Светлагорскага раёна ад В. Дразда.)

[27]АБДУ. (Запісала В. Крупіца ў Полацку ад У. С. Крупіцы 1975 года нараджэння.)

пад зямлю, вёска паглынаецца вадою. Да такога фіналу прыводзіць не толькі парушэнне правіл і Божых запаведзей, святатацтва, але і грэбаванне велікодным часам з яго патрабаваннем асаблівага, урачыстага настрою і паводзін: *З вёсак ішла моладзь на Усяночную перад Вялікаднем у царкву. Калі ішлі па нейкай паляне цераз лес, захацелася ім патанцаваць і заспяваць. Толькі яны пачалі танцаваць, як правaліліся пад зямлю. На гэтым месцы цяпер балота Дзевічы брод*[28]. Не менш рэгулярнымі з'яўляюцца ўказанні на Вялікдзень як час сігналу аб працягу існавання святыні ў іншым вымярэнні: *Там была кагда-та цэрква і тады яна правалілася. І на первы дзень Пасхі вродзе выхадзіл*а [6, с. 178]; *Дык расказавалі, што чалавек залахвенскі якраз на Пасху ехал на рыбалку на сваім чэлне, і роўна ў 12 часоў как запелі «Хрыстос васкрэс», яго лодка астанавілася. І он смотрыць: вышаў крэст з вады, пастаяў і пашоў уніз, і човен яго паплыў*[29].

Часавае прымеркаванне трагедыі да Вялікадня паўтараецца ў мностве іншых тапанімічных легенд, напрыклад, легендзе пра Сцёп-камень у Докшыцкім раёне і возера Бык у Астравецкім раёне: *Эта было на Вельканоц. На першы дзень ён пашоў гараць і так там ён і астаўся з быкамі… як ён прабудзіўся, выспа была і быкі стаялі, і ён. А кругом вада, што ён не мог выйсці. Так ён і астаўся там у возеры. І эта нават разгавор эты быў, што гавора, на першы дзень трэба ісці да ўсходу слонца, так пачуеш, як быкі рычаць там этыя* [19, с. 403]. Магчыма, Вялікдзень як перыяд зацвярджэння новага каляндарнага года ці светаладу («час, калі адбываецца міфалагічная рэструктурызацыя свету і аднаўленне касмічнага парадку» [2, с. 271]), а ў хрысціянстве як перыяд найвышэйшай тэафаніі, перамогі жыцця над смерцю, вечнага над будзённым і пры гэтым як пік трасфармацыі стаў найярчэйшым прэцэдэнтным часам для любога пераходу і пераўтварэння.

Механізмы народнай верыфікацыі легендарных ведаў. Інфарматыўнасць легенды відавочная ў пераказах самой камунікатыўнай сітуацыі атрымання ведаў, прычым нават не збіральнікам, а самім апавядальнікам: *Царква правалілася ў Баброве, ета я ад людзей чула. І вот ідзеш, такая гара бальшая тама, і я гаварю: «Госпадзі, чаго такая гара?» – А жэншчына кажэць: «Сюда правалілась церкавь дзеревянная»*[30]. Наогул, жывое бытаванне такіх тэкстаў наглядна дэманструе саму сістэму перадачы сакральных ведаў у нязмушаным працэсе засваення прасторы, калі падкрэсліваецца глыбіня памяці і актуальнасць для сённяшняга дня: *Лешава, яно называецца ад веку… Гэта я яшчо малая была – усё гаварылі. Баба мяне век у царкву вадзіла, цэрква стаяла ў Чарсцьвядах, во там на гарэ. І вадзіла яна мяне малаю. І тады вядзець мяне па дарозе, во так сойдзеш на ніз, во сюды… І тады вядзець, і каля Лешава па гары, там дарогай, і тады гаварыць: «Ну во, унучачка, тут жа цэрквачка во правалілася ў зямлю. Вада во тут, – гаворыць, – сьвятая вада. Во тут цэрква стаяла…» Дак ці яна помніць сама, ці ей тожа расказаваў хто, баба там ці дзед…* [6, с. 175–176].

Скарыстаўшы метафару Э. Орынга аб рыторыцы ісціны легендарнага дыскурсу (у адпаведнасці са згаданай метафарай мова легенды – гэта *belief language* (мова веры) [20, p. 128]), А. П. Ліпатава даводзіць той факт, што для апавядальніка легенды важна падкрэсліць не толькі праўдзівасць расказу, але і неверагоднасць апісанай падзеі [4, с. 51]. Сапраўды, у легендах дастаткова выказванняў – прымет няўпэўненасці ў сапраўднасці падзей, пра якія ў ёй апавядаецца: *Гаварылі во тут, як едзіш бальшаком, такое азярцо небальшое, луг такі, азярцо. Гаварылі там царква правалілася. А ці гэта праўда, ці не?* [6, с. 175]; *Возера Сьвяцец. Гаварылі вот, што цэрква правалілась. Дык вот старыя расказвалі, што ішла бабка бярэменная, зачапілася, павалілася перад цэрквай і гаворыць: «Што б ты правалілась». Насколька гэта праўда, можа сказка? Ну і, гавораць, цэрква і правалілась* [6, с. 170]; *Да, легенда йдзець такая праз гэта возера, што там утанула царква… Раньшы туда, вон у каго глазы забаляць, хадзілі ваду чарэпалі, з гэнага [возера]… Мылі глаза, і гаварылі, што харашо [памагаець]… Ідзець легенда, а хто яго знаець, што там было. Ну, гавораць, што там царква стаяла. Ну, царкоўнае што-та такое там. Эта ідзець такая легенда. А чорт яе знаець, ці гэта праўда ці не. Друг другу гавараць, можаць быць, і няпраўда* [6, с. 176]… Пэўная разгубленасць апавядальніка і няведанне адказу на пытанне пра прычыны здарэння прыкрываюцца паказаннем на цалкам рэальныя абставіны, напрыклад, начны час, які надзяляецца магчымасцю схаваць ад назіральнікаў падзею: *Прыйшлі людзі, а яна ўжо правалілася. А Бог яе ведаець чаго, мая ты дзетка дарагая, ну хто гэта знаець – ноччы ж гэта было* [2, с. 169].

У той жа час інфармант ажыццяўляе спробы даказаць праўдзівасць расказанага. Найбольш пашыраным у фальклорных аповедах маркёрам праўдзівасці выступае апеляцыя да калектыўных і ўнутрысямейных ведаў: *Пра гэта мне казала жана, а ёй – мама*; *Раньшы там, дзе во тут крынічка была, дык цэрква стаяла*, *дык я ж не знаю, гэта старыя мае бацькі гаварылі*. *Дык яе знясло бурай на ніз, гэту царкву*; *Гавораць*

[28]АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 11. Спр. 74. (Запісала А. Бародзіч у в. Куранец Вілейскага раёна ад І. Я. Бародзіча 1927 года нараджэння.)
[29]Там жа. Воп. 12. Спр. 11. (Запісала ў 2013 г. Т. Валодзіна у в. Баркалабава Быхаўскага раёна ад Л. І. Мацвеевай 1935 года нараджэння.)
[30]Там жа. Воп. 15. Спр. 5. (Запісалі ў 2013 г. Т. Валодзіна і Т. Кухаронак у г. Дубоўна ад З. А. Мядзведзевай 1935 года нараджэння.)

старынныя людзі, мы тожа так спрашывалі, малыя былі, кажам: «А чаго гэта яго называюць Святое азяро?» Яны гавораць: «Божанька яго пераксціў і, – гавораць, – туды звaліў ад Божанькі нешта. Туды, у гэнае азяро». Гэта яны самі старухі падсказывалі, што Божанька, гавораць, туды нешта скідаваў. Да, скінуў і вот гэта вада стала свянцона. І вот гавораць, што і абразавалася Святое азяро! [6, с. 167].

На імкненне падкрэсліць імавернасць падзеі ўказваюць адсылкі да калектыўнага вопыту (*Тут, калі купаўся хтосьці і прыхадзілася тануць, але ніхто не тануў. Нікада і гэта ж бальшое возера, як ізвесна. Інагда гаварылі, што нехта слышаў, як званы звонюць там* [6, с. 168]), празмерная дэталізацыя, імкненне падмацаваць сказанае «рэчавымі доказамі». Своеасаблівым верыфікатарам міфалагічнай інфармацыі пра храмы, што нібыта правaліліся ў пракаветныя часы пад ваду, выступае гучанне звона, якое чуецца ў рытуальна адзначаныя прамежкі часу (*Казалі, можна было чуць лямант і крыкі людзей. А зараз, у адпаведны часы, як і ў сапраўднай царкве, можна пачуць бомканне званоў* [7, с. 78]; *І вось ужо, як падойдуць, так у вабед – гул такі, як званы* [6, с. 170]), або велікодны спеў «Васолы нам дзісь дзень настаў» ці рык валоў, што патанулі разам з аратым [19, с. 402–403]. Цікава, што менавіта гукавая адметнасць замацавалася на ўзроўні тапонімаў: *Возера Звонь. Гавораць, цэрква стаяла. На гарэ стаяла і абвалілася, і звон быў, і упаў у возера* [6, с. 172]; *Возера, куды ўпаў звон царкоўны, Звонкава да нашага часу завецца. І часта штоўдзень людзі, бываючы на возеры, чуюць звон глухі і далёкі*[31].

Акустычныя характарыстыкі ў легендах гэтага тыпу асабліва выразныя, бо фактычна кампенсуюць адсутнасць або мізэрнасць праяў візуальнага кода: *Святое возера… на дне возера яшчэ ёсць броўны ад царквы*; *…усплывалі іконы, залатыя ложкі*; *Святое возера, пасярэдзіне амут. Гавораць, з яго выплываюць іконы* [6, с. 166].

Яшчэ адным фальклорным «пацвярджэннем» працягу існавання храма або горада пад вадой выступае матыў патэнцыйнай магчымасці яго выцягнуць: *За ноч утанула цэркава. Яно небальшое, так яно і не размнажаецца. Так яно і ё. Прыбег хлапец. А яму гадоў сем ці восем ці дзевяць, і гавора: ляжыць цэп на берагу, з колакала. І ён стаў цягнуць, цягне, цягне і тая цэркава выходжуе. Тая цэркава дашла да палавіна. Эта нам тая Старасціха расказавала. І тады ён думае: пабягу пазаву сваіх радзіцелей і эту цэркаву выцягном. Калі ён прыбег і радзіцелі, і ўсе людзі, каб цягнуць – і цэпа таго няма, і цэркавы няма*[32].

Невыпадковым падаецца ў такіх легендах матыў не ланцуга, а клубочка, які перадусім у казках з'яўляецца сімвалам шляху ў іншы свет. Дастаткова прыгадаць клубок, які дае Баба-яга герою казкі, калі той выпраўляецца шукаць чароўныя прадметы: *Бяздоннае возера. Аднойчы адзін пастух пасвіў каля таго возера кароў. Ен угледзеў, што па возеры плавае нейкі клубок. Пастух узяў дубец і падцягнуў клубок бліжэй да берага, і пачаў матаць той клубок. А пасярэдзіне затануўшага сяла стаяла царква. Чым больш ён матаў клубок, тым больш паказваліся вежы царквы. Пастух убачыў і спалохаўся. Ён кінуў клубок назад у возера. Як толькі ён кінуў клубок, адразу пачуў голас: «От дурак, не хацеў нас спасці»* [5, с. 378–379].

Заключэнне

Тапанімічная проза, непасрэдна звязаная з канкрэтным элементам прасторы, разам з геаграфічнымі назвамі ўдзельнічае ў фарміраванні культурнага ландшафту, надаючы яму глыбіню, індывідуальнасць і нават некаторы містыцызм. Для слухачоў такія легенды складаюць своеасаблівы кодэкс паводзін (не толькі ў адносінах да гэтага месца): яны вызначаюць, што правільна і што грахоўна, калі людзі маюць рацыю і з'яўляюцца няправымі, якое пакаранне можа чакаць за блюзнерства і інш. «Легенды не толькі распавядаюць аб рэальнасці, але і маюць патэнцыял яе ствараць, пераводзячы словы ў дзеянні» [21, p. 18–19]. Такія легенды можна разглядаць як практыку сацыяльнага ўздзеяння, што фарміруе штодзённае жыццё і мадэлі паводзін носьбітаў традыцыі, бо яны дазваляюць нам «убачыць, што важна і што няважна ў нашым жыцці, аднаўляючы тым самым правільныя прапорцыі ў чалавечым разуменні свету» [14, s. 511].

Менавіта гэтая акалічнасць – актуальнасць аповеду для сучаснасці – некалькі вылучае тэксты пра святыя азёры з блока тапанімічных паданняў. Захоўваючы замацаванасць за канкрэтным локусам, яны ўсе разам выяўляюць адзінства ў этыялагізацыі сакральных азёр як адзінкі культурнага ландшафту. Гэтак жа і этыялагічны матыў утварэння возера пасля візіту жабрака або Бога ўпісваецца ў шэраг легенд пра падарожнага Бога, які, выпрабоўваючы чалавека, закладвае гэтымі выпрабаваннямі пэўныя сацыяльныя ўстаноўкі (чаму жанчына вечна занята, чаму чалавек не ведае часу сваёй смерці і г. д.) і тым самым набліжае расказы да легенд народнай Біблії. Усё вышэйсказанае дае падставы кваліфікаваць такія тэксты як легенды або тапанімічныя легенды.

[31]АІМЭФ. Ф. 13. Воп. 11. Спр. 74. (Запісала ў 2009 г. Ж. Дзямешчанка ў в. Дуброва Гарадоцкага раёна ад Н. М. Ляшковай 1937 года нараджэння.)

[32]Там жа. Ф. 23. Воп. 9. Спр. 5. (Запісалі ў 2009 г. Т. Валодзіна і Т. Кухаронак у в. Кірава Рагачоўскага раёна ад Н. К. Голубевай 1931 года нараджэння.)

Легенды пра святыя азёры з'ўляецца цікавымі для сучаснікаў. Такія тэксты раз за разам дэманструюць сваю пазачасавасць, бо закранаюць найбольш адчувальныя аспекты чалавечага існавання (сферы маралі, вечнасці і здароўя). Менавіта па гэтай прычыне такія легенды запатрабаваны і ў гарадскім індустрыяльным асяродку, пра што сведчаць шматлікія рэпосты ў сацыяльных сетках, падарожжы журналістаў, рэпартажы, размяшчэнне інфармацыі на разнастайных краязнаўчых і культурна арыентаваных сайтах. Спажывецкая арыентацыя СМІ толькі спрыяе ўсё большаму пашырэнню звестак. Вопыт даследавання легенд пра святыя азёры ўказвае на дынамічны працэс канструявання сэнсаў, якія надаюцца актуальнымі рэаліямі. Прыходзіць нават думка, што заўважная актыўнасць бытавання легенд пра затанулы або правалены храм дыктавалася рэальнай сітуацыяй разбурэння цэркваў у савецкія часы.

Запісы розных храналагічных зрэзаў і рознага інфармацыйнага кантэнту дазваляюць выявіць прамую сувязь фарміравання цыклу легенд з сацыякультурным кантэкстам у лакальнай традыцыі: са змяненнем запыту грамадства іншай становіцца семантычная напоўненасць фальклорных тэкстаў аб тым ці іншым локусе.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Valk Ü, Sävborg D. Place-lore, liminal storyworld and ontology of the supernatural. An introduction. In: Valk Ü, Sävborg D, editors. *Storied and supernatural places. Studies in spatial and social dimensions of folklore and sagas*. Helsinki: Finnish Literature Society SKS; 2018. p. 7–24.

2. Лобач УА. *Міф. Прастора. Чалавек. Традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве*. Мінск: Тэхналогія; 2013. 511 с.

3. Штырков СА. *Предания об иноземном нашествии: крестьянский нарратив и мифология ландшафта (на материалах северо-восточной Новгородчины)*. Санкт-Петербург: Наука; 2012. 228 с.

4. Липатова АП. «Это не побасенка, а правда»: к вопросу о достоверности легенды. *Фольклор: структура, типология, семиотика*. 2020;3:28–65. DOI: 10.28995/2658-5294-2020-3-3-28-65.

5. Грынблат МЯ, Гурскі АІ, складальнікі. *Легенды і паданні*. Мінск: Навука і тэхніка; 1983. 544 с.

6. Лобач У, укладальнік. *Полацкі этнаграфічны зборнік. Выпуск 2, Народная проза беларусаў Падзвіння. Частка 1*. Наваполацк: Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт; 2011. 292 с.

7. Казлоўскі РК, складальнік. *Беларускі фальклор Гродзеншчыны. Народны эпас. Замовы. Варажба*. Гродна: Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы; 2007. 208 с.

8. Березович ЕЛ. *Русская топонимия в этнолингвистическом аспекте. Мифопоэтический образ пространства*. Москва: КомКнига; 2010. 235 с.

9. Anttonen V. Religious studies as landscape studies: perceptual strategies and environmental preferences in religion and mythology. In: Kovacs A, Cox JL, editors. *New trends and recurring issues in the study of religion*. Budapest: L'Harmattan; 2014. p. 113–132.

10. Дзісько НА, рэдактар. *Блакітная кніга Беларусі*. Мінск: БелЭн; 1994. 415 с.

11. Панченко АА. *Исследования в области народного православия. Деревенские святыни Северо-Западной России*. Санкт-Петербург: Алетейя; 1998. 298 с.

12. Юрчук ЛА, Казаков ИВ. Псковские фольклорные легенды о «провалищах». *Вестник Северного (Арктического) федерального университета имени М. В. Ломоносова. Серия: Гуманитарные и социальные науки*. 2017;2:137–145. DOI: 10.17238/issn2227-6564.2017.2.137.

13. Udziela S. O zapadłych miastach, kościołach, dzwonach i karczmach. *Lud*. 1900;6:1–16.

14. Wróblewska V. Zatopione karczmy, zapadłe kościoły. Wyobrażenia katastrof w polskich opowieściach ludowych z XIX i początku XX wiekuj. W: Morzyńska-Wrzosek B, Mazur D, redaktorzy. *Przestrzeń w kulturze współczesnej. Tom 3, Podziemia*. Bydgoszcz: Wydawnictwo Uniwersytetu Kazimierza Wielkiego; 2018. s. 495–511.

15. Laime S. The place valence approach in folk narrative research: the «Church sinks underground» motif in Latvian folklore. In: Ülo Valk B, Sävborg D, editors. *Storied and supernatural places. Studies in spatial and social dimensions of folklore and sagas*. Helsinki: Finnish Literature Society SKS; 2018. p. 80–92.

16. Савоськина ТА. Образ Лотовой жены в жанрах «вторичной» литературы. В: Есаулов ИА, Кондратьев БС, Кошелев ВА, Кудряшов ИВ, редакторы. *Православие и русская литература*. *Сборник научных статей.* Арзамас: Арзамасский филиал ННГУ; 2019. с. 91–101.

17. Фрейденберг ОМ. *Миф и литература древности*. Москва: Наука; 1978. 608 с.

18. Назиров РГ. Запрет оглядываться (к происхождению фольклорного мотива). В: Акимова ТМ, редактор. *Фольклор народов РСФСР. Межэтнические фольклорные связи*. Уфа: Башкирский университет; 1987. с. 31–38.

19. Внуковіч Ю. Народная культура Віленшчыны ў палявых запісах пачатку XXI стагоддзя. *Беларускі фальклор. Матэрыялы і даследаванні*. 2014;1:387– 442.

20. Oring E. Legendry and the rhetoric of truth. *Journal of American Folklore*. 2008;121:127–166.

21. Degh L, Vasonyi A. Does the word «dog» bite? Ostensive action: a means of legend telling. *Journal of Folklore Research*. 1983;20(1):5–34.

Артыкул паступіў у рэдкалегію 20.06.2024.
Received by editorial board 20.06.2024.

Юбилеи

Юбілеі

Jubilees



Борис Юстинович НОРМАН

Барыс Юсцінавіч НОРМАН

Boris Yustinovich NORMAN

Прафесару, доктару філалагічных навук Барысу Юсцінавічу Норману 6 лютага 2025 г. спаўняецца 80 гадоў. Юбіляр зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай навукі і адукацыі, а таксама сусветнай лінгвістыкі. Шмат гадоў ён працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце (1968–2021), прайшоў шлях ад аспіранта (1966) да загадчыка кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства (1999–2007). Ён аўтар каля 30 кніг, больш за 600 артыкулаў і дакладаў.

Барыс Юсцінавіч Норман нарадзіўся ў 1945 г. у Ленінградзе ў сям'і ўрачоў. Яго бацька быў выдатным хірургам, у час вайны служыў у Ленінградзе, пасля стаў галоўным урачом Таліна, намеснікам міністра аховы здароўя Эстонскай ССР. Маці працавала тэрапеўтам і выхоўвала дзяцей. Вясной 1945 г. сям'я пераехала ў Талін, дзе Барыс з сярэбраным медалём скончыў сярэднюю школу № 32.

У хлопца рана з'явілася цікавасць да замежных моў і мастацкай літаратуры, таму заканамерным было рашэнне паступаць на філалагічны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта. Ён абраў славянскае аддзяленне, дзе ў 1961–1966 гг. вывучаў балгарскую, польскую і рускую філалогіі, займаўся ў прафесара Ю. С. Маслава (напісаў пад яго кіраўніцтвам дыпломную работу), атрымаў кваліфікацыю выкладчыка балгарскай і рускай моў і літаратур.

З 1966 па 1968 г. Б. Ю. Норман вучыўся ў аспірантуры БДУ, а ў кастрычніку 1968 г. пачаў працаваць на філалагічным факультэце гэтага ўніверсітэта.

У 1969 г. малады выкладчык абараніў кандыдацкую дысертацыю «Зваротныя канструкцыі ў сучаснай балгарскай літаратурнай мове» (навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар А. Я. Супрун), а ў 1983 г. – доктарскую дысертацыю «Сінтаксіс маўленчай дзейнасці. Просты сказ» (навуковы кансультант – А. Я. Супрун). Даследчык так характарызаваў эвалюцыю сваіх навуковых цікавасцей: «Па-першае, я пачынаў свой шлях у навуку – калі гэта наогул можна назваць такім гучным словам – з вывучэння марфалогіі. Мне здавалася, што парадыгма слова, граматычныя формы слова, працэс граматыкалізацыі – усё гэта вельмі цікава, але паступова, паколькі займаўся зваротнымі дзеясловамі, я стаў, прабачце за выраз, скочвацца ў балота сінтаксісу, таму што гэта звязана са станам, пераўтварэннем сінтаксічных канструкцый. І ўжо адпрацаваўшы пэўны час ва ўніверсітэце, сцяміў, што мяне цікавіць сінтаксіс, асабліва з псіхалінгвістычным ухілам: як у свядомасці чалавека, моўцы і слухача, фарміруецца структура фразы, як ён разумее самую фразу, якое месца знаходзяць у фразе асобныя элементы, што такое, скажам, аманімія, адкуль бярэцца неадназначнасць, адкуль бярэцца маўленчыя канфлікты, неразуменні і г. д. Так паступова я прыйшоў да тэмы доктарскай дысертацыі “Сінтаксіс маўленчай дзейнасці. Просты сказ”»[1].

У працоўнай дзейнасці прафесара Б. Ю. Нормана выразна вылучаюцца мінімум тры напрамкі: навукова-даследчы, педагагічны і папулярызацыйны. Самы значны ўнёсак ён зрабіў у галіне балгарыстыкі, русістыкі, сацыялінгвістыкі (лінгвістычнай прагматыкі), граматыкі і лексікалогіі славянскіх моў у псіхалінгвістычным аспекце.

Больш за паўстагоддзя выкладаў Б. Ю. Норман у БДУ і іншых беларускіх і замежных навучальных установах такія дысцыпліны, як «Уводзіны ў мовазнаўства», «Агульнае мовазнаўства», «Псіхалінгвістыка», «Прагматыка», дзе закранаў розныя аспекты балгарскай, беларускай, польскай і рускай моў і інш. Ён выступаў з навуковымі дакладамі, чытаў лекцыі ў Аўстрыі, Балгарыі, Германіі, ЗША, Кітаі, Польшчы, Расіі, Сербіі, Славеніі, Украіне, Фінляндыі, Чэхіі, Японіі. Дзякуючы публікацыям і выступленням Барыса Юсцінавіча павышаўся прэстыж савецкай і беларускай навукі, пра БДУ з павагай гаварылі ў свеце.

